WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

15 СНЕЖНЯ 2010 г.
СЕРАДА
№ 245
(26853)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Рэзананс

## АДЗІН «СУПРАЦЬ», АСТАТНІЯ — «ЗА»!

**У мінулым месяцы мне прыйшлося правесці невялічкае расследаванне па лісце, які ўрэшце аказаўся ананімкай («Згрэбці вёску ў Дняпро?» — 23 лістапада 2010 года). Нагадаю: жыхарка вёскі Асарэвічы, што ў Брагінскім раёне, звярнулася з нечаканай просьбай закрыць мясцовую школу. Матывацыя на сённяшні дзень не вартая нават увагі, бо, як урэшце высветлілася, толькі адзін ананім супраць установы адукацыі ў сваёй вёсцы.**

Але ж, што вельмі прыемна, пасля надрукавання артыкула ў нашу рэдакцыю прыйшоў іншы ліст на добрай беларускай мове — ад калектыву Асарэвіцкага вучэбна-педагагічнага комплексу Брагінскага раёна. Пад ім — 26 подпісаў, прычым не толькі настаўнікаў, але і вучняў, і бацькоў, і проста жыхароў населенага пункта. Яго працытую:

*«Артыкул выклікаў шырокі рэзананс у нашых вяскоўцаў... Нашай адукацыйнай установе 103 гады. З цягам часу змянялася назва школы, яе кіраўнікі, але жыццё ўстановы адукацыі не спынялася. За ўсю гісторыю з яе сцен выйшла больш за 3000 выпускнікоў розных спецыяльнасцяў. Усе сферы іх дзейнасці пералічыць немагчыма. Дарэчы сказаць, што ў школе 80% настаўнікаў — выпускнікі нашай установы. Былыя выпускнікі заўсёды з задавальненнем наведваюць школу і выказваюць словы падзякі за тыя веды, якія яны атрымалі ў яе сценах»*.

Нам удзячныя *«за нефармальны і глыбокі падыход да сутнасці праблем вясковага настаўніка»*. А мяне асабіста, як аўтара, суцешылі, што не змарнавала часу дарэмна, калі разбіралася, хто ў той гісторыі мае рацыю, а каму проста няма чым заняцца ў жыцці. Дзякуй вам, паважаныя жыхары Асарэвічаў, за такія цёплыя словы і нават запрашэнне завітаць у госці. Дарэчы, з асабістага вопыту сведчу, што звычайна людзі не часта лічаць неабходным выказваць падзяку журналісту, які ў нечым дапамог. Тым больш прыемна. Спадзяюся, што многія з вас з гэтага часу стануць вернымі чытачамі і падпісчыкамі газеты «Звязда». Так што яшчэ сустрэнемся — на старонках газеты дакладна. А можа, давядзецца і пабываць у вашай цудоўнай вёсачцы, якую разам не дадзім згрэбці ў Дняпро!

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАЦВЯРДЖАЕ ГАТОЎНАСЦЬ ДА ПОЎНАМАШТАБНАЙ НАРМАЛІЗАЦЫІ АДНОСІН З ЗША НА ПАРТНЁРСКАЙ АСНОВЕ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора сустрэўся з прадстаўнікамі вядучых аналітычных цэнтраў ЗША.

У склад амерыканскай дэлегацыі ўваходзяць кіраўнікі праграм, прафесары і вядучыя супрацоўнікі Цэнтра стратэгічных і міжнародных даследаванняў, даследчай службы Кангрэса ЗША, Фонду Карнегі за міжнародны мір, фондаў «Спадчына», «Ініцыятыва па скарачэнні ядзерных пагрозы», Інстытута новых дэмакратый, Рэдфардскага ўніверсітэта.

«Я з усёй адказнасцю заяўляю, што мы гатовы да поўнамаштабнай нармалізацыі адносін з ЗША, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы. — Але самае галоўнае, каб у нас бачылі партнёра, а не краіну, якую можна задушыць, нахіліць, а можа, і растаптаць».

«Мы неадкладна адкажам дабром на паважлівае стаўленне да нас», — запэўніў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, гэта можа пацвердзіць любы са стратэгічных партнёраў Беларусі.

«Хачу, каб вы разумелі: Беларусь не прасіцель з працягнутай рукой у чаканні бясплатных мільярдаў», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што за гады сваёй незалежнасці Беларусь нечага дасягнула: яна дэманструе эканамічны рост, вызначылася з прыярытэтамі ў знешняй і ўнутранай палітыцы як самастойная і суверэнная дзяржава.

«Адкінуўшы стэрэатыпы і забабоны, у ходзе ўзаемапаважлівага дыялога мы можам вырашыць самыя складаныя праблемы». Прэзідэнт Беларусі разлічвае на непрадузятасць і аб'ектыўнасць ацэнак амерыканскіх аналітыкаў. «Упэўнены, што вы як сапраўдныя прафесіяналы будзеце непрадузятыя і аб'ектыўныя ў сваіх ацэнках», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускаму боку хацелася б, каб прадстаўнікі вядучых аналітычных цэнтраў ЗША ў нармальнай рабочай абстаноўцы ўбачылі ўсё на ўласныя вочы, атрымалі адказы на тэмы, якія іх цікавяць. «Немагчыма сфарміраваць суцэльную аб'ектыўную пазіцыю па нейкім пытанні, апіраючыся на рэпартажы кучкі ангажаваных журналістаў або даклады так званых незалежных «экспертаў», — адзначыў Прэзідэнт.

«Мы не абмяжоўваем вас у сустрэчах, гатовы да адкрытай размовы па самых вострых праблемах, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы цудоўна разумеем, наколькі важны непасрэдны дыялог без непатрэбных пасрэднікаў, без перадатчыкаў».

Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў: «Вы, напэўна, убачылі, што мы цалкам адкрытыя для вас. Мы не праводзілі ніякага адбору сярод жадаючых наведаць Беларусь у складзе вашай дэлегацыі. Усе, хто хацеў прыехаць, каму было цікава самому на месцы разабрацца з сітуацыяй у Беларусі, сёння за гэтым сталом».

СТАР. 2

## ПАНАЕХАЛА ДЗЯДОЎ! І СНЯГУРАК!

ДВАЦЦАЦЬ адна пара Дзядоў Марозаў і Снягурак прыехала ў сталіцу з усіх абласцей Беларусі, каб удзельнічаць у Рэспубліканскім конкурсе «Ёлка-фэст» на званне лепшых. Пінск, Бераставіца, Верхнядзвінск, Магілёў, Гомель, Парычы, Валожын, Шчучын, Маларыта, нават вёска Сноў (і вядома ж Мінск) — частка геаграфіі, якую прадстаўляюць удзельнікі зімовага конкурса-шоу. Ініцыятарам і арганізатарам спаборніцтва выступіў Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі пры Міністэрстве адукацыі. Кожная пара, каб прэтэндаваць на тытул лепшай, павінна паўдзельнічаць у дэфіле і паказаць дзіцячай аўдыторыі сваю навагоднюю праграму. Некаторыя з Дзядоў і Снягурак, для большай арыгінальнасці, змянілі традыцыйны імідж: напрыклад красоўкі замест ботаў ці каўбойскі капялюх замест бела-чырвонай шапкі. Па дзіцячых усмешках няцяжка было зразумець, што канкурсанты — выдатныя танцоры і спевакі, вясёлыя, жыццярадасныя і з добрым гумарам. Чаго ў жыцці часта не стае. З імі Новы год сумным не будзе!

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

Завочная прамая лінія

## КАЛІ ВЫБІЛІСЯ З РАЎНАВАГІ...

Боль у целе (сэрцы, страўніку і г.д.), узнікшае артэрыяльнага ціску, пачашчанае сэрцабіццё, скураны сверб могуць быць прыкметай не саматычнага захворвання, а неўратычнага расстройства. Калі на працягу нейкага часу вы адчуваеце слабасць, апатыю, парушэнне сну і апетыту, трывогу; калі вы перажылі стрэс, пакутуеце ад прыступаў панікі або страху — значыць, ёсць нагода звярнуцца да спецыяліста. Што ёсць неўроз, якія псіхатропныя прэпараты здольныя выклікаць залежнасць — на гэтыя і іншыя пытанні адкажа **загадчык амбулаторнага аддзялення памежных станаў № 1, урач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога цэнтра памежных станаў Вольга Генадзьеўна ПРАКОП'ЕВА**.

Пытанні можна пакінуць **сёння** па нумары рэдакцыі: **8 (017) 287 18 29**. Адказы будуць надрукаваныя ў газеце.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «СлуцкОблГарант» (продавец)**

проводит открытый аукцион по продаже **одноэтажного кирпичного здания РТМ** (инв. № 602/С-2213), об. пл. 267,2 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, д. 19.**

**Начальная цена с НДС – 220 493 861 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,0456 га.**

**Задаток в сумме 20 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Объект обременен договорами аренды.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 15 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, **если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **18.01.2011 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.01.2011 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

*Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 15.12.2010г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 999,00 | 1 чэшская крона | 160,37 |
| ▲ 1 еўра | 4 036,35 | 1 польскі злоты | 1 009,25 |
| 1 латвійскі лат | 5 681,54 | ▲ 1 расійскі рубель | 97,55 |
| 1 літоўскі літ | 1 167,15 | 1 украінская грыўня | 376,24 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 30,7447 |
| 10 UAH | 38,5925 |
| 1000 BYR | 10,2040 |
| EUR | 41,2932 |

Агенцтва Уладзіміра Грацкова

У эпіцэнтры дзяржаўнай палітыкі

# ТАКАЯ РАМАНТЫЧНАЯ ПРАФЕСІЯ — ЛЮДЗЯМ ГАРАДЫ ДАРЫЦЬ

## Гутарка з генеральным дырэктарам ААТ «Нафтазаводмантаж» дэпутатам Віцебскага абласнога і Наваполацкага гарадскога Саветаў, дэлегатам IV Усебеларускага народнага сходу Аляксандрам ЯЛОВІКАМ

Генеральны дырэктар Аляксандр ЯЛОВІК.

Панарама «Нафтана».

### Гэта наша з табой біяграфія

***— Давайце пачнём, Аляксандр Пятровіч, наша знаёмства з расказу генеральнага дырэктара пра сябе і калектыў.***

— Усе мы ад зямлі — яна нас корміць. Нарадзіўся ў Верхнядзвінскім раёне, закончыў сярэднюю школу ў вёсцы. Прычым жыць даводзілася ў інтэрнаце, бо школа была размешчана за 7 кіламетраў ад роднага дома і да бацькоў траплялі толькі на выхадныя дні. А сыдзе снег — ездзілі штодня на веласіпедах. Так што ўжо тады ішла пэўная загартоўка характару.

Потым быў Наваполацкі машынабудаўнічы інстытут, пасля заканчэння якога я і прыйшоў на «Нафтазаводмантаж», вось у гэты самы кабінет — да дырэктара Пятра Іванавіча Саламухі. А на заводзе ўжо тады існавала традыцыя, якая засталася, можна сказаць, і зараз — адразу пасылаць выпускнікоў ВНУ на рабочыя пасады. Пётр Іванавіч прапанаваў і мне «панюхаць пораху» — папрацаваць слесарам. Я адразу згадзіўся, і ён правадзіў мяне словамі, якія запомніліся: «Дзейнічай, джыгіт». Па-руску гэта гучала так: «Дерзай, джигит».

Ну, я і «дерзал». Праз год стаў майстрам, потым прарабам, затым начальнікам участка. Калі набраўся прафесійнага і выццёвага вопыту, прызначылі начальнікам вытворчасці, далей — намеснікам генеральнага дырэктара. А з 2004 года — генеральны дырэктар.

Ранейшыя кіраўнікі былі мудрымі людзьмі, яны сфарміравалі вельмі моцную каманду. У нас ёсць карпаратыўны «энзээмаўскі» дух (ад абрэвіятуры НЗМ — «Нафтазаводмантаж»). Ён грунтуецца на павазе да людзей, якія сталі асновай калектыву. А такім фундаментам былі 14 чалавек, якія ў 1959 годзе, калі саюзны ўрад прыняў рашэнне будаваць на беларускіх землях нафтаперапрацоўчы завод і новы горад — Наваполацк, першымі прыехалі сюды на чале з Леанідам Міхайлавічам Ашмянам. Яны былі з усіх куткоў Савецкага Саюза, і самай першай работай, якую выканалі, стаў пантонны мост праз Заходнюю Дзвіну — каб забяспечыць аб'екты будаўнічымі матэрыяламі, абсталяваннем і ўсім астатнім. Менавіта на базе гэтага перадавога атрада сфарміравалі буйное ўпраўленне, спецыялізацыяй якога стала прамысловае будаўніцтва і нафтаперапрацоўка.

Зараз у жывых засталося толькі трое — Леанід Міхайлавіч Ашмян, Зоя Андрэеўна Галаўнёва і Аляксей Захаравіч Базека.

Мы падтрымліваем з імі сувязь (і, па магчымасці, падтрымліваем іх), а таксама з былым галоўным інжынерам Іванам Сцяпанавічам Непачаловічам, з усімі нашымі ветэранамі. Пры сустрэчы нам не сорамна глядзець ім у вочы, бо мы не разгубілі ўсяго таго, што было завяванa імі. Нават у цяжкія для краіны гады, пачынаючы з 1991-га і па 1997-мы, калі работы не хапала. Мы знайшлі выхад у дыверсіфікацыі, і з чыста мантажнай арганізацыі, якая займалася толькі мантажом металаканструкцый, абсталявання і тэхналагічных трубаправодаў, сталі генпадраднай. Гэта значыць, развілі агульнабудаўнічы накірунак — авалодалі яшчэ і агульнабудаўнічымі работамі. І зараз узводзім аб'екты нафтаперапрацоўкі і хімічнай вытворчасці «пад ключ» — выконваем усё, акрамя хіба што праектна-каштарыснай дакументацыі.

***— Летась вы адзначылі 50-годдзе свайго калектыву.***

— Яго гісторыя цесна звязана з біяграфіяй айчыннай нафтахіміі. Нашы спецыялісты разам з атрадам № 16, які быў генпадрадчыкам, узводзілі ўсе прамысловыя гіганты, якія зараз ёсць у гэтым рэгіёне. З «нуля» самым актыўным чынам удзельнічалі ва ўзвядзенні ААТ «Нафтан», ААТ «Палімір», ААТ «Шкловалакно», завода бялкова-вітамінных канцэнтратаў — усіх прадпрыемстваў Полацкага і Наваполацкага прамысловага вузла, буйнога і надзвычай важнага для краіны. Мы па праву ганарымся гэтымі аб'ектамі. Яны сталі і біяграфіяй кожнага з нас.

Напрыклад, на «Шкловалакне» таксама прысутнічалі з нуля, калі толькі-толькі пачыналася ўзвядзенне гіганта, а нядаўна ён адзначыў сваё 50-годдзе. Мантаж усяго спецыяльнага абсталявання выконвалі нашы людзі. Калі я працаваў начальнікам вытворчасці № 4, то адказваў за гэты накірунак. І толькі на маёй памяці былі ўзведзены 4-я, 7-я печы, рэканструявана 6-я, пабудаваны складскія памяшканні і гэтак далей. Гэта наш вельмі паважаны заказчык, які і зараз запрашае нас на ўсе віды работ.

Безумоўна, самым галоўным аб'ектам за гады самастойнай Беларусі для нас стаў комплекс гідракрэкінгу — паглыбленай ачысткі дызельнага паліва — на «Нафтане». З дапамогай гэтай установкі прадпрыемству ўдаецца атрымаць дызельнае паліва маркі Еўра-5. Такой установкі гідракрэкінгу ў былых краінах СССР пакуль няма. Мы былі тут генеральным падрадчыкам, я тады працаваў кіраўніком сярэдняга звяна. Нарматыўны тэрмін будаўніцтва — пяць гадоў, а мы сумесна з нашым паважаным заказчыкам змаглі скараціць яго да трох. У чым заключалася ўнікальнасць? У абсталяванні. Манціравалі 300-тонныя рэактары першы раз самі і ўпершыню ў Беларусі, з дапамогай крана грузападымальнасцю 800 тон. Унікальнасць яшчэ і ў тым, што ціск у трубаправодах — да 250 атмасфер. Комплекс быў узведзены згодна з міжнароднымі стандартамі. І нашы інжынеры, зваршчыкі, слесары мусілі папярэдне вучыцца і здаваць кваліфікацыйны экзамен даволі строгай міжнароднай камісіі. Амерыканскія спецыялісты, якія ўваходзілі ў склад камісіі, прыдзірліва праверылі плёнкі па неразбуральным кантролі зварных стыкаў, што мы выконвалі. Міжнародная камісія прыняла экзамен, а пазней — і саму ўстаноўку. Пасля ўвядзення комплексу эканамічны эфект толькі для нашага калектыву быў проста каласальны. Каласальны ён і для ўсёй эканомікі Беларусі.

Ультрагукавы кантроль зварачнага злучэння праводзіць інжынер Аляксей УЛЬЯНКОЎ.

### Аднолькавага мантажу не бывае

— Варта мець на ўвазе, што аднолькавага мантажу не бывае, — працягвае генеральны дырэктар. — Гэтым і цікавая работа мантажніка. Сёння — адна ўстаноўка, адно абсталяванне, праз тыдзень — другая ўстаноўка, і там сваё абсталяванне. Фактычна кожны раз чакае эксклюзіўная работа, тонкая і надзвычай адказная, бо такая спецыфіка прадпрыемстваў нафтахіміі. Трубаправоды таксама розныя — з нержавеючай сталі, хромамалібдэнавыя, з вугляродзістай сталі. Увесь час патрэбна вучыцца. Безумоўна, ёсць абсалютна ўнікальныя заказы — мантаж тых жа 300-тонных рэактараў, чаго дагэтуль не было ў практыцы. А яшчэ раней, у 60-я гады, упершыню ў Савецкім Саюзе на «Нафтане» зманціравалі 100-метровыя калоны (быў такі метад такелажу — мачтамі). Альбо 120-метровую трубу на «Паліморы» — метадам надрошчвання. Калі гаварыць пра ўнікальнасць далей, то сёння, каб змантаваць шматтонны кампрэсар — замежны ці айчынны, — патрэбна з дапамогай спецыяльных тонкіх шчупаў «лавіць» мікроны. Уся складанасць у допусках паміж блокамі: у дакладнасці допуску гарызантальнасці, допуску прыціркі паверхні. Любы кампрэсар вытрымлівае высокія дынамічныя нагрузкі, і, каб ён працаваў нармальна не адзін дзясятак гадоў, патрэбна ўсё рабіць з вельмі высокай дакладнасцю. Тэхналогіі ўвесь час удасканальваюцца — значыць, удасканальваецца абсталяванне, і нам стаяць на месцы не атрымаецца.

Той жа гідракрэкінг паказаў, што тэхнічны прагрэс крочыць вельмі імкліва. Мы штогод ставім сабе за мэту пастаянна тэхнічна пераўзбройвацца, складаем план тэхнічнага пераўзбраення на год і пяцігодку і дзейнічаем у адпаведнасці з планам; сочым за навінкамі на рынку тэхналогій і абсталявання. За апошнія пяць гадоў на сваё перааснашчэнне накіравалі больш за 20 мільярдаў рублёў. Па інвестыцыях у асноўны капітал сёлета выйшлі на 160 працэнтаў росту да ўзроўню мінулага года.

Востра стаіць пытанне антыкаразійнай абароны, і мы набылі і ўстанавілі сучасную лінію дробемётнай ачысткі металу. Увесь металапракат ачышчаем шротам, у адрозненне ад ранейшых тэхналогій ачысткі з дапамогай пяскаструйнай машыны. Якасць зусім іншая. Падрыхтаваная пад афарбоўку паверхня атрымліваецца ідэальнай. Зараз падрыхтавалі да ўводу ў эксплуатацыю ўласны фарбавальны цэх, а ў перспектыве намецілі набыць бесструйную дробемётную камеру, каб можна было апрацоўваць і габарытныя вырабы.

Нядаўна з прымяненнем гэтых новых тэхналогій удзельнічалі ў адным цікавым праекце — рабілі вежы сотавай сувязі для кітайскай фірмы «Алкатэль», а яны пастаўлялі іх «Лайфу» (раней — «БеСТ»). Мы выканалі недзе 200 вежаў (кожная вышынёй 72 метры) і далі гарантыю антыкаразійнай абароны — 5 гадоў.

Зараз распрацавалі бізнэс-план і рыхтуем праграмнае забеспячэнне для аўтаматызаванай лініі па вырабе металаканструкцый, якая працуе пад кантролем камп'ютара. Яна дапаможа і надалей быць канкурэнтаздольнымі і зменшыць долю чалавечай працы. На нашай вытворчасці № 1 занята каля 220 чалавек. А набыццё лініі дазволіць удвая скараціць там колькасць працоўных. Мы нікога не адправім за вароты прадпрыемства, перавучым людзей і выкарыстаем іх на іншых участках. Як бачыце, развіваемся даволі імкліва і настойліва.

Пры гэтым належная ўвага ўдзяляецца энергазбержэнню. Тут мы ідзём двума шляхамі. Па-першае, укараняем сапраўды сучасныя, прагрэсіўныя механізмы, абсталяванне і тэхналогіі, якія ўжо самі па сабе энергазберагальныя. Паспрабуйце ў гэтым сэнсе параўнаць зварачны апарат ВД-306, які раней выкарыстоўваўся вельмі шырока, — грамоздкі настолькі, што з месца на месца яго можна было перамяшчаць толькі кранам, а ўслед цягнуць кіламетр кабеляў. І сучасную вектарную крыніцу вагой 10—12 кілаграмаў, якая дастаткова мабільная, зручная і эфектыўная. Зваршчык павесіў яе на плячо і пайшоў на любую вышыню. Розніца ў энергаспажыванні — у пяць разоў.

Далей. Стараемся выкарыстоўваць мясцовыя віды паліва. Для вытворчасці № 1 набылі ўстаноўку, якая абагравае вытворчыя карпусы шляхам спальвання адыходаў з нашага дрэваапрацоўчага цэха. Вось два асноўныя накірункі. І зараз пачалі асвойваць трэці — будаўніцтва энергазберагальных дамоў. Гэта наогул прарыў у энергазбержэнні ў дзяржаўных маштабах.

**У лабараторыі мы пабачылі, як на кантрольнай установцы ствараецца нагрузка да шасцісот кілаграмаў на квадратны сантыметр, і метал рвецца.**

**Але не ў тым месцы, дзе быў зроблены якасны зварны шоў.**

*(Працяг на 3 стар. )*

ISSN 1990 - 763X

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАЦВЯРДЖАЕ ГАТОЎНАСЦЬ ДА ПОЎНАМАШТАБНАЙ НАРМАЛІЗАЦЫІ АДНОСІН З ЗША НА ПАРТНЁРСКАЙ АСНОВЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка ў пэўнай ступені выказаў шкадаванне, што такая сустрэча з прадстаўнікамі вядучых аналітычных цэнтраў ЗША не адбылася намнога раней. «Упэўнены, што тады многія праблемы і незразумелыя моманты ў беларуска-амерыканскіх адносінах, а іх нямала, або не ўзніклі б, або былі б ужо вырашаныя», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама адзначыў, што шмат у чым менавіта на ацэнках і прагнозах аналітыкаў фарміруецца палітыка афіцыйнага Вашынгтона ў адносінах да той ці іншай краіны.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапануе стварыць пастаянны механізм двухбаковага абмену інфармацыяй і супрацоўніцтва паміж Беларуссю і ЗША. З такой ініцыятывай кіраўнік дзяржавы звярнуўся ўчора да прадстаўнікоў вядучых аналітычных цэнтраў ЗША.

«Спадзяюся, што нашы кантакты будуць прадоўжаны, а ваш першы візіт у Беларусь не стане апошнім, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Можа, нам нават варта падумаць аб стварэнні нейкага пастаяннага механізма двухбаковага абмену інфармацыяй і супрацоўніцтва».

Звяртаючыся да прадстаўнікоў вядучых аналітычных цэнтраў ЗША, Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што пры ўважлівым аналізе яны ўбачаць, як шмат у Беларусі і ЗША супадаючых інтарэсаў і прыярытэтаў.

«Мы добра ўсведамляем: Штаты — магутнейшая імперыя з глабальнымі інтарэсамі і такім жа ўплывам. І, як многія ў нас лічаць, месца Беларусі ў сістэме гэтых інтарэсаў быццам бы на галёрцы», — сказаў Прэзідэнт. На яго думку, так склалася таму, што ў Беларусі няма ні нафты, ні газу, яна не стварае праблем для міжнароднай бяспекі, не кідае выклікаў геапалітычным імкненням ЗША.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь з'яўляецца надзейным партнёрам ЗША ў барацьбе з асноўнымі пагрозамі XXI стагоддзя: міжнароднай злачыннасцю і тэрарызмам, незаконным абаротам наркотыкаў і гандлем людзьмі. «Беларусь поўнасцю падзяляе падыходы антытэрарыстычнай кааліцыі і ўносіць істотны ўклад у рэалізацыю яе мэт. Будучы членам Савета Еўра-Атлантычнага партнёрства, мы аказваем пасільнае садзейнічанне вырашэнню афганскай праблемы, прадастаўляючы нашу інфраструктуру для забеспячэння транзітных перавозак грузаў НАТА», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што, як і ЗША, Беларусь зацікаўлена ў забеспячэнні рэгіянальнай бяспекі і ядзерным нераспаўсюджванні. «Мы ўнеслі значны ўклад у пабудову бяз'ядзернага свету, добраахвотна адмовіўшыся ад валодання арсеналам ядзернай зброі», — адзначыў беларускі лідар. Ён згадаў таксама пра дасягнутую на саміце АБСЕ ў Астане дамоўленасць з Амерыкай аб вывазе з Беларусі запасаў высокаабагачанага ўрану. У сваю чаргу ЗША заявілі аб падтрымцы намаганняў Беларусі па выкарыстанні атамнай энергетыкі ў мірных мэтах. «Мы высока цэнім гэты крок амерыканскага боку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Дырэктар праграмы «Новыя еўрапейскія дэмакратыі», старшы навуковы супрацоўнік праграмы Еўропы Цэнтра стратэгічных і міжнародных даследаванняў ЗША Януш Бугайскі перадаў Аляксандру Лукашэнку пісьмо ад былога сенатара Сэма Нана, у якім ён дзякуе Аляксандру Лукашэнку за лідарства ў гэтым пытанні, вітаючы рашэнне вывесці з тэрыторыі Беларусі высокаабагачаны ўран. Ён таксама выказвае надзею на асабісты ўдзел Прэзідэнта Беларусі ў пытанні супрацоўніцтва ў сферы нераспаўсюджвання ядзернай зброі і зніжэння зброі масавага паражэння.

Гаворачы аб сваёй рабоце ў Беларусі, Януш Бугайскі адзначыў, што каманда прыехала, каб атрымаць больш поўную карціну аб краіне і яе развіцці, лепш зразумець праблемы краіны і спадзяванні, паглядзець шляхі, напрамкі, па якіх можна палепшыць адносіны паміж Беларуссю і ЗША. «Мы хочам убачыць спосабы таго, як, гаворачы вашымі словамі, роўнанабліжанасць перанесці ў практычную плоскасць. Партнёрства, але не дамінаванне, супрацоўніцтва, але не падпрадкаванасць — гэта сапраўдная аснова для раўнапраўнага супрацоўніцтва Беларусі з любой краінай, не толькі з ЗША. Гэта тое, што мы хацелі б дапамагчы ажыццявіць», — сказаў дырэктар праграмы «Новыя еўрапейскія дэмакратыі».

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ ЗАКЛІКАЕ ВЫБАРШЧЫКАЎ ПАДТРЫМАЦЬ КУРС ДЗЯРЖАВЫ НА СТВАРЭННЕ

Аб гэтым гаворыцца ў звароце прэзідыума творчай грамадскай арганізацыі, паведамляе **БЕЛТА**.

«Мінулыя гады дакладна засведчылі: курс, выбраны кіраўніцтвам краіны, быў правільным, стваральным. Беларусь, якая ў пачатку 90-х гадоў знаходзілася на краі бездані, не толькі ўстаяла, пазбегла катастрофы, але захавала, умацавала і цяпер развівае эканоміку, набыла палітычную стабільнасць, грамадскую згоду, стала вядомай у свеце». Пісьменнікі падкрэсліваюць, што ў Беларусі ўзводзяцца жыллё, прамысловыя, культурныя і спартыўныя аб'екты, развіваецца прамысловасць і сельская гаспадарка. Сацыяльны клопат дзяржавы ахоплівае ўсе слаі народа: працаўнікоў, дзяцей, навучэнскую моладзь, пенсіянераў, ветэранаў вайны і працы, інвалідаў. «Планы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку — пераканаўчае сведчанне таго, што і ў далейшым дзяржава мае намер ісці выбраным курсам». Саюз пісьменнікаў Беларусі быў створаны ў 2005 годзе, цяпер ён аб'ядноўвае амаль 600 майстроў слова.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са **смерцю УЛЬЯНКІ Барыса Васільевіча** — былога дырэктара выдавецтва «Ураджай», былога кіраўніка арганізацыйна-метадычнага цэнтра па выданні гісторыка-дакументальных «Хронік Памяці» і выказвае глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

Прыём грамадзян

Уладзімір МАКЕЙ:

## БОЛЬШАСЦЬ ЗВАРОТАЎ НА ПРАМУЮ ЛІНІЮ ЗВЯЗАНА З ПРАБЛЕМАМІ ЖЫЛЛЁВАГА БУДАЎНІЦТВА

Усе, хто звярнуўся на гарачую тэлефонную лінію, атрымаюць кампетэнтныя адказы на хвалюючыя іх праблемы на працягу бліжэйшых дзён. Аб гэтым паведаміў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей учора ў час праведзенай прамой лініі ў Мінгарвыканкаме, перадае **БЕЛТА**.

Трэба адзначыць, што з надзённымі пытаннямі да кіраўніка Адміністрацыі звярталіся не толькі мінчане, але і жыхары іншых рэгіёнаў краіны.

Большасць нараканняў грамадзян датычылася пытанняў жыллёвага будаўніцтва — працяглых тэрмінаў узвядзення дамоў, браку, павелічэння кошту будаўніцтва. Так, паступіла скарга на ўпраўленне капітальнага будаўніцтва Мінскага раёна, якое перавысіла ўстаноўлены тэрмін будаўніцтва дома для супрацоўнікаў МНС на некалькі гадоў, а людзі ж узялі крэдыты ў банках. «Гэта нядобрасумленны забудоўшчык, — сказаў Уладзімір Макей. — Кіраўнік дзяржавы чарговы раз звярнуў увагу на тэму якасці будаўніцтва на IV Усебеларускім народным сходзе. Мы навядзём парадак у гэтай сферы».

Таксама хвалявалі абанентаў прамой лініі такія пытанні, як прамярзанне сцен пасля капрамонту, добраўпарадкаванне двароў, падзел маёмасці пасля разводу, узровень пенсій і зарплат. Уладзімір Макей гарантаваў, што кожны зварот будзе ўзяты на кантроль Адміністрацыі Прэзідэнта, Камітэта дзяржаўнага кантролю, Мінгарвыканкама і іншых органаў дзяржкіравання. І калі будуць выяўлены парушэнні ў разглядзе зваротаў грамадзян, да вінаватых прымуць меры дысцыплінарнага спагнання.

## ПАЦЯПЛЕЛА ПАДЛОГА




**Па «гарачай лініі», якая працавала падчас народнага сходу, паступіла скарга ад жыхаркі горада Гомеля Галіны Патапенкі. Маці васьмярых дзяцей расказала, што ў яе кватэры, якая знаходзіцца на першым паверсе, вельмі халодная падлога, па якой меньшыя дзеці поўзаюць.**

Між іншым, 9-павярховы 80-кватэрны дом № 97 па вуліцы Галавацкага адносіцца да таварыства ўласнікаў «Азёрнае» і здадзены ў эксплуатацыю чатыры гады таму. На зварот адразу адрэагавалі ў КЖРУП «Цэнтральнае». Як паведаміла інжынер гэтай арганізацыі Святлана Навакоўская, за выхадныя дні былі праведзены работы па ўцяпленні ўнутраных сцен падвальнага памяшкання па перыметры кватэры Галіны Аляксандраўны.

— Эффект ёсць, у кватэры сапраўды адразу пацяплела, — кажа гаспадыня кватэры. — Двухгадовае дзіця можна ўжо выпускаць на падлогу. Будзем спадзявацца, што і маразы цяпер не страшныя.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## РУБЛЁВЫЯ І ВАЛЮТНЫЯ ЎКЛАДЫ НАСЕЛЬНІЦТВА ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ

Рублёвыя і інвалютныя ўклады насельніцтва ў беларускіх банках на пачатку снежня склалі больш за 22,5 трыльёна Br. Сёлета за адзінаццаць месяцаў яны павялічыліся амаль на 4,4 трыльёна Br, або на 24,1 працэнта. Дэпазіты ў нацыянальнай валюце за мінулы перыяд узраслі на 23,2 працэнта, а ў замежнай — на 17,8 працэнта і склалі адпаведна каля 9,9 трыльёна Br і амаль 4,2 мільярда долараў ЗША ў эквіваленце.

**Упраўленне інфармацыі Нацыянальнага банка.**

Наталля ПЯТКЕВІЧ:

# «Маштабная работа са зваротамі грамадзян дапаможа даведацца, што хвалюе людзей»

**ПЕРШЫ намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля ПЯТКЕВІЧ правяла ўчора прыём работнікаў ААТ «КамВоль» непасрэдна на прадпрыемстве. Пытанні, адрасаваныя Наталлі Уладзіміраўне, датычыліся, у прыватнасці, раскладу руху грамадскага транспарту, што актуальна для тых, хто жыве далекавата ад камбіната, слаба развітай непасрэдна ў раёне Камвольнага інфраструктуры: тут адсутнічаюць, напрыклад, Дом быту, мэблевы магазін, дзяржаўная аптэка. Былі і пытанні па гаражна-будаўнічым кааператыве, садовым таварыстве, налічэнні пенсіі. На некаторыя пытанні адказы даваліся адразу, іншыя сітуацыі яшчэ будуць разглядацца.**

Па завяршэнні прыёму Наталля Пяткевіч прызнала падобную практыку вельмі важнай, паколькі размова ідзе пра «асноўны від работы супрацоўнікаў дзяржаўных органаў». «Прэзідэнт пастаянна ўдзяляе гэтаму пільную ўвагу, — з тым, каб даведвацца, што хвалюе людзей, і дапамагчы ім вырашыць праблемы, — заўважыла Пяткевіч перад журналістамі. — Гэты прыём, як і большасць папярэдніх, праведзеных па даручэнні Прэзідэнта, паказвае, што праблемы, з якімі прыходзяць людзі, носяць галоўным чынам, мясцовы, і часам бытавы характар. Гэта значыць, іх не вырашаюць тыя, хто павінен гэтым займацца. Такі прыём паказаў дзве асноўныя праблемы — нявысокага жылля і перабояў у рабоце грамадскага транспарту ў гадзіну пік. Адносна першай трэба нагадаць, што Прэзідэнт даручыў пад персанальную адказнасць міністра архітэктуры і будаўніцтва ўстараніць да нова года гэта ўсе недахопы ў жыллі, узведзеным на сёння. Што да другога пытання, то яго ўзнікненне тлумачыцца аб'ектыўнымі прычынамі, хуткімі тэмпамі вядзецца жыллёвае будаўніцтва, з'яўляюцца новыя мікрараёны. Тым не менш, я ўпэўнена, што сумесна з гарадскімі ўладамі гэта праблема будзе вырашана».

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта наведала таксама вытворчасць, пагутарыла з работніцамі і абмеркавала з прадстаўнікамі адміністрацыі ААТ «КамВоль» і канцэрна «Беллегпрам» некаторыя пытанні запатрабаванасці айчыннай прадукцыі лёгкай прамысловасці. Той жа «КамВоль», вядома ж, не працуе на склады. З 1955 года — ад моманту нараджэння і па сёння — камбінат вырабляе шарсцяныя тканіны, у якіх цяпер шэрсць спалучаецца, напрыклад, з ільном, лайкрай, віскозай, поліэфірам. Такая прадукцыя неабходная для пашыву, галоўным чынам, мужчынскіх касцюмаў, адзення для дзяцей і падлеткаў, а таксама для вырабу формы ўсіх сілавых структур. Каля 60 працэнтаў камвольнай прадукцыі выкарыстоўваецца ўнутры краіны, 30 працэнтаў пастаўляецца ў Расію, астатняе накіроўваецца ў іншыя краіны блізкага і далёкага замежжа. Працуе Камвольны выключна пад заказ. Іншая рэч, тэхналогія вытворчасці не дазваляе выпускаць непасрэдна столькі пагонных метраў тканіны, колькі жадае заказчык. Звычайна атрымліваецца крыху больш. Астатак жа адпраўляецца на склад, дзе з 90-х гадоў назбіралася ўжо цэлая калекцыя. І куды збыць гэтыя «хвасты», пакуль не ясна.

Ёсць і іншае пытанне. Тканіны «КамВоля» — высакаякасныя, натуральныя, з высокім працэнтам шэрсці. Толькі з такіх бы і шыць тую ж школьную форму. Аднак рынак прапануе бацькам і іншыя, імпартныя, варыянты касцюмаў і сукенак — не высакаякасных, не натуральных і з вельмі нізкім утрыманнем шэрсці. Парадокс у тым, што да імпартных варыянтаў дзіцячага адзення ў бацькоў, як правіла, менш прэтэнзій, чым да айчынных. Словам, «КамВоль» зацікаўлены ў дзяржаўным заказе на школьную форму. Але хто і што прымусіць пакупнікоў набываць зробленае? Практыка сведчыць, што праблема збыту — не заўсёды праблема выключна кошту.

Незлічоная колькасць мінчан — надзвычай занятая і прывучаная цаніць час — едзе ў гіпермаркеты, каб у адным месцы набыць усё і адразу. І калі ў гэтых «гіперах-маркетах» не знойдзецца беларускай майкі, кашулі, шкарпэтак і дзіцячых касцюмаў, пакупнік пойдзе па простым шляху — возьме тое, што там прапануецца. А прапануецца, галоўным чынам, завезенае. Крочыць за лозунгам «Купляйце беларускае» можна толькі ў буйных універмагах — ЦУМе, ГУМе, «Беларусі» ды ГД «На Нямізе», куды трэба выбірацца спецыяльна і пажадана не на аўтамабілі, паколькі праблема з паркоўкай у азначаных месцах толькі нарастае. Мабыць, не варта чакаць, пакуль людзі падуць ва ўнівермаг назло ўсім нязручнасцям? Лепш адкрыць «беларускія» кропкі ў гіпермаркетах і гандлёвых цэнтрах...

«Кожны павінен мець права выбару, — кажа в.а. генеральнага дырэктара Аляксандр ЛАЗАРАЎ. — Наша вытворчасць — гэта выраб шэрсці. У шэрагу імпартных рэчаў вы знойдзеце літаральна рэшткі шэрсці... Але наўрад ці мы прымусім набываць вырабы з шарсцяных тканін таго, хто аддае перавагу віскозе... За савецкім часам наш камбінат вырабляў 22 млн пагонных метраў тканін у год. Апошнім часам у самы лепшы для нас год мы вырабілі 2,7 млн. Аднак у нас добрыя планы. З наступнага года пачынаюцца праектныя работы па ўзвядзенні ў непасрэднай блізкасці ад дадзенай вытворчасці новага будынку, дзе ўжо ў 2014 годзе будзе выраблена 4 млн пагонных метраў. 2 млн гатовая ў нас набываць Турцыя. Такім чынам, 50 працэнтаў тканін будзем экспартаваць».

Новы будынак абяцае быць сучасным, бяспечным з усіх пунктаў гледжання. Цяперашні корпус мае, напрыклад, шэраг заган. Вытворчыя памяшканні неверагодна халодныя, паколькі ацяпленне ў іх праведзена пад самай столлю. Сам будынак быў сканструяваны так, што пры неспрыяльным раскладзе здольны скласціся «як картачны домік», што мела месца ў 60-х і ледзь не паўтарылася ў 1997-м.

Тэкстыльная вытворчасць не адносіцца да ліку цалкам бяскодных. Шэраг спецыяльнасцяў на «КамВолі» прадугледжваюць больш ранні выхад на пенсію. Абсалютная большасць работнікаў камбіната — жанчыны, чый сярэдні ўзрост — 45 гадоў. Сярэдні заробак на прадпрыемстве — 830 тысяч рублёў. 400 чалавек чакаюць паляпшэння жыллёвых умоў. Паводле слоў Аляксандра Лазарава, «днямі быў здадзены першы ЖБК, непадалёку ад камбіната закладваецца наступны дом на 90 кватэр». Сам Аляксандр Валянцінавіч разам з намеснікамі раз на тыдні адводзіць гадзіны для прыёму работнікаў, так што «патрэбы свайго калектыву я добра ведаю, хоць не ўсе праблемы можна вырашыць па аб'ектыўных прычынах».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Звольніць «па артыкуле» бывае не так проста

Твае правы

**ПРАБЛЕМЫ на працы — з'ява даволі распаўсюджаная. І калі нікалі тут усё даходзіць, па сутнасці, да адкрытага канфлікту, у выніку чаго работнік чуе ад свайго кіраўніцтва: «Пішы заяву сам, а тое звольнім «па артыкуле». Зразумела, што такая сітуацыя заўсёды непрыемная. Аднак далёка не крытычная, бо, як правіла, здзейсніць падобную «пагрозу» на справе бывае не так проста. І ў такім выпадку работніку нялішне ведаць некаторыя нюансы нашага заканадаўства.**

### Калі няма падстаў — «уласнае жаданне»

Ці не найбольш папулярны варыянт у выпадку тых або іншых непаразуменняў — сапраўды прапанова напісаць заяву на звальненне «па пагадненні бакоў» ці па «па ўласным жаданні». І само па сабе гэта падаецца як пэўны кампраміс. Маўляў, ты нас добраахвотна пакідаеш, а мы табе — не «псуём» працоўнай кніжкі. Прычым менавіта такая раскладка прымушае многіх сур'ёзна задумацца. І ўсё ж канчатковае рашэнне трэба прымаць з улікам адной даволі істотнай акалічнасці.

— Напісаць самастойна заяву — значыць даць наймальніку абсалютна законную падставу для «развітання», — кажа загадчык юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімір Шалковіч. — Між тым практыка сведчыць: у абсалютнай большасці выпадкаў прапанова пайсці па асабістай ініцыятыве сведчыць толькі аб адным: у наймальніка няма якіх-небудзь іншых магчымасцяў для звальнення. Таму ад падобнай прапановы кіраўніцтва заўсёды можна проста адмовіцца. І прымусіць работніка нешта пісаць тут ніхто не зможа.

### Без віны — не вінаваты

Нашмат больш складаны момант — пагроза звальнення па «непрыемным артыкуле». Такое права наймальнік мае. Аднак толькі тады, калі работнік сапраўды «вінаваты» — скажам, гаворка аб прагуле, распіцці на працоўным месцы алкагольных напояў ці з'яўленні на працы ў нецвярозым стане, сістэматычным невыкананні працоўных абавязкаў. Праўда, тут таксама ёсць пэўныя цікавыя моманты.

— Па-першае, звальненне за вінаватыя дзеянні павінна быць абгрунтаваным, а па-другое, наймальнік абавязаны выканаць пэўную працэдуру, — падкрэслівае Уладзімір Шалковіч. — Так, у выпадку прагулу наймальнік павінен высветліць, ці былі на тое ўважлівыя, і ў тым ліку працверджаныя дакументамі, прычыны. Пры падазрэнні на алкагольнаеап'яненне, як правіла, праводзіцца абследаванне ў спецыяльнай медыцынскай установе. А што да звальнення за сістэматычнае невыкананне працоўных абавязкаў, то гэта магчыма тады, калі работнік ужо атрымліваў заўвагі, вымовы ці іншыя спагнанні раней.

І яшчэ. Варта заўважыць, што пры звальненні за прагул і за сістэматычнае невыкананне працоўных абавязкаў наймальнік павінен не пазней чым за два тыдні паведаміць аб гэтым прафсаюзу. А ў выпадку, калі адпаведны запіс ёсць у калектыўным дагаворы, — нават атрымаць ад таго ж прафсаюза згоду.

### «Неадпаведнасць» трэба працвярджаць

Калі-нікалі для развітання выкарыстоўваецца іншы аргумент — неадпаведнасць пасадзе. Тут можа быць па-рознаму. Напрыклад, прычынай «неадпаведнасці пасадзе» бывае цяжкая хвароба, якая перашкаджае працягу ранейшай працы. У такой сітуацыі выбару ў таго ж наймальніка фактычна няма: звальненне павінна адбыцца. Адно, што той жа наймальнік абавязаны пашукаць усе варыянты пераводу работніка на іншае месца, праца на якім будзе стасавацца з індывідуальнай праграмай медыцынскай рэабілітацыі.

— Іншы выпадак — намер звольніць з прычыны недастатковай кваліфікацыі, — заўважае Уладзімір Шалковіч. — Тут наймальнік абавязаны вынесці заключэнне, што работнік не мае неабходных ведаў, навыкаў, вопыту. А ў сваю чаргу, такое заключэнне выносіцца толькі на падставе неаднаразовых фактаў невыканання тых або іншых даручэнняў, невыканання нормаў выпрацоўкі, браку прадукцыі. Да таго ж няякаснае выкананне працоўных абавязкаў пацвярджаецца дакладнымі запіскамі, актамі, рэкламацыямі, матэрыяламі праверак кантрольных органаў, вынікамі праверак атэстацыйнай камісіі.

Прычым зноў жа: звальненне з прычыны недастатковай кваліфікацыі можа адбыцца толькі тады, калі работніка немагчыма перавесці на іншае месца, і ў тым ліку — перавесці з перанавучаннем.

### Пунктам адліку будзе загад

Часта здараецца так: са сваім прымусовым звальненнем з прычыны «вінаватых дзеянняў» ці з-за недастаткавай кваліфікацыі работнік катэгарычна не згодны. У такім разе давядзецца ісці ў суд па месцы знаходжання наймальніка. Плаціць якія-небудзь пошліны тут не спатрэбіцца. Аднак варта памятаць, што сам зварот у суд павінен адбыцца не пазней чым праз месяц пасля звальнення.

— Варта памятаць, што падставы звальнення заўсёды ўказваюцца ў загадзе наймальніка, — адзначае Уладзімір Шалковіч. — Таму работнік мае права запытаць копію гэтага загада, а таксама дакументы, якія сталі падставай для яго з'яўлення. І ўжо ў залежнасці ад гэтых дакументаў можна ацаніць: наколькі аб'ектыўным было рашэнне наймальніка і ці ўлічыў той жа наймальнік усе акалічнасці.

### Калдагавор — заўсёды аргумент

Між тым не сакрэт, што звычайна для звальнення таго або іншага «непажаданага» супрацоўніка выбіраецца ці не самы просты шлях — непрацяг працоўнага кантракта. Даваць якія-небудзь тлумачэнні свайму рашэнню наймальнік тут не абавязаны. А гарантыі па працягу кантрактаў на ўзроўні «агульнага» заканадаўства існуюць толькі для некаторых катэгорый — у прыватнасці, для жанчын з дзецьмі ва ўзросце да 5 гадоў, а таксама для работнікаў у перадпенсійным (53 гады ў жанчын ці 58 гадоў у мужчын) узросце.

— Разам з тым трэба зазначыць: гарантыі па працягу кантрактаў таксама маюць катэгорыі работнікаў, якія прадугледжаны ў калектыўным дагаворы арганізацыі, прычым праіснаваць падобны запіс кіраўніцтва гэтай арганізацыі не мае права, — падкрэслівае Уладзімір Шалковіч. — Пры гэтым цяпер Федэрацыя прафсаюзаў вядзе вялікую работу, накіраваную на ўнясенне ў калдагаворы нормы, што дазваляла б работнікам, якія адпрацавалі па кантрактах не менш за 5 гадоў і якія не маюць дысцыплінарных спагнанняў, мець права выбару: працягваць кантракт надалей або пераходзіць на бестэрміновы працоўны дагавор.

**Сяргей ГРЫБ.**

### АД ЗАРОБКАЎ І ДА ПЕНСІЙ

**15 снежня міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Акіндзінаўна Шчоткіна правядзе прамую тэлефонную лінію, удзел у якой змогуць прыняць усе грамадзяне Беларусі, пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміла прэс-сакратар міністэрства Варвара Александровіч.**

«Прамая лінія» пройдзе з 10.00 да 11.30 па тэлефоне міністэрства (017) 306 37 95. Аднак з улікам магчымай вялікай колькасці пытанняў прынятае рашэнне: у гэты ж час звароты будуць прымацца і праз сайт www.mintrud.gov.by (раздзел «Інтэрактыўныя канферэнцыі»). Пажадана пры адпраўцы электроннага звароту ўказваць у ім імя, імя па бацьку, месца жыхарства, а таксама месца працы або вучобы. У міністэрстве запэўнілі: канкрэтныя звесткі аб месцы жыхарства, працы або вучобы ў адкрытым доступе на сайце размяшчацца не будуць.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Абзац

◢ **У Віцебскай вобласці цягнік збіў гужавую павозку. Інцыдэнт адбыўся ўвечары 13 снежня паблізу ад станцыі Старое Сяло. Жывёлавод мясцовага СВК — 22-гадовы жыхар Шумілінскага раёна — на павозцы выехаў на пераезд на забараняльны сігнал святлафора. Павозка сутыкнулася з цягніком Полацк-Масква. Чалавек застаўся жывы, конь загінуў. Цягнік не затрымаўся. Падчас разбіральніцтва высветлілася, што жывёлавод быў п'яны.**

◢ Незадаволены пакупнік ледзь не задушыў касіра. Справа аб злосным хуліганстве распачата ў Заводскім РУУС Мінска ў дачыненні да 44-гадовага мінчаніна. Пасля добрага застолля мужчына адправіўся ў адзін з магазінаў па вуліцы Красіна. Набраўшы ў кошык прадуктаў, ён падышоў да касы, аднак дзяўчына-прадавец тым часам пералічвала грошы, таму парэкамендавала звярнуцца да іншага тэрмінала. Гэтыя словы раззлавалі нецвярозага пакупніка. Ён стаў патрабаваць, каб яго абслужылі менавіта ў гэтай касе, пасля чаго накінуўся на прадаўца і стаў душыць яе. Дзяўчына пачала крычаць, а яе калегі выклікалі міліцыю. Пасля прыезду міліцыянераў хуліган накінуўся і на іх.

## Поўны абзац

◢ **У брытанскіх крамах з'явіліся навагоднія елкі-палавінкі. Дрэвы прадаюцца ў разрэзаным папалам вертыкальна — ад вершалінкі да асновы — выглядзе. Такім чынам вытворцы і спажыўцы адрэагавалі на перыяд фінансавых цяжкасцяў і жорсткай эканоміі, што перажывае краіна. Елкі, у асноўным, штучныя. Іх кошт — каля 20 фунтаў стэрлінгаў (30 долараў ЗША). Гэтая сума складае якраз палову кошту цэлай сінтэтычнай прыгажуні. Такія елкі маюць яшчэ адну перавагу — яны займаюць менш месца і таму карыстаюцца ўстойлівым попытам.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### БАВАРСКІЯ ВЯСКОЎЦЫ ПАСТАВІЛІ ПАД ПАГРОЗУ АЛІМПІЙСКІЯ ГУЛЬНІ Ў МЮНХЕНЕ

**59 баварскіх вяскоўцаў і зямельных уласнікаў з Гарміш-Партэнкірхена катэгарычна адмовіліся саступаць свае ўчасткі зямлі пад пляцоўкі для спартовых аб'ектаў, якія нямецкія ўлады плануюць уладкаваць да зімовых Алімпійскіх гульняў 2018 года, паведамляе Sueddeutsche Zeitung.**

Вяскоўцы і зямельныя ўласнікі адправілі ліст у канцылярыю прэм'ер-міністра Баварыі Хорста Зеехофера, у якім афіцыйна пазначылі сваю пазіцыю. Яны таксама запатрабавалі ад Мюнхена да 22 снежня адклікаць сваю заяўку на правядзенне зімовых Алімпійскіх гульняў.

У адваротным выпадку вяскоўцы маюць намер напрамую звярнуцца ў Міжнародны алімпійскі камітэт і апавясціць яго кіраўніцтва, што яно не можа разлічваць на іх зямельныя ўчасткі пры планаванні правядзення спартовых спаборніцтваў. Заяўка Мюнхена на правядзенне зімовых Алімпійскіх гульняў апынулася пад пагрозай.

Як адзначае SZ, згаданыя ўчасткі зямлі, у прыватнасці, размяшчаюцца ў зоне фінішу знакамітага горналыжнага спуску «Кандагар», побач з лыжным стадыёнам у Гудыбергу і трасай у Хаўсбергу. Усе зямельныя ўчасткі знаходзяцца ў межах так званай зоны бяспекі вакол алімпійскіх аб'ектаў, якую МАК патрабуе перадаць у сваё распараджэнне.

### РАСІЯНЕ ЗАСУМНЯВАЛІСЯ Ў ТАНДЭМЕ?

**Колькасць расіян, якія не здолелі падчас апытання грамадскай думкі ацаніць эфектыўнасць працы Уладзіміра Пуціна і Дзмітрыя Мядзведзева, за год выраслa на восем адсоткаў. Гэтыя звесткі зафіксаваны ў апытанні УЦДГД, праведзеным у жніўні і верасні.**

У 2009 годзе тых, хто не вызначыў сваё стаўленне да тандэму, было 13 адсоткаў. У 2010 годзе не змог адказаць на гэта пытанне ўжо 21 адсотак апытаных.

За год таксама скарацілася колькасць расіян, якія лічаць сумеснае кіраўніцтва краінай Пуціным і Мядзведзевым эфектыўным — з 64 адсоткаў да 60 адсоткаў. «Вельмі эфектыўным» тандэм назвалі 10 адсоткаў рэспандэнтаў (у 2009 годзе — 15 адсоткаў).

Разам з тым колькасць тых, хто лічыць кіраўніцтва Расіі неэфектыўным, таксама скарацілася — з 23 да 19 адсоткаў.

67 адсоткаў расіян лічаць, што тандэм носіць доўгатэрміновы характар, і не бачаць прычын, якія маглі б яго хуткім часам разбурыць. 15 адсоткаў бачаць саюз Пуціна і Мядзведзева ўнутрана нетрывалым і лічаць, што эканамічныя і палітычныя праблемы канчаткова разбураць яго на працягу хуткага часу.

### ПУЛЬТ АД ТЭЛЕВІЗАРА — ГАЛОЎНАЯ ПРЫЧЫНА СВАРАК НА КАЛЯДЫ

**Галоўнай прычынай сварак падчас зімовых свят апынуўся пульт ад тэлевізара. Пра гэта сведчаць вынікі апытання, у якім прынялі ўдзел каля дзвюх тысяч жыхароў ЗША, паведамляе NewsLite.**

Удзельнікі сацыялагічнага даследавання прызналіся, што пытанне валодання пультам у той час, калі па тэлевізары ідуць разнастайныя калядныя праграмы, паўстае ў іх сем'ях часцей і вастрэй за ўсё. На другім месцы апынуліся канфлікты, звязаныя са стрэсам у сувязі са стомленасцю і занепакоенасцю жонкі і маці за калядную вячэру. Трэцяй прычынай сварак у святы названа тая акалічнасць, што дзеці не жадаюць дапамагаць на кухні маці.



### У МАСКВЕ ЧАКАЮЦЬ ПРАЦЯГУ «МАНЕЖНАЙ»

**Агрэсіўна настроеная моладзь можа ўчыніць новыя пагромы ў Маскве, падобныя таму, што адбыўся 11 снежня на Манежнай плошчы. Міліцыя правярае інфармацыю пра магчымыя масавыя вулічныя акцыі ў сераду, у тым ліку каля гандлёвага цэнтра «Еўрапейскі» на плошчы Кіеўскага вакзала, а таксама побач з Курскім вакзалам і на станцыях метро.**

З'явіліся чуткі, быццам у Маскву з Каўказа накіроўваюцца агрэсіўныя малойчыкі, ахвотнікі адпомсціць нацыяналістам. Зрэшты, паўторы пагромаў і масавых боек чакалі і ў панядзелак: цэнтр Масквы быў «зачышчаны», але, на шчасце, нічога так і не здарылася. Шматлікія сайты і форумы, як фанацкія, так і прадстаўнікоў дыяспар, заклікаюць не паддавацца на правакацыі радыкалаў і не займацца распальваннем міжэтнічнай варожасці.

«Шматлікія нефармальныя і неафіцыйныя сайты запоўнены інфармацыяй пра тое, што 15 снежня ў горадзе могуць прайсці чарговыя акцыі, арганізаваныя радыкальнымі рухамі. У сілавых структурах выдатна ведаюць пра гэта і правяраюць праўдзівасць гэтай інфармацыі», — паведамілі крыніцы ў праваахоўных органах.

Паводле іх слоў, ёсць заклікі, звернутыя да жыхароў каўказскага рэгіёна, пра тое, каб яны ўзбройваліся. Гэтая інфармацыя правяраецца, праводзяцца аператыўныя мерапрыемствы. Для прадухілення магчымых правакацый з боку радыкалаў падраздзяленні сістэмы МУС знаходзяцца ў павышанай гатоўнасці.

# СІКОРА ЗАСТАНЕЦЦА З «ДЫНАМА»

*Андрэй Мезін абверг чуткі пра канфлікт гульцоў і трэнера*

**ДЛЯ сталічнага «Дынама» паўза ў чэмпіянаце КХЛ пачалася з навін у цэлым прыемных: пасля сустрэчы з кіраўніцтвам клуба, а ім, як вядома, з'яўляецца БФСТ «Дынама», аргвысновы калі і былі зробленыя, то не рэвалюцыйныя: Марэк Сікора застаецца на пасадзе галоўнага трэнера. Юрый Бародзіч даручыў в.а. генеральнага дырэктара Аляксею Тарбіну прааналізаваць сітуацыю, а яна для сталічных «бела-блакітных» несуцяшальная (з выязнога чатырохматчавага турнэ каманда прывезла ўсяго два ачкі), і шукаць спосабы выводзіць каманду са спаду.**

Аляксей Тарбін у сваю чаргу заявіў, што «не выключана, што да асобных хакеістаў з ліку легіянераў могуць быць прыменены меры фінансавага характару, а з кімсьці з нашых хакеістаў прыйшоў час развітацца. Гэта не значыць, што будуць знойдзеныя «казлы адпушчэння», тым не менш, аналіз па эфектыўнасці выкарыстання некаторых гульцоў праводзіцца». Так у панядзелак выказаўся

# ТАКАЯ РАМАНТЫЧНАЯ ПРАФЕСІЯ — ЛЮДЗЯМ ГАРАДЫ ДАРЫЦЬ

Начальнік участка вузлоў і дэталяў тэхналагічных трубаправодаў Мікалай КОРШУН.

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

## Гонар калектыву

**АЎДАЧОНАК Віктар Міхайлавіч** — слесар па зборцы металаканструкцый.
**БАРОХА Сяргей Віктаравіч** — слесар па зборцы металаканструкцый, брыгадзір.
**БОХАН Мікалай Пятровіч** — мантажнік тэхналагічнага абсталявання, брыгадзір.
**ВАРХАЛ Пётр Андрэевіч** — каменшчык-брыгадзір.
**ДУДКІН Уладзімір Пятровіч** — начальнік участка.
**ЖАРНОЎ Андрэй Сяргеевіч** — муляр.
**ІВАНОЎ Аляксей Віктаравіч** — дэфектаскапіст.
**ЛАРЫН Вячаслаў Віктаравіч** — мантажнік тэхналагічнага абсталявання.
**ЛЕМЗА Мікалай Часлававіч** — мантажнік тэхналагічнага абсталявання.
**ЛЕХЦЕРАЎ Сяргей Анатольевіч** — электразваршчык ручной зваркі.
**ЛІТОЎКА Леангіна Іосіфаўна** — бухгалтар.
**МАЦКЕВІЧ Аляксей Аляксандравіч** — муляр, брыгадзір.
**ПЯТРОЎ Міхаіл Міхайлавіч** — слесар.
**ПІЛЮШЫН Аляксандр Міхайлавіч** — электразваршчык ручной зваркі.
**РУБІН Уладзімір Мікалаевіч** — машыніст крана.
**РУДЗІК Сяргей Мар'янавіч** — майстар будаўнічых і мантажных работ.
**САМАДЗЕЛКІН Аляксандр Міхайлавіч** — слесар па зборцы металаканструкцый, брыгадзір.
**ХРЫСЦІНА Надзея Васільеўна** — спецыяліст па кадрах.

## Не змаглі застацца ўбаку

***— Аляксандр Пятровіч, вы коратка ўпамянулі пра асваенне нетрадыцыйных для вас напрамкаў работы...***

— Апошнім часам мы пачалі ўзводзіць жыллё. Хоць ніколі да гэтага не думалі, што зоймемся жыллёвым будаўніцтвам, бо гэта даволі спецыфічная справа. Можна сказаць, дыверсіфікацыя працягваецца. Пачыналі з узвядзення сельскіх домікаў па праграме адраджэння вёскі. Разумелі, што праграма — вялікая, напружаная, і выконваць яе патрэбна, а будаўнічых магутнасцяў у краіне не хапае. І не змаглі застацца ў баку ад усенароднай справы. Тым больш, што маем свой калгас — у 2004 годзе далучылі да сябе дзве адстаючыя гаспадаркі не блізкага Пастаўскага раёна. І за гэты час паспелі на сабе адчуць праблемы вёскі, галоўная з якіх — менавіта адсутнасць сучаснага жылля. Так што «ўпрагліся» і ў гэты клопат і за апошні час накіравалі ў сваё сельскагаспадарчае падраздзяленне вельмі шмат сродкаў — за чатыры гады прыкладна 8 мільярдаў рублёў, якія пайшлі на развіццё філіяла. У іх ёсць думкі, планы, і мы будзем дапамагаць ім усё гэта ажыццяўляць. У прыватнасці, ужо ёсць рашэнне аб узвядзенні жывёлагадоўчай фермы.

Але вернемся да вясковага будаўніцтва. За пяць гадоў узвялі ў розных раёнах Віцебшчыны прыкладна 200 дамоў сядзібнага тыпу, з надворнымі пабудовамі.

А зараз пачалі займацца і ўзвядзеннем шматпавярховых дамоў у сваім горадзе. Згадзіцеся, што гэта даволі буйны крок у развіцці калектыву. Ужо здалі адзін 72-кватэрны дом у Навапалацку, і да канца года павінны здаць яшчэ адзін, энергаэфектыўны. Першы энергаэфектыўны дом у горадзе.

На наступны год запланавана будаўніцтва трох шматкватэрных жылых дамоў нашымі сіламі.

***— Спакойна жыць, мяркуючы па ўсім, вы не можаце...***

— А таму знайшлі абсалютна новы для сябе напрамак. І зараз займаемся вельмі цікавай, на мой погляд, тэмай. Сумесна з інстытутам НІПТІС імя Атаева спрабуем укараніць зусім новы для Беларусі тып жылля — дом у металічным каркасе з агароджвальнымі канструкцыямі фасада тыпу сэндвіч-панэляў і выкарыстаннем мінералаватных пліт у якасці напаўняльніка. Такі тып жылля шырока прымяняецца ў скандынаўскіх краінах. Яно мае сацыяльную скіраванасць, таму што больш таннае. Па цэлым шэрагу прычын яно і больш якаснае, а яшчэ дае істотнае скарачэнне нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва.

Для пачатку вырашылі ўкараніць ідэю ў сябе, выступілі заказчыкам на праектаванне такога дома. Ужо ёсць архітэктурны праект. Мы зможам цалкам скарыстаць сваю спецыфіку, свае навыкі мантажнай арганізацыі. Металаканструкцыі, ды і фактычна ўсё іншае для гэтага дома, будзем рыхтаваць самі, у тым ліку збіраць панэлі са шкловаты вытворчасці «Гомельбудматэрыялаў». Нічога складанага для сябе па тэхналогіі вырабу і мантажу, па вялікім рахунку, я не бачу. Як ні кажыце, а нам больш зручна будаваць дамы з металу, чым з цэглы. І гэта будзе першы такі дом у Беларусі. Спадзяюся, потым пойдуць заказы з іншых гарадоў.

## Кожны на сваім месцы

***— Раскажыце, калі ласка, пра вашу даволі арыгінальную структуру.***

— Структура сапраўды крыху незвычайная, цэнтралізаваная. У іншых будаўнічых арганізацыях дзейнічае трэстаўская структура — трэст з упраўленнямі і службамі. І існуюць таксама самастойныя ўпраўленні са сваімі вытворчымі падраздзяленнямі.

У нас працуе паўтары тысячы чалавек. Калектыў падзелены на буйныя структурныя падраздзяленні, якія называем вытворчасцямі. Яны не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, гэта значыць, не маюць гаспадарчай самастойнасці, банкаўскага рахунку, усе фінансы канцэнтруюцца ў адных руках і размяркоўваюцца з улікам патрэб структурных падраздзяленняў. Але яны з'яўляюцца гасразліковымі, і ўсё, што зарабілі, належыць ім.

Вядучыя — гэта лінейныя падраздзяленні. Не магу сказаць, што нехта з іх больш важны, нехта менш. Усе працуюць на канечны вынік, а таму важныя і патрэбныя. Проста назаву іх. Вытворчасць № 1 займаецца вырабам металаканструкцый — гэта завод у заводзе. Мы ў год манціруем каля трох тысяч тон металаканструкцый. 80 працэнтаў іх вырабляецца менавіта на нашай вытворчасці № 1. Тут таксама робім узбуйненыя трубныя нарыхтоўкі, што потым значна паскарае мантаж.

Вытворчасць № 2 — чыста будаўнічая, яна нарадзілася з тых першых брыгад, якія прыйшлі да нас у 90-2000-я гады. Сёння яна займаецца нулявымі цыкламі, аддзелачнымі работамі, будаўніцтвам на вёсцы, а ў апошні час — і ўзвядзеннем жылля ў горадзе.

Далей — вытворчасць № 5, якая мае тры мантажныя ўчасткі. Пасля таго як будаўнікі пайшлі, яны займаюцца мантажом

Магутнай шротамётнай машынай кіруе аператар Аляксей СУХАЎ.

— Такім пераносным прыстасаваннем можна праводзіць сціласкапіраванне металу ў самых цяжкадаступных месцах, — зазначыў намеснік начальніка зварачнай лабараторыі Анатоль ЦІМАШЭНКА.

Прыбор для вымярэння трываласці бетону метадам ударнага імпульсу.

— Невыпадкова кажуць, што будаўнічая галіна з'яўляецца лакаматывам выхаду з любога крызісу. Не паверыце, але для нас 2009 год склаўся паспяхова, па ўсіх паказчыках. Мы выканалі заданне па аб'ёмах на 115 працэнтаў — у параўнанні з папярэднім. Выканалі заданне па росце прадукцыйнасці працы, рэнтабельнасць склала 10 працэнтаў. Адзінае, што здараліся затрымкі з разлікамі за выкананыя работы з боку заказчыкаў, бо ў іх не было збыту прадукцыі, а значыць, не хапала грашовай масы. Заказчыкам даводзілася крэдытавацца, нам — таксама, каб перачакаць складаны перыяд, але ў рэшце рэшт мы заўсёды знаходзілі і знаходзім агульную мову.

***— А як складваецца гэты год?***

— Таксама дастаткова ўдала. У нас было тры асноўныя накірункі. Першы — рэканструкцыя «Нафтана», «Паліміра» і новыя магутнасці на ААТ «Шкловалакно». Па рэканструкцыі «Нафтана» была праграма, разлічаная на 2005—2010 гады, зараз яна плаўна перацякла ў праграму рэканструкцыі 2010—2015 года. Мы на працягу ўсіх гэтых пяцігодак з'яўляліся і чылі: калі сабраць усе нашы краны, яны адначасова могуць падняць груз вагою паўтары тысячы тон.

Я так падрабязна расказваю пра структуру, каб можна было зразумець нашы магчымасці. Яшчэ ёсць акрэдытаваная зварачная лабараторыя, якая правярае якасць зварных злучэнняў. Яна акрэдытавана па еўрапейскім сертыфікаце і, на мой погляд, — адна з найбольш моцных у рэспубліцы. Лабараторыя ўзброена абсталяваннем неразбуральнага і разбуральнага кантролю, каляровымі дэфектаскопамі, ультрагукавымі апаратамі, і ўвесь «парк» абсталявання камплектуецца плёнкай высокай распазнавальнай (адрозняльнай) здольнасці.

Так што структура, мы лічым, дастаткова гібкая і жыццяздольная. Калі ў лістападзе нас папрасілі тэрмінова зрабіць на «Нафтане» эстакаду для зліву казахскага мазуту, мы змаглі сабраць там каманду са 150 сваіх рабочых і спецыялістаў — прадстаўнікоў усіх вытворчасцяў (хоць у кожнага падраздзялення былі свае, і не менш тэрміновыя, аб'ёмы работ). І за дзесяць дзён узвялі эстакаду з усёй інфраструктурай. Асаблівасць менавіта гэтага мазуту ў тым, што ён застывае ўжо пры тэмпературы плюс 26 градусаў. І каб зліць, а потым дастаць яго, патрэбна разаграваць, давесці да вадкага стану. Тым не менш на мінулым тыдні першы чыгуначны састаў з велікагрузных цыстэрнаў злілі. Прымяняем гэтую тактыку пастаянна: патрэбна канцэнтрацыя сіл на нейкіх аб'ектах — у нас ёсць такая магчымасць.

## Як спынілі «ўцечку мазгоў»

***— Ваша тэхнічная аснашчанасць і прафесійны ўзровень спецыялістаў дазваляюць працаваць паспяхова, без аглядкі на розныя крызісы?***

— У апошнія гады хапала ўсяго. Сам крызіс на нас не асабліва паўплываў, але пасля пуску ўстаноўкі гідракрэкінгу былі складаныя часы і ў нас. Яны заключаліся ў тым, што расійскі рынак пачаў прапаноўваць вельмі выгадныя ўмовы для кваліфікаваных мантажнікаў, а вы правільна сказалі — кваліфікацыя нашых мантажнікаў высокая. Іх вырасціць вельмі складана. Каб газазваршчык стаў асам сваёй справы, мог варыць сталі ўсіх марак, патрэбна мінімум дзесяць гадоў працы. І то не кожнаму гэта дадзена, зваршчыкам патрэбна нарадзіцца. І вось у нас пачалі пераманьваць такіх асаў. У 2006—2007 гадах многія нашы мантажнікі, зваршчыкі ездзілі на заробкі да суседзяў, бо ў нас на той час зарплата была некалькі ніжэйшая.

Для нас няма нічога нязвыклага ў рабоце за мяжой. Яшчэ ў гады існавання вялікай дзяржавы нашы спецыялісты па камандзіроўках усесаюзнага трэста «Нафтазаводмантаж» працавалі на буйных аб'ектах на Кубе, у Манголіі і Нігерыі, на расійскіх аб'ектах — у Нарыльску, Валгаградзе, Яраслаўлі...Такая ў нас рамантычная прафесія — людзям гарады дарыць. Так што нашы людзі лёгкія на пад'ём, і, магчыма, сказалася такая прывычка.

Праўда, амаль усе і вярнуліся, і ўсё стабілізавалася. «За морам цялушка — палушка, ды руб перавоз». Зарплата ў нас зараз нармальная, у кастрычніку яна склала два мільёны дзвесце тысяч рублёў. І мы ўсё робім для таго, каб яна была не толькі нармальнай, але і выплачвалася своечасова. Гэта па-першае. Па-другое, тыя вандроўкі нас нечаму навучылі, і мы больш сталі працаваць з людзьмі, каб ведаць іх запатрабаванні і адэкватна рэагаваць.

***— Каб лепш зразумець, як вы працуеце сёлета, давайце азірнёмся на складаны для эканомікі краіны мінулы год.***

Галоўны бухгалтар Людміла САРОКІНА (у цэнтры) і яе калектыў.

з'яўляемся генпадрадчыкам «Нафтана». Дзякуючы спецыяльнаму распараджэнню Прэзідэнта ў яго было права аддаваць нам у работу аб'екты без конкурсу, на аснове перагавораў. Пасля гідракрэкінгу мы ўвялі тут таксама яшчэ шэраг установак: гэта і 2-я чарга ўстаноўкі па вытворчасці сернай кіслаты, і сур'ёзная рэканструкцыя падземных рэзервуарных паркаў, а таксама рэкаструкцыя галаўной установкі первічнай перапрацоўкі АВТ-6. Зараз ідзе да фінішу ўзвядзенне вакуумнага блока візбрэкінг-тэрмакрэкінг.

Уласная вытворчая база.

На ААТ «Шкловалакно» новабудоўляй стала печ № 9. Яна ўжо выведзена на праектную магутнасць.

Працуем і на іншых аб'ектах народнай гаспадаркі. Зараз у Круляўшчызне па заказе «Віцебскаблгаза» ўзводзім вытворчы будынак пад лінію па кіпаванні торфабрыкетаў. У Верхнядзвінску будуем новы цэх па выпрацоўцы кампанентаў дзіцячага харчавання. У Браслаўскім, Лепельскім і Ушацкім раёнах пабудавалі некалькі жывёлагадоўчых фермаў на вёсцы. У нас не бывае другарадных аб'ектаў і другарадных заказчыкаў — слова «Заказчык» заўсёды пішам з вялікай літары.

Працавалі ў Расіі — там пастаянна былі заняты ад 50 да 70 чалавек. Напрыклад, у Ніжнім Ноўгарадзе на «Сібурнафтахіме» выконвалі замену «начыння» калон. У нас створаны структуры, якія арганізуюць гэтую работу пад кіраўніцтвам намесніка генеральнага дырэктара па знешнеэканамічнай дзейнасці.

Такой была вытворчая праграма адыходзячага года.

Мы ўжо выканалі фактычна ўсе даведзеныя на год прагнозныя паказчыкі. Па росце аб'ёмаў выходзім на 113 працэнтаў — гэта вынік дзесяці месяцаў. Усе іншыя даведзеныя параметры таксама выконваем. Прадукцыйнасць працы — 111 працэнтаў.

Зараз са сваімі заказчыкамі адпрацоўваем праграму наступнага года — удакладняем аб'екты, аб'ёмы, тэрміны, наяўнасць праектнай дакументацыі і г.д.

Узмоцнена вядзём і перагаворы з Туркменіяй. На нафтаперапрацоўчым заводзе ў горадзе Туркменбашы нам прапанавалі два аб'екты — прычым па рэкамендацыі нашых еўрапейскіх партнёраў, вытворцаў тэхналагічнага абсталявання, з якімі мы паспяхова супрацоўнічалі ў Беларусі. І яны нас рэкамендуюць расійскім заказчыкам, а зараз — туркменскім. Дагавор па мантажы абсталявання заключаны ў Туапсэ, дзе вядзецца рэканструкцыя завода, — там аб'ёмы работ пяройдуць і на наступны год. Узводзіцца вельмі сур'ёзная ўстаноўка (у СНД такой пакуль няма — АВТ-12), якая будзе перапрацоўваць 12 мільёнаў тон за год.

Засталіся дзелавыя сувязі ў Ніжнекамску, дзе будуецца новы нафтаперапрацоўчы завод, пасяджэнні штаба на якім праводзіць асабіста прэзідэнт Татарстана. Так што нармальныя аб'ёмы павінны быць і на наступны год. Безумоўна, прыярытэт будзе аддавацца айчынным заказам, для чаго мы і створаны.

***— Ці ўдаецца своечасова ўводзіць аб'екты?***

— У асноўным, удаецца. Мы такую задачу перад сабой ставім і спраўляемся з ёй. Нам няма сэнсу расцягваць работу (існае такое паняцце — «берагчы работу»), бо яна становіцца стратнай. А ўслед за гэтай сваёй чаргі чакае іншая. У тых рэдкіх выпадках, калі не ўдавалася, то толькі па той прычыне, што ў заказчыкаў у сувязі з сусветным крызісам існуюць праблемы са своечасовай закупкай абсталявання за мяжой. Альбо здарылася затрымка з праектнымі рашэннямі. За апошнія пяць гадоў ніхто з беларускіх ці расійскіх заказчыкаў не выставіў нам нейкіх прэтэнзій па тэрмінах выканання работ.

***— У вас перад заказчыкам ёсць і такое абавязацельства, як гарантыйнае абслугоўванне?***

— Абсалютна правільна: два гады. Толькі згодна з заканадаўствам яно называецца не «абслугоўванне», а «гарантыйны тэрмін» — і на прамысловыя аб'екты, і на жыллё. Стараемся, каб выяўленых неадпаведнасцяў было як мага менш, а яшчэ лепш — не было зусім. І каб заказчык цалкам апраўдана мог паставіць нам высокую адзнаку. Укаранілі ў сябе сістэму менеджменту якасці на аснове міжнародных стандартаў ІСО 9001. Што яна дае? Там усё распісана — што, каму і як патрэбна рабіць. Толькі рабі. Мы сертыфікавалі сваю сістэму, а два тыдні таму паспяхова прайшлі перасертыфікацыю. Сістэма гэтая — жывы арганізм, і пастаянна патрэбна ўдасканальваць яе ўслед за тымі ці іншымі зменамі ў заканадаўчай базе, у галіновым дакументаабароце.

Паспяховае функцыянаванне такой сістэмы вельмі важнае, бо калі ўлічыць спецыфіку нашай галіны, то становіцца зразумелым, што любых памылак у рабоце, нават зусім дробных, лепш пазбегнуць. Мы працуем на выбухованебяспечных аб'ектах, і таму права на памылку сваім рабочым і спецыялістам не пакідаем. Закон такі: перш чым здаць выкананую работу — праверыць і пераправерыць, і быць упэўненым у тым, што ўсё зроблена як трэба. Ад гэтага залежаць і жыццё людзей, і эфектыўная работа нафтаперапрацоўчых і хімічных гігантаў, іншых прадпрыемстваў, ды і наш імідж.

Аператар машыннай рэзкі газаплазменным спосабам Дзяніс ЛЯДАК.

## Кузня ўнікальных кадраў

***— Вам патрэбны сапраўды ўнікальныя кадры, дзе вы іх бераце?***

— Набіраем штогод прыкладна 40 выпускнікоў базавага каледжа (бо аб'ёмы работ павялічваюцца і патрэбен прыток новых сіл) і працягваем іх падрыхтоўку непасрэдна на рабочых месцах, пад «крылом» вопытных рабочых і пад кантролем лінейных спецыялістаў. Існуе практыка мэтавага накіравання юнакоў у каледж, праз папярэдні адбор, падчас якога перавагу аддаём дзецям нашых работнікаў. Такім чынам вырасцілі не адну працоўную дынастыю, якія цэментуюць калектыў.

Дынастый сапраўды многа, і гэта азначае толькі адно: людзям падабаецца праца ў калектыве, і яны прыводзяць з сабой братоў, сыноў. Самай вялікай была дынастыя Варонінespecially. Яе галавой з'яўляўся вельмі паважаны ўсімі чалавек — старшыня прафсаюзнага камітэта. У нас працавалі два яго сыны, дзве дачкі, а зараз ужо пайшлі і ўнукі... Ёсць дынастыя Шчадровых — яе, будзем так казаць, заснавальнік працуе намеснікам галоўнага інжынера. Сярод рабочых склалася за апошнія пяць гадоў так, што многія працуюць парамі: бацька — сын, альбо нават бацька, сын і ўнук. І развіта настаўніцтва, без чаго пра сур'ёзную падрыхтоўку кадраў гаварыць не даводзіцца.

Інжынерны персанал фарміруем з выпускнікоў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама Беларуска-расійскага ўніверсітэта ў Магілёве. Дзейнічае ўласны вучэбны пункт, падрыхтоўку ў якім заваршае даволі строгі экзамен.

***— З чым вы звязваеце перспектывы свайго калектыву?***

— Перш за ўсё з далейшай рэканструкцыяй нашага галоўнага заказчыка — ААТ «Нафтан». Згодна з праграмай, прынятай на 2010 — 2015 гады, тут патрэбна асвоіць каля аднаго мільярда долараў. Мы бачым і сваё месца ў гэтай праграме.

## Не саромеемся дзякаваць людзям за працу

***— Аб чым бы мы з вамі ні гутарылі, Аляксандр Пятровіч, мы ўсё роўна гаворым пра вашых людзей, прама ці ўскосна — пра калектыў. Вы можаце сказаць, што задаволены сваім калектывам? Што ён здольны выканаць любыя складаныя задачы...***

— Я магу гэта сказаць са стапрацэнтнай упэўненасцю. Нам удалося захаваць лепшыя традыцыі, пастаянна іх развіваць. Што такое карпаратыўны дух, пра які я ўпамінаў? Перш за ўсё гэта моцнае адчуванне пляча. Настолькі моцнае, што калі тыя нашы таварышы, якія ад'язджалі ў Расію на заробкі, у рэшце рэшт вярнуліся ў Беларусь, то працаваць яны прыйшлі не куды-небудзь у іншае месца, а да нас. І хоць я перад гэтым казаў ім, што нікога не прыму назад, прыняў усіх. Бо яны — сапраўды ўнікальныя спецыялісты, якія выраслі на вачах. А па-другое, з майго боку гэта таксама было, відаць, праяўленнем карпаратыўнага духу, і я нічога не змог з сабою зрабіць (Аляксандр Пятровіч неяк шчыра, адкрыта ўсміхаецца). Так што з гэтым калектывам — на любую вышыню і ў любыя «медныя» трубы, у прамым сэнсе слова. Нашым людзям уласцівая нават нейкая свая манера паводзін, уласцівая тая інтэлігентнасць, якая адрознівае іх на любым буйным аб'екце, дзе заўсёды шмат будаўнічага народу.

У нас вельмі яскрава выражаная сацыяльная накіраванасць калектыўнага дагавора. Але калі не мець прыбытку, калектыўны дагавор выканаць нельга. Гэта таксама прыдае жадання працаваць вынікова, што мы імкнёмся ўсялякім чынам стымуляваць. Два разы на год — па выніках шасці і дванаццаці месяцаў — называем лепшых па прафесіі. Вызначаем лепшага мантажніка, лепшага зваршчыка, лепшага інжынерна-тэхнічнага работніка і гэтак далей. А таксама лепшую брыгаду і лепшую вытворчасць. Пераможцы аглядуконкурсу атрымліваюць грашовае заахвочванне. У складаныя гады, калі не было грошай, рабочыя самі прапанавалі, каб напярэдадні Дня будаўніка і пад Новы год мы адзначалі лепшых граматамі і падзячнымі пісьмамі, якія, дарэчы, цудоўна сустракаліся ў сем'ях. Гэтая традыцыя засталася і сёння.

І ўсяму калектыву было прыемна, калі наш брыгадзір Мікалай Мікалаевіч Ананчанка нядаўна атрымаў падзяку з рук Прэзідэнта.

А яшчэ пераможцы атрымліваюць права на бясплатную турыстычную паездку: па выніках паўгоддзя — па Беларусі, а за год — у бліжняе замежжа. Сёлета ездзілі ў Нясвіж і Санкт-Пецярбург. Шчыра кажучы, не думаў, што так спадабаецца людзям. Нядаўна моладзь ездзіла па месцах партызанскіх баёў у Расонскі раён. Здавалася б, што моладзі да тых далёкіх дзён? Аднак жа паехалі дружна, людзей назбіралася на цэлы аўтобус, і потым так многа і з такім захапленнем расказвалі пра гэтую паездку! І я яшчэ больш стаў паважаць нашу моладзь.

Адсюль, ад гэтай старанасці і майстравітасці, і дастаткова высокія заробкі, і выплаты так званай «трынаццатай» зарплаты, і магчымасць узяць банкаўскі крэдыт на будаўніцтва жылля. Мы дапамагаем пазыкамі на будаўніцтва жылля, каб аплаціць праектна-каштарысную дакументацыю, першапачатковы ўзнос альбо «лішнія» квадратныя метры, калі такія знойдуцца. За апошнія чатыры гады ўзвялі два жыллёвыя кааператывы для сваіх работнікаў. Плюс будуем для сябе металічны каркасны дом і з калегамі з яшчэ адной будаўнічай арганізацыі фарміруем новы жыллёвы кааператыў. А калі ў чалавека ёсць дах над галавой, ён адчувае сябе гаспадаром, працаўніком...

Гэта тым больш важна, што праца будаўніка, асабліва мантажніка, — безумоўна, ганаровая, але складаная, адказная і нават цяжкая, скажам прама. Клапоцімся пра здароўе членаў калектыву яшчэ і такім чынам, што ўтрымліваем сваю турыстычную базу, дзе людзі могуць адпачыць — практычна круглы год. Выконваем яе рэканструкцыю, узводзім новыя домікі. Частку ўжо пабудавалі, у наступным годзе будзем працягваць — пастараемся зрабіць сапраўды прывабны куток.

Паводле калектыўнага дагавора, вяртаем сваім супрацоўнікам іх расходы на пратэзаванне зубоў, на аперацыі па аднаўленні зроку. Усім членам калектыву кампенсуем да 50 працэнтаў кошту пуцёвак у беларускія здраўніцы.

Стараемся сварацца належныя ўмовы для працы на аб'ектах. Самі ўзводзім бытоўкі — распрацавалі нават і зацвердзілі тыпавы праект. Камплектуем іх мікрахвалевымі печкамі, чайнікамі. Калі на аб'екце работы вядуцца масава і збіраецца цэлы гарадок з бытовак, ставім цёплыя санвузлы і пакоі, дзе можна памыцца. Безумоўна, у гэтым накірунку патрэбна працаваць далей, што мы і будзем рабіць.

***— Як пасля напружанага працоўнага тыдня расслабляецеся асабіста вы? Рыбалка, паляванне?***

— У асноўным «расслабляюся» дома — двум малодшым сынам, а яны двайняткі, няма яшчэ і трох гадоў. Старэйшы сын — школьнік. Дзеці даюць вельмі моцны зарад энергіі. А калі ўдаецца падтрымаць кампанію сябрам, то тады — зімовая рыбалка. У Полацкім і суседнім Ушацкім раёнах больш за тысячу азёраў — выбірай любое! І ў нас на заводзе склалася цэлая «каста» аматараў падлёднага лову. Летам для гэтага ні ў мяне, ні ў намесніка няма часу. Ну, і зрэдку чыста мужчынскі занятак — паляванне.

Пры мантажы ўлічваецца хуткасць паветранага патоку. Прыстасаванне для такіх вымярэнняў дэманструе намеснік галоўнага інжынера па якасці Мікалай ЯРОМІЧ.

Намеснік генеральнага дырэктара па агульных пытаннях і ідэалагічнай рабоце Канстанцін КАРАЛЁЎ і майстар будаўніча-мантажных работ Сяргей КЛІМАЎ на пляцоўцы, дзе ўзводзіцца энергазберагальны дом.

Гэтае хобі мае і практычны працяг. Сёлета правялі спартакіяду генеральнага дырэктара, дзе вытворчасці выстаўлялі свае каманды, а генеральны дырэктар — сваю. Уваходзілі чатыры віды: зімовая рыбалка, летняя рыбалка, валейбол і більярд.

Вы пытаецеся, як мы будзем святкаваць Новы год? У нас традыцыя: 31 снежня збіраем калектыў, віншуем усіх, гаворым адно аднаму добрыя словы, а потым разыходзімся па дамах, бо гэта — сямейнае свята.

А сёння я карыстаюся выпадкам, каб праз старэйшую беларускую газету, афіцыйны орган парламента і ўрада, загадзя павіншаваць усіх дзелавых партнёраў, а таксама ўласны калектыў з надыходзячым Новым годам і пажадаць поспехаў, міру, здароўя, дабрабыту ў кожны дом. Не толькі ў тыя дамы і кватэры, што ўзведзены намі, а ва ўсе — у вёсках і гарадах, у вялікіх і маленькіх пасёлках. Шчасця вам, землякі! З Новым 2011-м годам!

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Віктар ПАЗНЯКОЎ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 300041470.

Няштатная сітуацыя

# «Прашу справядлівасці!»

**У «Звязду» звярнулася з лістом падпісчыца Алена Іванаўна Карпава з вёскі Кудзін Бялыніцкага раёна. Яна просіць дапамогі ў мясцовых уладаў і ў Камітэце дзяржкантролю.**

**Алена Іванаўна, інвалід па зроку, хвалюецца за мужа Мікалая Іларыёнавіча Карпава,** які працаваў пастухом у СВК «Кудзін» на ферме ў вёсцы Малы Трылесін. Менавіта працаваў — у мінулым часе, таму што пакуль ліст пісаўся і дасылаўся, мужа з працы звольнілі — па артыкуле за п'янства.

Карпава пры гэтым зусім не хавае, што муж выпівае. Больш за тое, яна не аспрэчвае яго звальненне з працы і нават не хоча, каб ён вяртаўся ў гаспадарку. Аднак, разам з тым, скаржніца настойвае на тым, што канфлікт на гэтым далёка не вычарпаны.

Пытанні Алены Іванаўны, выкладзеныя на сямі старонках, датычацца аплаты працы мужа. Сялянка ўпэўненая, што мужу на працы недаплачвалі грошы і незаконна пазбаўлялі часткі заробку. Да падрабязнага тлумачэння прыкладзены копіі дакументаў, і ўсё гэта разам павінна стаць прадметам карпатлівага разбору спецыялістаў па заработнай плаце. Рэдакцыя ж імкнулася разабрацца, як здарыўся канфлікт з кіраўніком сельскай гаспадаркі «Кудзін» і чаму немагчыма знайсці кампраміс без удзелу ўладаў, кантралёраў і журналістаў.

— Мы пайшлі ў праўленне з суседкай наконт заробку мужоў, знайшлі разыходжанні і сталі задаваць пытанні, — расказвае Алена Іванаўна пры сустрэчы ў Кудзіне. — Потым я ўважліва перачытала Працоўны кодэкс і ўбачыла, што нічога ў нас па законе не робіцца. Але мне ў канторы адказваюць: «У нашага старшыні свае законы».

Яна так і не знайшла паразумення ў праўленні гаспадаркі па налічэнні заробку мужа, а таму стала звяртацца вышэй.

— Я хачу, каб усё было законна. Калі ён 12 гадзін працаваў, то чаму яму пішуць 7? Ён за ўсё лета не меў ніводнага выхаднога дня. Летась у водпуску не быў. Працоўнага дагавора з ім не заключалі. Яны, кіраўнікі, патрабуюць і жорстка вылічваюць за парушэнні, а з іх саміх ніхто не запатрабуе. Чаму? Хачу, каб разлічылі яго заробак па справядлівасці і вярнулі грошы.

**У старшыні СВК «Кудзін» Адама Сачыловіча** — свая пазіцыя ў дачыненні да Мікалая Карпава ў прыватнасці і п'яніц увогуле.

— Як можна трымаць работніка, які злоўжывае спіртнымі напоямі і сістэматычна не выходзіць на працу, і ад гэтага жывёла часта застаецца галоднай? Гэта было ўжо не першы раз, і за гэта мы Карпава звольнілі. Можна не заўважыць аднойчы і двойчы, але ў выніку пакутуюць усе астатнія. Ад такога недысцыплінаванага работніка ніякай карысці, толькі шкода гаспадарцы. Так што іншага выйсця, акрамя звальнення, у мяне не было.

Прадстаўнікі мясцовай улады, якія ўжо спрабавалі разабрацца са скаргай Карпавай, гаварыць, што нібыта з аплатай працы «ёсць пэўныя пытанні». Праўда, афіцыйнага заключэння на гэты конт няма. Не адмаўляецца нешта паправіць, калі на гэта ўкажуць кампетэнтныя спецыялісты, і сам Адам Сачыловіч.

— Верагодна, мы недзе і недапрацавалі, — прызнае старшыня. — Магчыма, не зусім згодна заканадаўству зрабілі і пакаралі. Калі вінаватыя — паправім. Але з пункту гледжання кіраўніка, чалавека і гаспадарніка, я маю рацыю на 100%, што перапыніў з Карпавым працоўныя дачыненні. Так цягнуцца болей не магло.

**Абодва бакі,** здаецца, ужо не саромеюцца ў выказваннях, нават пры ўключаным дыктафоне. У такіх, прама скажам, непрыязных стасунках наўрад ці магчымы кампраміс, які б усіх задаволіў і супакоіў.

Алена Іванаўна кажа, што яе моцна пакрыўдзіла стаўленне старшыні СВК да простага чалавека.

— Ён мяне проста выставіў, — расказвае яна са слязамі. — Адкрыў дзверы і сказаў: «Выйдзі адсюль, ты тут ніхто, а я як лічу патрэбным, так і буду плаціць». Яны там нічога не хочуць слухаць. Рот закрываюць. Ні з кім не размаўляюць нармальным чынам. Што хочуць, тое і робяць.

— Я пачуў у канторы крык: гэта Карпава, якая нават не працуе ў гаспадарцы, нарабіла шуму, — даводзіць Адам Пятровіч сваю версію здарэння. — І я сапраўды яе выдварыў. Адчыніў дзверы і сказаў, каб сыходзіла і не перашкаджала людзям працаваць. Я разумею, што, можа, у нечым я і не меў на гэта права. Але калі ўсе 310 чалавек прыйдуць сюды і будуць крычаць, то хто будзе рабіць? А мне трэба даваць краіне малако і мяса, выконваць паказчыкі.

У праўленні СВК «Кудзін» ужо адбыўся адзін разбор з удзелам зацікаўленых бакоў і спецыялістаў з Бялыніцкага райвыканкама, які, аднак, не даў палёгкі ў справе.

— Мяне крыўдзіць, што яны паступаюць без закона, — цвердзіць Алена Іванаўна. — Налічылі мужу заробак няправільна, а ўжо пасля таго, як я стала дамагацца праўды, яго штомесяц незаконна пазбаўлялі грошай. Так, ён выпіваў, але як гэта можа быць, што заробак — 400 тысяч рублёў, а палову з яго вылічваюць? Ці гэта гарантаваны дзяржавай мінімум?

Старшыня завочна адказвае:

— Я не буду трымаць работнікаў, якія не хочуць працаваць. Яны ствараюць склоку. Я лічу, што павінна быць дысцыпліна. За 7 гадоў маёй працы ў «Кудзіне» ўпершыню такая скарга.

Адам Сачыловіч назваў толькі адно выйсце з гэтай патавай сітуацыі — так бы мовіць, яўку з павіннай.

— Я б на іх месцы прыйшоў і сказаў: маўляў, прабачце, я болей не буду парушаць дысцыпліну. А так, безумоўна, я лічу, што маю рацыю і дзейнічаў якраз згодна з заканадаўствам. Тут ёсць сістэма штодзённага злоўжывання спіртнымі напоямі. Які ж я кіраўнік, калі да мяне кожны будзе такім чынам ставіцца?

Шчыра кажучы, найбольшыя перасцярогі былі наконт таго, **як будзе далей існаваць сялянская сям'я Карпавых.** Мужык у 49 гадоў страціў працу і заробак, а 46-гадовая жонка мае толькі пенсію па інваліднасці. Як пражыць? Аказалася, што самі Карпавы пра гэта не хвалююцца. Яны маюць добры дом з абстаноўкай і бытавой тэхнікай. Працуе дачка, ёсць падсобная гаспадарка — карова і свінні. Бульбы здалі на мільён рублёў, штолета маюць ад продажу малака дзяржаве некалькі мільёнаў рублёў. Таму Алена Іванаўна і кажа: «Жыць будзем, праца знойдзецца, нам хопіць». Муж згодна ківае галавой.

А вось сваю барацьбу за справядлівасць Карпава не збіраецца перапыняць: «Няхай паводле закона грошы налічаць і вернуць». Прычым яна нават не ўяўляе сабе, пра якую суму грошай можа ісці гаворка. Можа, і пра вельмі нязначную. Але для яе, настойвае жанчына, галоўнае — не грашовыя знакі, а справядлівасць.

Да Алены Іванаўны далучыліся ў працэсе гутаркі яшчэ дзве жанчыны, якія маюць свае прэтэнзіі да кіраўніцтва гаспадаркі. Сваю інфармацыю яны хочуць давесці **да спецыялістаў Камітэта дзяржкантролю,** і таму невыпадкова Карпава звярнулася на «прамую лінію» да старшыні КДК Зянона Ломаця. Цяпер скарга з Кудзіна знаходзіцца на кантролі ў супрацоўніка Камітэта дзяржкантролю Магілёўскай вобласці, а ўважліва разбірацца па яе сутнасці будуць раённыя ўлады.

— Калі і тут не дапамогуць, то напішу далей, **у Міністэрства працы і сацыяльнай абароны,** — абяцае Алена Карпава. — Не адступлюся, хоць і не хацела пачынаць усё гэта. Мы ж ходзім на выбары, галасуем за дэпутатаў, а яны потым законы пішуць. Дык для каго ж гэтыя законы напісаны?

**Ілона ІВАНОВА.**

*Бялыніцкі раён.*

# ЯК АПРАНУЦЦА З ГАЛІВУДСКІМ РАЗМАХАМ НА НАШУ ЗАРПЛАТУ?

Прымерка на сябе

**Ці проста жанчыне купіць зімовыя боты за 600 тысяч, калі яна зарабляе мільён? Задачка для алімпіяднікаў. З дзелавой і стылёвай мужчынскай вопраткай — тое самае. А вось у некаторых краінах Еўрасаюза, калі трапіш на сезонныя распродажы, — то апранешся як тэлезорка, нават за беларускую зарплату.**
**Журналіст «Звязды» правёў сваё нерэкламнае спажывецкае даследаванне: куды ехаць, каб не прамахнуцца з выгадным шопінгам?**

## ДА ЕЎРАПЕЙСКІХ БРЭНДАЎ — 30 КІЛАМЕТРАЎ АД БЕЛАРУСКАЙ МЯЖЫ

Як вядома, самы кароткі шлях «з беларусаў у еўрапейскія гандлёвыя цэнтры» — гэта Вільня. 169 кіламетраў ад Мінска, 100 км ад Ліды, 30 км ад мяжы з нашай краінай.

А ў Вільні — як мінімум тры буйныя гіпермаркеты — «Акропаліс», «Озас» і «Панарама». Сотні фірмовых крамаў. Вось чаму шопінг у гэтым горадзе такі папулярны сярод беларусаў.

Адзіная перашкода на сёння — шэнгенская віза, якую звычайнаму смяротнаму не так проста атрымаць. Але нават калі зрабіць візу праз турыстычную фірму і трапіць на распродажы, то 80 еўра, выдаткаваныя за гэта (60 еўра — кошт візы, 20 еўра — за аказанне паслугі), могуць у разы акупіцца.

Па службовых справах трапіў у Вільню ў пачатку снежня гэтага года. Па логіцы ўжо павінны былі пачацца грандыёзныя распродажы. Але паблукаўшы па адным з гандлёвых цэнтраў, быў здзіўлены адносна невялікім выбарам рэчаў і стандартным коштам. Калі на жаночыя рэчы дзе-нідзе зрабілі ўцэнку, то на мужчынскія кошты стаялі непарушным слупом.

*— І што гэта за сюрпрызы такія, чаму няма зніжак? — пытаюся па-руску ў юнай прадавачкі Аліны.*

— У гэтым годзе ўцэнкі пачынаюцца пазней. Кажуць, што будзе нейкія два дні з татальнымі распродажамі, але калі яны будуць, сказаць не магу. Шчыра кажучы, нават многія літоўцы выпраўляюцца на шопінг у іншыя краіны. Там большы выбар, больш уцэнак. А ў нас невялікая краіна, менш фірмовых крамаў.

Тым не менш — выбраць ёсць з чаго, асабліва жанчынам. Так, адна знаёмая студэнтка (сама беларуска, а навучаецца ў Вільні) пахвалілася, што набыла шыкоўныя зімовыя боцікі ўсяго за 100 літаў (каля 120 тысяч беларускіх рублёў).

— А ў Беларусі такія танней, чым за 500-600 тысяч, не знойдзеш, — запэўніла модніца.

Перавагай літоўскага шопінгу можна назваць тое, што ў Вільні цудоўна развіты турызм, невераторая прыгожы стары горад, шмат месцаў, звязаных з Беларуссю. Напрыклад, можна паглядзець на будынак, дзе выходзіла газета «Наша Ніва», на вязніцу, дзе перад смерцю трымалі Каліноўскага, на легендарны касцёл Святой Ганны, будынак Віленскага ўніверсітэта і гэтак далей...

Пераночыць у хостэле можна за 15 долараў на чалавека.

Шчыра кажучы, я нічога звышэксклюзіўнага і таннага з Вільні не прывёз. Апроч падарункаў дзецям, цукерак і сувеніраў. Але неразбэшчаны замежным шопінгам чалавек хутчэй за ўсё знойдзе для сябе нямала.

## ТАННЫ ШОПІНГ У СТАЛІЦАХ МОДЫ МОЖА ПРАВАЛІЦЦА

Трэба сказаць, што сезоны зніжак дораць многім аматарам шопінгу неверагодныя бонусы.

Вядомы беларускі бас-гітарыст Ціхан Золатаў на працягу года збірае грошы, а ўлетку ездзіць з жонкай у тур па Еўропе.

**ЯК НЕ ПРАМАХНУЦЦА З РАСПРОДАЖАМ?**

**У большасці краін Еўрасаюза калядныя распродажы пачынаюцца незадоўга да 25 снежня, перад Божым Нараджэннем. Гэты час называюць самым удалым для шопінгу. Ёсць вялікі выбар і зімовай і асенне-вясенняй вопраткі. Скончаюцца распродажы ў канцы студзеня. Зніжкі дасягаюць 80%. Але і ў лютым уцэнкі на многія зімовыя рэчы здараюцца.**
**Летнія ж распродажы пачынаюцца з канца чэрвеня—пачатку ліпеня і цягнуцца каля месяца. Уцэнкі робяць як на летнюю, так і на вясеннюю вопратку.**
**Цікава, што ў многіх краінах Еўрасаюза тэрміны сезону зніжак рэгулююцца заканадаўствам.**

—У Барселоне якраз трапілі на распродажы. Кашулі «Бенетон», якія спачатку каштавалі 40 еўра, бралі па тры еўра за адзінку, — хваліўся мне аднойчы Ціхан. — Набралі з жонкай абутку, штаноў, спадніц. Закупіліся — на цэлы год, зэканомілі шмат грошай.

Я трапіў у Барселону ў пачатку восені гэтага года. І, узгадаўшы пра словы Ціхана, першай справай пайшоў гуляць па вулачках у раёне станцыі метро «Каталонія». Гэты раён называюць раем для аматараў шопінгу.

— Яшчэ схадзі да старога порта, паглядзі на помнік Калумбу, на яхты, на афрыканскіх гандляроў, — вучыла мяне барселонская студэнтка Асмік, ураджэнка Арменіі. — Так дойдзеш да гандлёвага цэнтра «Марэмагнум», там шмат моладзевых марак па прымальным кошце.

Але нічога па зніжках для сябе, на жаль, не знайшоў. Месцамі кошт быў прымальным. Але за такія грошы, і нават танней я ў любы час закуплюся ў той жа Вільні.

Так барселонскі шопінг праваліўся. Далей я цягам тыдня аглядаў райскай прыгажосці архітэктуру, блукаў па арыгінальных каталонскіх вулачках, слухаў оперных спевакоў у Гатычным квартале ды купаўся ў моры.

Дарэчы, калі вам захочацца сумясціць культурную праграму з шопінгам у сезон зніжак, то Барселона — найлепшае для гэтага месца. Пры жаданні даляцець сюды з Каўнаса магчыма за 150 еўра ў абодва бакі (600 тысяч беларускіх рублёў), пражыванне каштуе 15 еўра за суткі (60 тысяч), а харчавацца можна не даражэй, чым у Мінску.

Шопінг у Нямеччыне, Францыі і Італіі, скажу шчыра, не здзівіў мяне таннасцю. Гэта істотна даражэй, чым у той жа Вільні. Праўда, краіны гэтыя я наведваў далёка не ў сезон зніжак.

Дык куды ехаць, каб гарантавана і паспяхова схадзіць на большменш танны шопінг? Журналіст «Звязды» знайшоў адказ на пытанне.

## ШОПІНГ У ПОЛЬШЧЫ. ПРЫМАЛЬНЫЯ ЦЭНЫ, НАВАТ КАЛІ НЕ ПАТРАПІШ НА ЗНІЖКІ

Я неаднаразова чытаў як на беларускіх, так і на расійскіх форумах пра шопінг у польскім Беластоку. Прыпынімся. Горад знаходзіцца ўсяго за 50 км ад беларускай мяжы, а цэны на вядомыя брэнды — адны з самых нізкіх у Еўрасаюзе. У горадзе як мінімум два буйныя гандлёвыя цэнтры — «Панарама» і «Альфа». Выглядаюць гэтак жа, як цэнтры ў Барселоне, Нюрнбергу ці Парыжы. Цэны ж прыемна адрозніваюцца. У пачатку снежня пасадзіў у машыну дваіх знаёмых (яны ўдала вырашылі візавыя пытанні) і ўзяў курс на Беласток.

За паўтара сутак наездзілі 800 кіламетраў (41 280 беларускіх рублёў за паліва на чалавека). Страхоўку, так званую «Зялёную карту», разбілі на траіх (40 тысяч беларускіх рублёў на чалавека). У самім Беластоку з дапамогай інтэрнэта знайшлі недарагі хостэл, дзе пераначавалі (усяго за 25 тысяч беларускіх рублёў на чалавека). На харчаванне я асабіста аддаў 30 тысяч беларускіх рублёў. Такім чынам, вандроўка ў Беласток абышлася мне прыкладна ў 135 тысяч беларускіх рублёў.

На жаль, у пачатку снежня татальныя калядныя распродажы яшчэ не пачаліся. Прадаўцы прайнфармавалі нас, што афіцыйна зніжкі пачынаюцца за тыдзень да каталіцкіх Калядаў — прыкладна 18 снежня. І доўжацца да канца студзеня.

Тым не менш, шопінг не быў сапсаваны.

*— Трасца, фірмовыя джынсы каштуюць амаль у чатыры разы танней, чым былі першапачаткова! — здзівіўся я ў адной з крамаў.*

На цэнніку быў пазначаны стары кошт (229 злотых, па сённяшнім курсе каля 230 тысяч беларускіх рублёў) і новы (59 злотых, каля 60 тысяч беларускіх рублёў). Прытым джынсы аказаліся фірменнымі, класічнымі. Так выкупіў сабе некалькі пар нагавіцаў, модны скураны абутак (150 тысяч рублёў за пару), фірменную майку з доўгімі рукавамі (25 тысяч беларускі рублёў).

Якія-ніякія зніжкі пачаліся ў крамах бытавой тэхнікі. Так, некалькі месяцаў таму ў Мінску я набыў сабе мабільны тэлефон за 70 долараў. Тут жа такі самы ляжаў па ўцэнцы за 30 долараў.

Пачаліся зніжкі і на дзіцячую вопратку. За цэны, удвая ніжэйшыя, чым былі першапачаткова, набыў падарункі (джынсавыя камбінезоны, пальчаткі, каптуркі, майкі) траім хрэснікам.

*— Цяпер выглядаем, як галівудскія тэлезоркі, — падсумавала мае шопінг-прыгоды васьмігадовая пляменніца Сафія, атрымаўшы падарункі.*

І сапраўды, купіўшы вопратку за мяжой, мне ўдалося нямала зэканоміць.

Як аказалася, такія ж выгадныя ўмовы для шопінгу можна знайсці і ў іншых польскіх гарадах. Паўсюль ёсць прыстойныя гандлёвыя цэнтры.

Уяўляю сабе, якія цэны ўсталююць там у сезон зніжак.

Многія еўрапейскія брэнды ўжо прыйшлі і ў суседнія Кіеў з Масквой. Пачакаем і нас? Да святаў блізка-блізка...

**Яўген ВАЛОШЫН.**

## ДЗЕ ЗНІЖКІ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ КРУГЛЫ ГОД?

**У многіх краінах Еўрасаюза функцыянуюць так званыя дысконтныя раёны Chic Outlet Shopping. Тут круглы год са зніжкамі прадаецца адзенне сусветных брэндаў. Мне ўдалося наведаць такі раён у польскай сталіцы Варшаве (гандлёвы цэнтр Faktory). Там за адну гадзіну шопінгу я за 40 долараў набыў пінжак, які першапачаткова каштаваў 250. А за 35 долараў — скураныя красоўкі (першапачаткова каштавалі 120 долараў). Ля еўрапейскіх сталіц моды (такіх, як Барселона, Мілан, Дзюсельдорф, Парыж і гэтак далей) функцыянуюць так званыя «вёскі распродажаў». Набываць там лепш адзенне дарагіх марак.**
**Але пераважнай большасці простых беларусаў, якія жывуць на сціплую зарплату, такі шопінг можа бачыцца толькі ў снах.**

Цялежка з адзеннем, якое журналіст "Звязды" прыдбаў па зніжках.

## КОШТЫ НА АДНО І ТОЕ Ж АДЗЕННЕ АДРОЗНІВАЮЦЦА Ў РОЗНЫХ КРАІНАХ

**Маркі адзення ў гандлёвых цэнтрах розных еўрапейскіх дзяржаў збольшага аднолькавыя. Глабалізацыя. Скажам, такія канторы, як «Ньюёркер», «Зара», «Дуглас», «Мекс» і многія іншыя прысутнічаюць абсалютна ў любым буйным заходнееўрапейскім гандлёвым цэнтры. Толькі цэны на тавары адрозніваюцца. Вылічваюцца яны па нейкім дзіўным каэфіцыенце агульнага ўзроўню жыцця, трываласці валюты.**
**Але мне гэты каэфіцыент не заўсёды падаецца лагічным. Скажам, у Літве цэны на мужчынскае адзенне прыкладна на 10-15% большыя, чым у Польшчы. У Нямеччыне — на 15-20% вышэйшыя, чым у Літве. Аднак падчас сезонных зніжак набыць адзенне па сімвалічным кошце магчыма абсалютна паўсюль.**

Папулярны сярод моладзі барселонскі "Марэмагнум". Прыкладна гэтак жа выглядаюць гандлёвыя цэнтры па ўсім Еўрасаюзе.

Памяць

# 21 МАЯ 1863 ГОДА, ЛЯ ВЁСКІ КАДЫШ...

Непадалёк ад дарогі Сонічы — Кадыш у Гродзенскім раёне за два кіламетры ад Аўгустоўскага канала знаходзіцца магіла паўстанцаў з атрада Кастуся Каліноўскага. Яны загінулі 21 мая 1863 года ў баі ля вёскі Кадыш. У 1926 годзе на магіле была ўстаноўлена гранітная пліта з надпісам на польскай мове: «Байцам 1863 года». У 1990 годзе мясцовыя жыхары замянілі стары драўляны крыж, які захоўваецца ў Сапоцкінскім касцёле, на новы. Але потым ...

71-гадовы жыхар Гродна Сяргей Паўлавіч Зылькоў — чалавек энергічны. Стварыў малое прадпрыемства «Свідравіна», дзе побач з ім цяпер працуюць сыны Павел і Ігар. А яшчэ Сяргей Паўлавіч — вялікі энтузіяст, аматар гісторыі сваёй краіны. Аднойчы падчас паездкі ў грыбы ён убачыў ля дарогі павалены крыж і занядбаную магілу. Захацелася зрабіць тут парадак. Зылькова падтрымаў дырэктар прадпрыемства «Крыга» Юрась Мацко. Гэтая фірма вырабіла металічную агароджу, а спецыялісты «Свідравіны» зрабілі новы дубовы крыж, паклалі плітку, устанавілі яшчэ адну гранітную пліту з надпісам на беларускай мове: «Паўстанцам Каструся Каліноўскага. «За нашу і вашу волю!» У памяць ад нашчадкаў».

У Сяргея Паўлавіча Зылькова ёсць крылатая фраза: «Хто па мінулым стрэліць з пісталета, у таго ў будучым стрэляць з гарматы». А вось пра людзей, якія робяць светлыя, святыя справы, мяркую, можна сказаць, што нашчадкі ім з гэтай гарматы адсалютуюць.

**Беніямін ЕРУЗАЛІМ.**

# «Для вяскоўца дзённы стацыянар — выйсце. Але давайце вернем для пацыентаў бясплатнае забеспячэнне ўсім неабходным»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**Іосіф Браніслававіч Пілінко пражывае ў аграгарадку Гуды Лідскага раёна. На «гарачую лінію» газеты ён звярнуўся не столькі з мэтай проста атрымаць адказ на сваё пытанне — ён яго і без таго ведае, бо размаўляў на гэтую тэму і з мясцовымі ўрачамі, тэлефанаваў ва ўпраўленне аховы здароўя аблвыканкама і нават у Міністэрства аховы здароўя. Кажа, што вельмі хацеў давесці сутнасць праблемы да ўдзельнікаў Усебеларускага народнага сходу, але, на жаль, не змог дазваніцца. Таму Іосіф Браніслававіч папрасіў «Звязду» выступіць у якасці своеасаблівага рупара: каб данесці да чыноўнікаў, як ён упэўнены, не толькі ўласнае набалелае, а праблему вельмі многіх, найперш вясковых людзей. Гаворка ідзе пра пацыентаў дзённых стацыянараў, што павінны аплачваць лекі (і не толькі іх) за ўласныя сродкі.**

— Я — інвалід II групы, таму павінен часта бываць у бальніцы: каб прайсці планавыя медыцынскія агляд і лячэнне. Да 2008 года ўсё было добра. У бальніцы ўсё было бясплатным, у тым ліку і харчаванне, і ў дзённым стацыянары пры бальніцы таксама. А потым пацыентаў у аддзяленнях дзённага знаходжання перасталі забяспечваць бясплатнымі лекамі. Больш за тое, акрамя аплаты транспарту — гэта актуальна зноў жа найперш для вяскоўца, цяпер ты сам сябе павінен забяспечваць ці не ўсім патрэбным: і харчаваннем, і пасцельнай бялізнай з ручніком, і тымі ж лекамі, — расказваў Іосіф Браніслававіч.

Далей ён гаварыў, што вясковы чалавек — не гараджанін: у бальніцу проста так не ляжа. Чаму? Таму што часта і жывёлу якую на падворку трымае, ды і многія папросту, асабліва адзінокія, баяцца пакідаць хаты без нагляду. А дзённы стацыянар — гэта выйсце.

— Раніцай устану, жывёлу пакармлю і — на працэдуры. Потым дадому, — тлумачыў далей заяўнік. — Транспартныя выдаткі, вядома ж, б'юць па кішэні, але ўсё адно вяртацца трэба. А тут яшчэ і за ўсё астатняе трэба грошы аддаваць. Мясцовыя ўрачы кажуць, што варта было б вярнуцца да ранейшага бясплатнага забеспячэння пацыентаў дзённых стацыянараў, але самастойна нешта змяніць не маюць права. Задаваў гэтае пытанне і прадстаўнікам Міністэрства аховы здароўя. Тыя ў размове таксама не аспрэчвалі, што варта было б нешта змяніць. Толькі казалі, што гэта павінна быць па ініцыятыве знізу — ад нас, пацыентаў тых самых дзённых стацыянараў. Я ж упэўнены, што гэта многіх закранае. Таму і прашу «Звязду» выканаць просьбу — давесці афіцыйна да ведама міністэрства зварот вярнуць ранейшае бясплатнае забеспячэнне.

**P.S.** ***«Звязда» спадзяецца атрымаць адказ з Міністэрства аховы здароўя: ці плануюцца якія змены для насельніцтва, пра што гаварыў чытач, пры лячэнні ў аддзяленнях дзённага знаходжання?***

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПАЙШЛІ ПА ДЗІКА, А ЗНАЙШЛІ АРСЕНАЛ ЗБРОІ

**Позна ўвечары пры правядзенні прыродаахоўнага рэйду работнікамі аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі разам з работнікамі Аршанскай міжрайінспекцыі паблізу вёскі Раздольнае Талачынскага раёна былі знойдзены рэшткі тушы дзіка.**

Высветлілася, што мясцовы жыхар некалькі раней без дазвольных дакументаў і з выкарыстаннем незарэгістраванай паляўнічай стрэльбы здабыў дзіка. Мяса знайшлі. А побач — цэлы арсенал: тры незарэгістраваныя паляўнічыя стрэльбы з аптычнымі прыцэламі і лямпамі-фарамі (у ствол адной была ўпаяна «ўстаўка» з нарэзамі для стральбы патронамі калібру 7,62 міліметра, на абрэзе ствала другой стрэльбы мелася разьба для навінчвання прыбору бясполымевай і бясшумнай стральбы), два самаробныя прыстасаванні для бясполымевай і бясшумнай стральбы, пісталет калібру 5,6 саматужнай вытворчасці, 121 патрон калібру 5,6, 18 патронаў калібру 7,62, 13 патронаў калібру 9 міліметраў, 11 патронаў калібру 7,62 (рэвальверных), 5 патронаў да паляўнічай зброі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Минский городской центр недвижимости

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 25 января 2011 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА**

| | |
|---|---|
| **Наименование и характеристики продаваемого имущества** | **Изолированное помещение – гараж № 24 (помещение транспортного назначения), инвентарный номер №500/D-37855, общая площадь 46,4 кв.м** |
| **Местонахождение имущества** | г. Минск, ул. Западная, 7, пом. 24 |
| **Сведения о собственнике** | Снегирь М.В. |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск, (017) 227 40 22 |
| **Начальная цена** | 37 570 500 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 3 700 000 белорусских рублей |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 80, код 153001334; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **25 января 2011 г.** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 20.12.2010 по 21.01.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017) 227 40 22.**

**УП «ЛАНДЫШ» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ШВЕЙНОГО ОБОРУДОВАНИЯ:**

| № лота | Наименование швейного оборудования | Год выпуска | Инв. № | Кол-во | Начальная стоимость с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Парогенератор 46 РБЕ | 06.2004 г. | 557 | 1 | 2618345 |
| 2 | Парогенератор 46 РБЕ | 06.2004 г. | 558 | 1 | 2618345 |
| 3 | Парогенератор 46 РБЕ | 06.2004 г. | 559 | 1 | 2618345 |
| 4 | Стол гладильный Comel BRA SXD | 06.2004 г. | 560 | 1 | 1927882 |
| 5 | Стол гладильный Comel BRA SXD | 06.2004 г. | 561 | 1 | 1927882 |
| 6 | Стол гладильный Comel BRA SXD | 06.2004 г. | 562 | 1 | 1927882 |
| 7 | Стол гладильный Comel BRA SXD | 06.2004 г. | 563 | 1 | 1927882 |
| 8 | Стол гладильный Comel BRA SXD | 06.2004 г. | 564 | 1 | 1927882 |
| 9 | Стол гладильный Comel BRA SXD | 06.2004 г. | 565 | 1 | 1927882 |
| 10 | Пресс дублирующий «Ашима» 45» | 07.2004 г. | 566 | 1 | 6244248 |

Задаток — 10 % от указанной стоимости перечисляется на р/с 3012200130017 в ОАО «БелАПБ» г. Слуцк, МФО 153001921, УНП 600154422, УП «Ландыш».

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 14.01.2011 г. в 10.00 по адресу: 223610, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 57 а.**

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 13.01.2011 г. до 16.00 по указанному адресу.**

**Справки по тел.: 8 01795 2 43 26 (8 029 670 96 63).**

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Адрес объектов продажи | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ТС: Икарус 25059 | Цвет ТС – красный, год выпуска – 1988, тип ТС – автобус, тип кузова – вагон | Гомельский район, д. Бобовичи | 4 759 027 | 238 000 |
| 2 | Незавершенное законсервированное капитальное строение – здание многоквартирного жилого дома | Общая площадь строения – 1601,9 кв.м. Стены и перегородки кирпичные, перекрытия – железобетонные плиты. Процент готовности строения – 26 %. Незавершенное капитальное строение расположено на земельном участке площадью 0,7058 га. | г. Гомель, м-н Мельников луг | 1 072 856 306 | 53 642 800 |

**Продавец имущества**: Управляющий в деле о банкротстве ОДО «Арниус-М». Шаг торгов – 9 %. Вознаграждение – 5 % от цены продажи лота (для лота № 1) и 1 % (для лота № 2). Подробная информация о перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» № 127 от 02.07.2010 г. Цены указаны без НДС. Условия продажи – без условий

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 21 декабря 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **22 декабря 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| 3 | **Предприятие как имущественный комплекс ОАО «Гомельский подшипниковый завод»** Краткая характеристика объекта: Имущественный комплекс ОАО «Гомельский подшипниковый завод» согласно перечня имущества и имущественных прав, входящих в состав ОАО «Гомельский подшипниковый завод» по состоянию на 01.05.2009 г. и зарегистрировано в Научно-производственном государственном республиканском унитарном предприятии «Национальное кадастровое агентство» (свидетельство о государственной регистрации № 1801 от 18.09.2009 г.) — г. Гомель, ул. Шевченко, 27 — 3 010 000 000 — 150 500 000 |

**Продавец имущества**: управляющий в деле о банкротстве ОАО «Гомельский подшипниковый завод». Цена указана без НДС. Условия продажи: без условий. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 6 374 009 бел. руб. Условия продажи – без условий.
Более подробная информация об условиях участия в аукционе и перечне документов для участия опубликована в газете «Звязда» № 113 от 12.06.2010 г.

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 29 декабря 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **30 декабря 2010 г. в 12.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Номер р/с для перечисления залога** | Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509 |

15
СНЕЖНЯ
2010 г.
СЕРАДА
№ 46 (15649)
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Мікалай ФЯСЬКОЎ:

# «З МАТЭМАТЫКАЙ «НЕ СЯБРУЮЦЬ» НЕ ТОЛЬКІ БЕЛАРУСКІЯ ШКОЛЬНІКІ...»

**ЦІ МОЖНА абвінаваціць прыбор для вымярэння артэрыяльнага ціску ў гіпертанічнай хваробе пацыента? Дык чаму ў тым, што веды некаторых беларускіх абітурыентаў моцна «кульгаюць», абвінавачваюць цэнтралізаванае тэсціраванне? Фактычна ЦТ выконвае функцыю таго самага танометра — «высвечвае» ў падрыхтоўцы беларускіх школьнікаў тыя ці іншыя праблемы... Для школьных настаўнікаў, складальнікаў падручнікаў і тых, хто працуе над вучэбнымі праграмамі, вынікі тэсціравання павінны быць вельмі важным сігналам. Пра гэта вялася гаворка на Міжнароднай канферэнцыі, якая прайшла нядаўна пад эгідай Еўрапейскай асацыяцыі спецыялістаў па ацэньванні ў адукацыі (AEA-Europe). Такія канферэнцыі ладзяцца Еўрапейскай асацыяцыяй штогод, і кожная з іх прысвячаецца асобнай праблеме. Сёлета на канферэнцыі асвятлялася праблемы, звязаныя з укараненнем у сістэму ацэньвання стандартаў, а таксама выкарыстанне вынікаў міжнародных даследаванняў PISA ў нацыянальных інтарэсах для павышэння якасці кантролю і педагагічных вымярэнняў. Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў таксама з'яўляецца членам Еўрапейскай асацыяцыі спецыялістаў па ацэньванні ў адукацыі. І сёння мы гутарым з яго дырэктарам Мікалаем ФЯСЬКОВЫМ:**

— Прызнаюся, што міжнародны вопыт арганізацыі і правядзення тэсціравання для нас вельмі цікавы, тым больш што ў цэнтралізаванага тэсціравання, якое праводзіцца ў Беларусі, ёсць свая адметнасць — у нашай краіне яно выкарыстоўваецца выключна для адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет. А ў еўрапейскіх краінах тэсціраванне выкарыстоўваецца для правядзення як выніковай, так і прамежкавай атэстацыі навучэнцаў, і з'яўляецца галоўным інструментам знешняга ацэньвання. Прычым існуе даволі шмат адрозненняў і па шкаліраванні вынікаў удзельнікаў тэсціравання, і па іх асвятленні. Невыпадкова на канферэнцыі была агучана прапанова аб укараненні ў сістэму ацэньвання пэўных міжнародных стандартаў, асабліва з улікам стварэння ў Еўропе адзінай адукацыйнай прасторы.

Напрыклад, адна з секцый на канферэнцыі была прысвечаная абмеркаванню аргументаў на карысць і супраць выкарыстання ў тэстах розных тыпаў тэставых заданняў. Прадстаўнікі цэнтраў тэсціравання ЗША і Вялікабрытаніі выказвалі свой пункт гледжання на заданні з множным выбарам адказаў і адкрытымі адказамі, калі абітурыентам не даецца падказак і яны павінны самастойна сфармуляваць адказ. Гэтыя пытанні на працягу многіх гадоў выклікаюць пастаянныя спрэчкі ў распрацоўшчыкаў тэставых заданняў. А ў апанентаў ЦТ магчымасць угадвання правільнага адказу з'яўляецца ці не галоўным аргументам супраць правядзення ўступных іспытаў у тэставай форме.

Увогуле канферэнцыя, як заўсёды, была вельмі прадстаўнічай: на ёй сабраліся эксперты ў галіне педагагічных вымярэнняў з Англіі, Бельгіі, Ізраіля, Германіі, Нарвегіі, Польшчы, ЗША, Японіі, Швецыі і многіх іншых краін, вядучыя спецыялісты такіх аўтарытэтных арганізацый як CITO і Dutch Test (Галандыя), Cambridge Exam Research Кембрыджскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія) і ASC (ЗША). Паколькі месцам правядзення канферэнцыі быў абраны Осла, то ў нас была магчымасць бліжэй пазнаёміцца з сістэмай адукацыі і падыходамі да ацэньвання ў гэтай краіне. Мяркую, гэтая інфармацыя будзе цікавай і для вашых чытачоў.

Па-першае, агульная сярэдняя адукацыя ў Нарвегіі прадугледжвае 13-гадовае навучанне (10 гадоў даецца на засваенне праграмы пачатковай і сярэдняй школы плюс тры гады на старэйшую школу). Характэрная асаблівасць — жорсткі падзел на ўзроставыя групы: вы ніколі не ўбачыце, каб у адным будынку навучаліся і шасцігадовыя дзеці, і 14-гадовыя падлеткі, і 18-гадовыя маладыя людзі.

У пераліку абавязковых прадметаў пачатковай школы (акрамя матэматыкі, нарвежскай, англійскай мовы, малявання і музыкі) значацца такія прадметы як асновы хрысціянскай рэлігіі і маральнага выхавання і хатняя эканоміка. Ужо з першых дзён знаходжання ў школе дзецям даводзіцца думка, што асоба чалавека можа развівацца толькі ва ўзаемадзеянні з іншымі асобамі, таму вучоба арганізавана там такім чынам, каб дзеці навучыліся сумесна ацэньваць наступствы тых ці іншых рашэнняў. «Работа ў камандзе», «абмеркаванне», «прыняцце рашэння» — менавіта так гучыць з боку настаўніка ацэнка дзеянняў вучняў на школьных занятках. Дарэчы, з першага па сёмы клас у нарвежскіх школах адсутнічае такое паняцце як адзнака. Адзнакі з'яўляюцца толькі ў 8-м класе. Таксама з'яўляюцца і новыя прадметы — эканоміка, экалогія, бухгалтарскі ўлік і дыскыпліны, скіраваныя на прафесійную арыентацыю. На гэтым этапе галоўнае — сфарміраваць у дзяцей аптымістычную ацэнку ўласных здольнасцяў. Пачынаючы з 16 гадоў, нарвежцы наведваюць старэйшую школу. У першы год на вывучэнне абавязковых акадэмічных дысцыплін адводзіцца 30 гадзін у тыдзень. Далей аб'ём абавязковых прадметаў змяншаецца: на другім годзе навучання ў старэйшай школе на абавязковыя прадметы вылучаецца 18 гадзін у тыдзень і 12 гадзін — на дысцыпліны па выбары. На трэцім годзе гэтыя суадносіны змяняюцца яшчэ раз: 14 гадзін на абавязковыя прадметы і 16 гадзін — на прадметы па выбары. Такім чынам, старэйшыя школьнікі маюць магчымасць з кожным годам удзяляць больш часу і ўвагі тым прадметам, якія іх цікавяць і якія яны маюць намер у далейшым вывучаць ва ўніверсітэце ці ў каледжы.

А экзаменуюць старшакласнікаў выбарачна. Так, пасля першага года навучання ў старэйшай школе экзамены здаюць у сярэднім 10 працэнтаў навучэнцаў, пасля другога — 25 працэнтаў і пасля трэцяга — 50 працэнтаў. Пра тое, хто будзе здаваць экзамен і якія канкрэтна дысцыпліны, навучэнцы даведваюцца за два дні да правядзення іспытаў, але рыхтуюцца абсалютна ўсе. Гэтых школьнікаў выбірае Экзаменацыйны сакратарыят Нарвегіі, не маючы ніякай інфармацыі ні пра навучэнца, ні пра яго поспехі ў вучобе — так бы мовіць, усляпую. Пералік экзаменацыйных дысцыплін з'яўляецца пастаянным і ўключае інфарматыку, эканоміку, матэматыку і англійскую мову. Звычайна з гэтага пераліку выбіраюцца адна або дзве дысцыпліны. Пры заканчэнні старэйшай школы дадаюцца яшчэ два абавязковыя экзамены — па нарвежскай мове і адным прадмеце па выбары.

***— А як у такім разе ў Нарвегіі праходзіць адбор у ВНУ?***

— Уступныя экзамены на ўваходзе ў ВНУ адсутнічаюць, таму пры паступленні, па сутнасці, адбываецца конкурс школьных атэстатаў. Пасля заканчэння школы маладыя людзі могуць прадоўжыць навучанне ва ўніверсітэце ці каледжы, а можна год правесці ў народнай школе. Гэты тып навучальнай установы называюць «паўночным феноменам». 82 народныя школы размешчаны, як правіла, далёка ад гарадскога шуму і мітусні. Кожная народная школа мае сваю спецыялізацыю. У адной робяць акцэнт на спорце, турызме, замежных мовах і мастацтве фатаграфіі, у другой — на музыцы і сцэнічным мастацтве, у трэцяй — на сацыяльных навуках, педагогіцы і журналістыцы. Дыплом такой школы не з'яўляецца пасведчаннем аб атрыманні спецыяльнасці, але дае яго ўладальніку дадатковыя балы пры паступленні ва ўніверсітэт. У задачу народных школ заўсёды ўваходзіла не столькі навучанне, колькі фарміраванне асобы і дапамога ў выбары прафесіі, паколькі малады чалавек заўсёды вывучае тут толькі тыя прадметы, з якімі ў далейшым будзе звязана яго вучоба ва ўніверсітэце і будучая прафесія.

У Нарвегіі дыплом аб вышэйшай адукацыі атрымліваюць як пасля заканчэння каледжа, так і пасля заканчэння ўніверсітэта. Розніца ў тым, што каледж — гэта спецыялізаваная прафесійная вышэйшая навучальная ўстанова, а ўніверсітэты ў Нарвегіі заўсёды былі цэнтрам навукова-даследчай дзейнасці. Навучанне ў дзяржаўных універсітэтах і каледжах Нарвегіі амаль бясплатнае. Патрабуецца толькі ўнесці ўступны ўзнос у памеры 30 долараў і кожны семестр рабіць сімвалічныя ўзносы ў памеры 37 долараў.

Навучанне доўжыцца ад 3,5 да 4 гадоў. Напрыканцы навучання ўсе студэнты пішуць дыпломную работу і здаюць экзамен па філасофіі, незалежна ад таго, па якой спецыяльнасці яны навучаліся. Зусім іншым чынам будуюцца ўніверсітэцкія праграмы па медыцыне, праве, эканоміцы і інжынерным навукам: гэтыя спецыяльнасці лічацца найбольш прэстыжнымі і высокааплатнымі. Каб атрымаць ступень у адной з вышэйпералічаных навук і права на работу па спецыяльнасці, трэба навучацца па спецыяльнай праграме ад 4,5 да 6 гадоў.

**Гутарку вяла**
**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**
***(Працяг у наступным нумары.)***

# ВУЧЫЦЕСЯ ПА-БЕЛАРУСКУ!

**Школа — гэта не толькі чытанне, пісанне, лічэнне. Гэта яшчэ і цікавыя ідэі, эксперыменты, урэшце рэшт, святы. Пра што ведаюць нават самыя маленькія вучні 4-й гімназіі горада Мінска. Дзятву з 1 «А» мы заспелі на кірмашы. Вы не глядзіце, што дзеткам усяго па 6-7 гадоў, хлопчыкі і дзяўчынкі ўжо паспелі і палюбіць школу, і стаць яе маленькімі гаспадарамі. На кірмашы яны нават самі куплялі і прадавалі (!) розныя прысмакі.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Наогул гэтымі днямі адна са старэйшых беларускіх гімназій нагадвала суцэльнае поле для эксперыментаў: па сценах былі развешаныя шматлікія малаваныя справаздачы, дзе дзеці распавядалі пра сваё цікавае жыццё-быццё, школе прысвячалі вершы, песні.

У гімназіі юбілей. Яна, равесніца суверэннай Беларусі, адзначае сваё 20-годдзе.

Паглядзіш, як тут пачуваюць сябе дзеці, так і хочацца сказаць: «Вучыцеся па-беларуску!».

Не сакрэт, што зараз многія бацькі баяцца аддаваць дзяцей ў школы з беларускамоўным навучаннем. Але мамы і таты гэтых гімназістаў упэўненыя, што вучоба на роднай мове — гэта толькі плюс, прычым вельмі тлусты. Бацькі вераць, што ў хуткім часе менавіта спецыялісты, якія валодаюць роднай мовай, будуць запатрабаваныя ў Беларусі. Можа, таму з кожным годам сюды паступае ўсё больш дзяцей, расце конкурс пры паступленні.

Беларуская школа годна трымаецца ў адукацыйнай прасторы, 95-98 працэнтаў выпускнікоў «чацвёркі» становяцца студэнтамі, прычым найбольш іх прывабліваюць такія вышэйшыя навучальныя ўстановы як БДУ, БДПУ, БДУІР, дзяўчаты заваёўваюць лінгвістычны ўніверсітэт. Гімназія гадуе прызёраў гарадскіх і раённых алімпіяд, дзеці перамагаюць у творчых конкурсах. Наогул, яна ў тройцы лепшых школ раёна.

«Чацвёрка» пацвярджае, што беларуская мова не перашкаджае, а, хутчэй, наадварот, спрыяе навучанню дзяцей. У хлопчыкаў і дзяўчынак, якія добра валодаюць і рускай, і беларускай мовай (а тут яшчэ з першага класа вучаць і англійскую, а далей пры жаданні можна дадаць французскую і польскую. Калі будзе патрэба, тут гатовы пайсці на выкладанне і іншых замежных моў), лепш развітая памяць. Нават дзеткі, што прыходзяць у школу з цалкам рускамоўных сем'яў, не адчуваюць ніякага дыскамфорту. Вось паспрабуйце нават з першакласнікамі загаварыць па-беларуску — яны без праблем падтрымаюць гутарку. Беларуская мова — адзін з сакрэтаў паспяховасці гімназіі, яна і вучыць дзяцей, і выхоўвае. У школах з роднай мовай дзеці больш цэняць традыцыі, цікавяцца гісторыяй Беларусі, ладзяць беларускія святы, менавіта тут яны адчуваюць, што яны бе-ла-ру-сы. Можа, таму гімназісты з чацвёртай гімназіі вызначаюцца шчырасцю, працавітасцю, яны з павагай стаяцца да тых, хто побач, і годна трымаюцца на розных іспытах.

Безумоўна, сакрэт паспяховасці гімназіі не толькі ў мове. Тут неардынарны педагагічны склад, адпаведнае стаўленне да дзяцей. Калі прайсціся па школе, можна заўважыць, што яна дагледжаная, па-хатняму ўтульная. Усе вучні гімназіі, акрамя звычайных школьных урокаў, наведваюць дадатковыя заняткі. Кожны сёмы танчыць, добрая доля спявае і малюе, нехта займаецца спортам, ёсць тут нават будучыя пісьменнікі і журналісты. Ды і як гімназіі не расціць творчых асоб, тут жа столькі цікавага! Напрыклад, 1 «А» са сваёй настаўніцай Тацянай Варламавай можа доўга распавядаць пра тое, як здорава хадзіць у школу: нядаўна дзеці ставілі спектакль па беларускай казцы, падчас віктарыны хлопчыкі і дзяўчынкі даказалі, што добра знаёмыя з персанажамі народных казак. Ды і пра старадаўнія святы многія малыя ўжо ведаюць больш за сваіх бацькоў, напрыклад, увосень тут адзначаўся Багач. Да малых пастаянна наведваюцца і даюць парады старэйшыя вучні. А колькі ладзіцца розных конкурсаў, прычым не толькі для вучняў, але і для настаўнікаў (напрыклад, вызначаюцца самыя лепшыя педагогі ў намінацыях «Даследчык года», «Наватар года», «Майстар года»)!

Напярэдадні святкавання ў дырэктара гімназіі №4, выдатніка народнай асветы, кавалера ордэна Францыска Скарыны Юрыя Бандарэнкі пацікавіліся, якой ён уяўляе гімназію яшчэ гадоў праз 20.

— Па-першае, яна будзе абсталяваная па апошнім слове тэхнікі. Усё будзе максімальна інфарматызаванае: бібліятэка, класныя кабінеты, сталовая, — заўважае Юрый Міхайлавіч. — Магчыма, будзе дыстанцыйнае навучанне, вольнае наведванне ўрокаў. Шмат што зменіцца за 20 гадоў, але адно застанецца нязменным — беларуская мова. Я веру, што гімназія заўсёды будзе флагманам беларускасці не толькі ў раёне, горадзе, але і ва ўсёй рэспубліцы. І іншыя гімназіі будуць у нас вучыцца і пераймаць наш вопыт.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Пазіцыя

# «СПРАВАЙ ТРЭБА ЗАЙМАЦЦА, А НЕ НА ПЛОШЧЫ КРЫЧАЦЬ...»

**Моладзь Віцебшчыны, як і падчас мінулых прэзідэнцкіх выбараў, актыўна ўдзельнічае ў гэтай знакавай для ўсёй краіны падзеі. У прыватнасці, у якасці назіральнікаў у камісіях розных узроўняў па выбарах зарэгістраваны больш за 840 дзяўчат і юнакоў, у складзе выбарчых камісій — больш за 700 чалавек.**

Як расказала «Звяздзе» **Людміла КАПРАНАВА, другі сакратар Віцебскага абласнога камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі,** для тых прадстаўнікоў моладзі, якія пойдуць выбіраць кіраўніка дзяржавы ўпершыню, праводзяцца розныя акцыі («Мой першы выбар», «Я іду галасаваць»), каб першае ў жыцці галасаванне стала запамінальным. Моладзевыя інфармацыйна-прапагандысцкія групы равеснікаў знаёмяць з гісторыяй станаўлення незалежнай Беларусі, тлумачаць іх правы выбаршчыкаў, гарантаваныя дзяржавай. У ліку іншага расказваюць, што ўсякае прымушэнне забаронена заканадаўствам.

Што тычыцца чутак аб быццам бы прымушэнні студэнтаў і навучэнцаў галасаваць датэрмінова, Л. Капранава абвергла іх з-за адсутнасці канкрэтных фактаў. Калі б такое было, канешне, тыя, хто гэтым незадаволены, абавязкова афіцыйна паведамілі б аб парушэннях у абласную і ніжэйшыя выбарчыя камісіі.

Наконт заклікаў некаторых прадстаўнікоў апазіцыі — кандыдатаў на прэзідэнцкую пасаду сабрацца ўвечары пасля сканчэння галасавання на адной з мінскіх плошчаў, мая суразмоўца адзначыла, што тыя прадстаўнікі моладзі, якім ёсць чым карысным заняцца, не пойдуць на гэта несанкцыянаванае мерапрыемства. Тым больш не паедуць у Мінск на плошчу з другіх гарадоў, з глыбінкі. Самая масавая моладзевая арганізацыя краіны дае магчымасць праявіць сябе ўсім, хто неабыякавы да будучага краіны, хто цэніць стабільнасць, упэўнены ў заўтрашнім дні.

«Калі ты разумны, законапаслухмяны грамадзянін, навошта ісці кудысьці на плошчу і крычаць, нешта патрабаваць?» — адказвае на пытанне па тэме другі сакратар. — Тым больш што ніхто з арганізатараў акцыі на той самай плошчы не можа гарантаваць бяспеку тым даверлівым людзям, якія на ёй збяруцца».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# «А ДЗЕ ДЗЯДУЛЯ?..»

Свая справа

**ГРЭЕ, корміць, лечыць — на працягу стагоддзяў уявіць сабе сялянскую хату без печкі было проста немагчыма. Аднак цяпер тут з'явілася нібыта зусім не кепская альтэрнатыва, для большасці вяскоўцаў па-сапраўднаму вартай заменай аказаліся ўжо звыклыя электрычнасць і газ. І ўсё ж старое — не заўсёды непатрэбнае. Яшчэ раз пацвердзіць гэта вырашыў жыхар Мар'інай Горкі Сяргей Карповіч. У свае 28 гадоў ён распачаў асвойваць даволі рэдкую па нашым часе прафесію печніка.**

## За сябе. І сябра

Пасля заканчэння школы ў родным Беразіно ён стаў лесніком, аднак даволі хутка зразумеў, што «гэта — штосьці не тое». Няўдалай аказалася і другая спроба: новая прафесія электраэнергетыка задавальнення не прынесла. Знайсці вартую працу не ўдалося, усё ў жыцці здавалася няпэўным. І тады адыграў сваю ролю выпадак.

— Мой брат жаніўся і падаўся ў родныя мясціны жонкі — у Пухавіцкі раён, — распавядае Сяргей. — Мар'іна Горка мне таксама спадабалася, я прыехаў сюды, зняў жыллё, пачаў шукаць сабе занятак. І невядома, што было б далей, калі б не сям'я брата. Цесць брата — спадчынны пячнік. Пячной справай «загарэўся» і адзін з зяцёў гэтага ўнікальнага чалавека — Міхаіл. Мы пасябравалі, і Міша прапанаваў — давай працаваць разам.

Ідэя спадабалася адразу ж. Аднак толькі жадання аказалася недастаткова. Была неабходна падрыхтоўка. Міхаіл параіў зарэгістравацца ў службе занятасці беспрацоўным і папрасіцца на спецыяльныя курсы. І ў рэшце рэшт Сяргея сапраўды накіравалі вучыцца ў сталіцу.

— Я ніколі не баяўся брацца за нешта новае, пэўна, гэта ў мяне ад бацькі і дзеда: дзед быў увогуле майстрам на ўсе рукі, да яго ішлі ўсе, калі з'яўлялася неабходнасць ці то адрамантаваць веласіпеднае кола, ці то паставіць вокны, — заўважае Сяргей. — І ўзнікла толькі адна сітуацыя, калі я засумняваўся і пачаў думаць, а ці не лепш ад усяго адмовіцца, паспрабаваць сябе ў нечым іншым — гэта было пасля таго, як раптам трагічна загінуў Міша. Аднак усё ж вырашыў, што справу трэба працягваць — прынамсі, дзеля памяці сябра.

## Калі стукацца — заўжды адчыняць

Курсы печнікоў прынеслі нібыта някепскую падрыхтоўку, шмат карысных парад даў і цесць брата. Словам, з практыкай атрымаўся парадак. Цяжкасці ўзніклі з іншым.

— Асаблівых пытанняў з рэгістрацыяй у якасці індывідуальнага прадпрымальніка не было, — адзначае Сяргей. — Аднак хутка высветлілася, што для вядзення дакументацыі, бухгалтэрыі, складання каштарысаў мне не хапае ведаў. Таму звярнуўся ў раённую службу занятасці ўжо ў другі раз — і атрымаў накіраванне на курсы падрыхтоўкі прадпрымальнікаў.

Але і гэта яшчэ не ўсё. У пачатку ці не кожны сутыкаецца з вядомай праблемай «стартавага капіталу». Сапраўды, былі некаторыя ўласныя зберажэнні, штосьці пазычыў у знаёмых, але вельмі дарэчы аказалася і дапамога той жа службы занятасці — як былы беспрацоўны, Сяргей атрымаў на адкрыццё свайго невялікага бізнэсу субсідыю ў 11 бюджэтаў пражытковага мінімуму, на той час больш за 2,9 мільёна рублёў. У асноўным субсідыя пайшла на набыццё дарагога спецыяльнага абсталявання для вымярэння цягі і тэмпературы паверхні печак. Без гэтага было б немагчыма атрымаць ліцэнзію МНС.

— Увогуле атрыманне ліцэнзіі аказалася адным з самых складаных этапаў, на гэта спатрэбілася каля трох месяцаў — неабходна было вывучыць шмат дакументаў, — зазначае Сяргей. — Але што цікава: калі станавілася складана — мне заўсёды дапамагалі. І не толькі з атрыманнем дазволу. Напрыклад, адна з умоў дзейнасці печніка — наяўнасць прыстасаванага складскога памяшкання для захоўвання інвентару і матэрыялаў. Арэнда такога памяшкання абышлася б прыкладна ў 200 тысяч рублёў штомесяц — грошы немаленькія. І тут насустрач пайшло ўжо раённае аддзяленне МНС. Дамовіліся так: яны шукаюць таннае памяшканне. А ў сваю чаргу я бяру на сябе абавязак выконваць заказы па аднаўленні печак маламаёмных пенсіянерам, шматдзетным сем'ям, іншым сацыяльна неабароненым людзям.

На атрыманне своеасаблівага «дзяржзаказу» ці не галоўным чынам паўплывала наяўнасць ліцэнзіі. Сёння ў раёне яе мае толькі Сяргей Карповіч, хоць працуюць тут і іншыя, «нелегальныя», печнікі.

— Напэўна, можна працаваць без рэгістрацыі і ліцэнзіі, вось толькі ці трэба так рабіць — не разумею, — разважае Сяргей. — Лепш усё ж выйсці з ценю, як той казаў, заплаціць падаткі — і спаць спакойна. Тым больш што гаворка не ідзе пра нейкія завоблачныя сумы — паводле спрошчанай сістэмы я плачу ўсяго 5 працэнтаў ад выручкі.

## У модзе — «рускі варыянт»

Ва ўяўленні многіх прафесія печніка — ледзьве не «перажытак» мінулага. Аднак такое меркаванне не мае аніякіх падстаў. Сяргей не хавае: заказаў цяпер шмат. І не толькі ад гаспадароў традыцыйных драўляных хат. Паслугай нярэдка цікавяцца ўладальнікі дач і катэджаў: адным хочацца мець камін, другім барбекю, а трэцім — самую звычайную печку. Прычым найбольшым попытам апошнім часам карыстаюцца печкі... рускія. Па вельмі простай прычыне: больш-менш заможныя людзі пачынаюць думаць аб правільным і смачным харчаванні. А са стравамі з рускай печкі нішто не параўнаеш. Да таго ж думкі, што такая печка будзе абавязкова займаць «палову пакоя» — таксама стэрэатып. Пры жаданні тут можна абмежавацца нават памерам «метр на метр».

— Адзінае, што першым часам могуць узнікнуць пэўныя непаразуменні, — усміхаецца Сяргей Карповіч. — Чамусьці ва ўяўленні многіх пячнік — гэта абавязкова сівы дзядуля з барадой. Таму калі прыходзіць даволі малады чалавек, то адразу ж пачынаюцца сумненні, маўляў, «а дзе дзядуля»? Ваганні ж знікаюць толькі тады, калі пакажаш ліцэнзію, здымкі сваіх ранейшых печак. А калі закончыш работу — чуеш падзяку. І, відаць, гэта самае прыемнае.

## Паслугі з гнуткім «прэйскурантам»

Заліць падмурак, даць яму набраць «моц», перацерці гліну, прыгатаваць раствор, апрацаваць цэглу, распачаць кладку. Праца печніка — выключна ручная. А плюс да таго карпатлівая і надзвычай адказная. Даводзіцца быць хімікам, фізікам, а часам — яшчэ і дызайнерам. На самую просценькую печку ці камін ідзе мінімум тры дні, на самыя складаныя — да двух тыдняў. Тут шмат што залежыць ад пажаданняў і матэрыялаў. Дарэчы, кажа Сяргей, некаторыя свядома аддаюць перавагу больш «прэстыжнай» цэгле з Украіны або Прыбалтыкі. Аднак і наша беларуская цэгла — нічым не горшая.

— Печка можа служыць гадоў трыццаць і нават паўстагоддзя, галоўнае — яе любіць і даглядаць, — зазначае Сяргей. — Трэба зыходзіць з рэалій: мы ходзім на працу, таму прапальваць па аптымальным варыянце — шторанак і штовечар — атрымліваецца далёка не заўсёды. Затое нішто не перашкаджае печку рэгулярна чысціць, выконваць іншыя нюхітрыя правілы. Скажам, не класці шмат дроў адразу, змешваць дровы з розных парод дрэва. Безумоўна, бяроза — гэта добра. Але калі паліць выключна бярозай, то стане вылучацца шмат дзёгцю і, як вынік, узнікнуць праблемы з дымаходам.

Кошт працы даволі розны. Няхітрыя печкі ці камін абыдуцца недзе ў 250-300, канструкцыі паскладаней — пад 800 «умоўных» адзінак. Прыкладна столькі ж «пацягнуць» і матэрыялы. Зрэшты, Сяргей заўважае: калі ён называе сваю цану, то заўсёды глядзіць на чалавека. І калі бачна, што той чалавек зусім не багаты, звычайна даецца зніжка.

— Па сутнасці, я распачаў працу толькі ў жніўні, таму вызначыць свой даход пакуль даволі цяжка — месяц на месяц не прыпадае, — адзначае Сяргей Карповіч. — Аднак на жыццё ў любым выпадку хапае і, спадзяюся, хопіць на іншыя справы. Бо хачу вырашыць жыллёвыя пытанні, ажаніцца і абавязкова мець шмат дзяцей. А значыць, я павінен рабіць усё, каб іх забяспечыць.

**Сяргей ГРЫБ.**

*Пухавіцкі раён.*

Хакей. Моладзевы чэмпіянат свету

# ВЫСОКАКУЛЬТУРНАЕ ХАКЕЙНАЕ МЕСЦА

**У другі раз за 2010 год Бабруйск прымае чэмпіянат свету па хакеі. У красавіку горад на Бярэзіне (сумесна са сталіцай) арганізоўваў спаборніцтвы наймацнейшых юніёраў планеты. А ў мінулы панядзелак там жа стартаваў чэмпіянат свету сярод моладзевых зборных у першым дывізіёне.**

З адкрыццём у маі 2008 года сямітысячнай «Бабруйск-Арэны» найбуйнейшы з неабласных беларускіх гарадоў паступова ператвараецца ў галоўнага канкурэнта сталіцы ў барацьбе за намінацыю «хакейная сталіца краіны». Знакамітую цытату Ільфа і Пятрова «Пры слове Бабруйск сход хваравіта застагнаў. Усе былі гатовы ехаць туды хоць цяпер. Бабруйск лічыўся добрым, высокакультурным месцам» зараз можна пераасэнсаваць, і замест сходу дзяцей лейтэнанта Шміта з лёгкасцю паставіць хакейных заўзятараў.

У гаспадароў турніру, зборнай Беларусі, планы на чэмпіянат самыя сур'ёзныя — трэба выходзіць у эліту, пуцёўку туды атрымае толькі пераможца. Склад каманды досыць збалансаваны, ва ўсіх лініях ёсць свае лідары. Асноўны галкіпер Аляксандр Барадуля добра зарэкамендаваў сябе ў МХЛаўскім «Юнацтве». Цэментаваць абарону будуць Кірыл Гатавец, ужо выступаўшы за нацыянальную зборную, і Міхаіл Хараманда. У нападзенні цэлы россып не надта яркіх, але стабільных выканаўцаў. Увогуле зборная ўяўляе сплаў гульцоў МХЛаўскіх «Юнацтва» і «Мінскіх Зубраў», разбаўленых хлопцамі з Адкрытага чэмпіянату Беларусі.

Галоўным супернікам беларусаў на турніры бачыцца каманда Латвіі. Яе аснову складаюць хакеісты, якія таксама выступаюць у МХЛ. Больш за тое, клуб «Рыга» — адзін з лідараў турніру. Гульня Беларусь—Латвія ў нядзелю, напэўна, і выявіць пераможцу турніру. Астатнія каманды — Італія, Японія, Вялікабрытанія і Украіна — аб'ектыўна кажучы, узроўнем ніжэй.

Першы дзень нечаканых вынікаў не прынёс. Італьянцы разгромілі японцаў з лікам 6:0 (покерам вызначыўся Мірка Прэсці). Латвія і Вялікабрытанія з'явіліся на лёдзе другімі, але вынік быў падобны на папярэдні — 6:1 на карысць нашых суседзяў.

Увечары апошнімі на пляцоўку выйшлі каманды Беларусі і Украіны. На 6-й хвіліне беларусы вызначыліся першымі, але арбітр узяцце варот адмяніў. Аднак праз чатыры хвіліны нагоды прычапіцца да беларусаў ужо не было. Пасля кідка Крэмзукава на дабіванні першым быў Ляўша.

Украінцы не паказаліся хлопчыкамі «для біцця». Барадуля не раз выратоўваў сваю каманду. А вось галкіпер гасцей Ткачэнка на 26-хвіліне другі раз быў засмучаны — камбінацыя беларусаў скончылася голам Аўтаева. І толькі напрыканцы другога перыяду «жоўта-блакітныя» закінулі сваю першую шайбу. Праўда, беларускія хлопцы праз 25 секунд зноў павялічылі розніцу ў ліку — шайба на рахунку Сцяпанава.

У дэбюце трэцяга перыяду ўкраінцы атрымалі выдатную магчымасць аднавіць інтрыгу. Выдаленне Гатаўца госці хутка рэалізавалі, а пасля фолу Сачыўка маглі наогул зраўняць лік. Аднак беларусы адбіліся. А потым пачалі даказваць свой вышэйшы клас. «Астапа», як кажуць, панесла — у добрым сэнсе. За 8 хвілін яны вызначыліся чатыры разы. Галы на рахунку Суслы (двойчы), Елісеенкі і зноў Ляўшы.

Галоўны трэнер беларускай маладзёжкі, былы абаронца нацыянальнай зборнай Алег Мікульчык, пасля матча адзначыў добрыя дзеянні суперніка і падкрэсліў адказнасць, якая ляжыць на плячах яго падначаленых: «Нам трэба выходзіць у эліту. Мабыць, хваляванне і ўсведамленне адказнасці спачатку і стрымлівала хакеістаў. Да таго ж, чаго хаваць, я і сам шмат хваляваўся напярэдадні афіцыйнага дэбюту на пасадзе галоўнага трэнера на такім узроўні. Аднак атрымалася выціснуць максімум са сваіх магчымасцяў».

**Яўген ВАРАКСА.**

# МАЛАДОСЦЬ СТАРАЖЫТНАЙ ГАЛІНЫ

## Да 100-годдзя Інстытута меліярацыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Дырэктар Інстытута меліярацыі, кандыдат тэхнічных навук Мікалай ВАХОНІН.

**У гісторыі нашай краіны за апошнія 150 гадоў не было большага ўздзеяння на прыродныя сістэмы, чым гэта зрабіла меліярацыя. Край балот, дзе балотам быў кожны сёмы гектар тэрыторыі, дзе ў многіх раёнах забалочанасць дасягала 90 працэнтаў усіх зямель, атрымаў магчымасць увайсці ў сусветную і еўрапейскую цывілізацыю, абуладкаваць амаль тры мільёны гектараў для развіцця інтэнсіўнай аграпрамысловай вытворчасці, карэннага паляпшэння ўмоў працы і пражывання чалавека. Гэта адбылося ў перыяд найбуйнейшых палітычных узрушэнняў (рэвалюцый, войнаў, рэформаў, перабудоў), амаль пастаяннага супрацьстаяння аматараў дзікай прыроды.**

**Сёння на высокім дзяржаўным узроўні прыйшло прызнанне безальтэрнатыўнасці меліярацыі перадувільготненых зямель для Беларусі, прызнанне неабходнасці захавання і актыўнага выкарыстання пабудаваных некалькімі пакаленнямі беларусаў меліярацыйных сістэм у Палессі і Паазер'і, у кожным раёне і гаспадарцы. Пацвярджэннем гэтаму з'яўляюцца Дзяржаўныя праграмы захавання і выкарыстання меліяраваных зямель на 2006—2010, 2011—2015 гады, сацыяльна-эканамічнага і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся на 2010—2015 гады. Можа, самае галоўнае, што за імі стаяць абласныя і раённыя праграмы, таму што ў сярэднім на кожны са 118 раёнаў прыпадае па 24,5 тысячы гектараў меліяраваных зямель. А за імі — сотні тысяч земляробаў, якія імкнуцца вырасціць два каласы там, дзе раней не было ніводнага.**

Загадчыца лабараторыі выкарыстання тарфяной глебы, кандыдат сельскагаспадарчых навук Людміла ЛУЧАНОК і галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі, доктар сельскагаспадарчых навук Мікалай СЕМЯНЕНКА ацэньваюць вынікі навуковых доследаў.

Ці магло ўсё гэта здзейсніцца навобмацак, метадам проб і памылак, без сур'ёзнага навуковага абгрунтавання, без пастаяннага навуковага суправаджэння і маніторынгу? Безумоўна, быў сусветны і асабліва еўрапейскі вопыт — у развітых еўрапейскіх краінах меліярацыя ў асноўным выконвалася за стагоддзе да пачатку яе ў рэспубліцы. Але гэты вопыт патрабаваў дэталёвай адаптацыі да асаблівасцяў нашых балот і нашай тэрыторыі. У многіх выпадках ён увогуле не падыходзіў. Патрэбна была свая, беларуская меліярацыйная навука. І яна пачала фарміравацца і развівацца адначасова з першымі крокамі па меліярацыйным пераўтварэнні зямель.

Пастановай Мінскага губернскага камітэта па справах земскай гаспадаркі ад 22 лютага 1910 года была арганізавана Мінская балотная доследная станцыя, з якой і бярэ адлік сённяшні Інстытут меліярацыі. Для яе кіраўніцтва запрасілі вучня К.А. Ціміразева, магістра батанікі А.Ф. Флёрава. У якасці першай доследнай гаспадаркі станцыі быў выбраны ўчастак «Кукуцелка» недалёка ад станцыі Лунінец на Палессі, дзе неўзабаве разгарнуліся даследаванні наконт магчымасці вырошчвання на тарфяных глебах розных сельскагаспадарчых культур, уплыву ўгнаенняў на ўраджайнасць, а таксама даследаваліся вынікі арашэння паводкамі пойменных лугоў. У канцы 1913 года дырэктарам Мінскай станцыі быў прызначаны А.Т. Кірсанаў, які ініцыяваў асушэнне і асваенне Камароўскага балота. Станцыя выдавала часопіс «Балотазнаўства», дзе публікаваліся знакамітыя вучоныя таго часу — А.Ф. Флёраў, А.Т. Кірсанаў, А.Н. Касцякоў, А.Д. Дубах, В.С. Дактуроўскі, В.Н. Сукачоў і інш.

Пастановай Савета Народных Камісараў СССР 18 мая 1930 года на базе Мінскай балотнай доследнай станцыі і аддзела меліярацыі і культуры балот Беларускага НДІ сацыялістычнай сельскай гаспадаркі ў г. Мінску створаны Усесаюзны навукова-даследчы балотны інстытут. Перад інстытутам была пастаўлена задача «сістэматычна вывучаць балоты і лугі Савецкага Саюза з боку іх прыроды, культуры, эканомікі і выкарыстання». У структуры інстытута былі Архангельская, Кіраўская, Наўгародская і Сарненская доследна-балотныя станцыі.

У перыяд актыўнага меліярацыйнага будаўніцтва (з 1966 года), калі ажыццяўлялася навуковае абгрунтаванне першапачатковай меліярацыі, у інстытуце функцыянавала 25 аддзелаў і лабараторый, Палескі комплексны аддзел (г. Пінск), Палеская і Івацэвіцкая доследна-меліярацыйныя станцыі, Пружанская гідролага-гідрагеалагічная лабараторыя, Віцебская эксперыментальная гаспадарка. За высокія паказчыкі ў выкананні планаў навуковых даследаванняў і ўкараненні дасягненняў навукі ў вытворчасць у 1980 годзе інстытут узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Вялікі ўклад у развіццё меліярацыйнай навукі ў гэтыя гады ўнеслі Г.І. Афанасік, В.І. Бялкоўскі, П.І. Закржэўскі, В.М. Зубец, А.І. Івіцкі, В.Ф. Карлоўскі, В.Т. Клімкоў, В.М. Кандрацьеў, Г.М. Лыч, І.В. Мінаеў, Э.І. Міхневіч, А.І. Мурашка, А.Ф. Печкуроў, Е.В. Рудэнка, М.В. Сініцын, С.Г. Скарапанаў, В.Ф. Шабека і іншыя.

У 1992 годзе Беларускі навукова-даследчы інстытут меліярацыі і воднай гаспадаркі пераўтвораны ў Беларускі навукова-даследчы інстытут меліярацыі і лугаводства. Разам з распрацоўкай новых спосабаў асушэння, тэхналогій комплекснага кіравання водна-паветраным рэжымам меліяраваных глеб, тэхналагічных працэсаў і тэхнічных сродкаў для будаўніцтва, рэканструкцыі і эксплуатацыі меліярацыйных сістэм праводзяцца даследаванні па праблемах урадлівасці і прадукцыйнасці асушаных глеб, стварэння і эксплуатацыі сенажацяў і паш. У сувязі з рэзкім пашырэннем плошчы асушаных сельскагаспадарчых зямель актуалізавалася значэнне маніторынгу прыродных комплексаў.

У інстытуцкай лабараторыі асушаных мінеральных зямель. На здымку малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі Таццяна ГОВАРАВА.

На ўсіх этапах развіцця меліярацыі ў рэспубліцы інстытут быў цесна звязаны з меліярацыйным будаўніцтвам, эксплуатацыяй меліярацыйных сістэм, выкарыстаннем асушаных сельскагаспадарчых зямель. Мяняліся назвы, падпарадкаванасць, але нязменным заставалася галоўнае — накіраванасць на паляпшэнне зямель, імкненне вырасціць ураджай там, дзе раней культурныя расліны не раслі ўвогуле. Інстытут меліярацыі стаў кузняй высокакваліфікаваных кадраў у галіне меліярацыі, меліярацыйнага земляробства, лугаводства. Тут атрымала пуцёўку ў навуку не адна сотня дактароў і кандыдатаў навук з усіх рэспублік СССР.

У суверэннай Беларусі Інстытут меліярацыі захаваў сваё навуковае аблічча, выстаяў у цяжкія гады, настойліва і мэтанакіравана працаваў у кірунку захавання меліярацыйнага комплексу, павышэння эфектыўнасці кожнага меліяраванага гектара.

Сотні работнікаў — акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў, дактароў і кандыдатаў навук, інжынераў і аграномаў, тэхнікаў і рабочых — аддавалі свае сілы і веды служэнню айчыннай навукі. Нельга не ўспомніць дырэктараў інстытута апошніх 60 гадоў — С.Г. Скарапанава, В.М. Зубца, В.Ф. Карлоўскага, А.П. Ліхацэвіча.

5 сакавіка 2002 года ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Інстытут меліярацыі ўвайшоў у склад Нацыянальнай акадэміі навук. Гэта адкрывае новыя шырокія магчымасці ўзаемадзеяння з іншымі навуковымі ўстановамі самых розных кірункаў. Мы працягваем самае актыўнае супрацоўніцтва з Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання, яго абласнымі і раённымі камітэтамі, Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Дзяржаўным камітэтам па маёмасці.

Што дала меліярацыя нашай краіне, яе насельніцтву, кожнаму жыхару? Мы маем сёння 2,9 млн гектараў меліяраваных сельскагаспадарчых зямель. У іх складзе больш за мільён гектараў — былыя балоты і амаль 2 млн га — пераўвільготненыя ў мінулым мінеральныя землі. У сярэднім на адну калектыўную гаспадарку прыпадае больш за 1,5 тыс. гектараў абноўленых угоддзяў. У цяперашні час сельская гаспадарка Ганцавіцкага, Лунінецкага, Пінскага, Ельскага, Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Калінкавіцкага, Петрыкаўскага, Акцябрскага, Любанскага, Салігорскага, Глускага раёнаў у асноўным размешчаная на асушаных землях, эфектыўнае выкарыстанне якіх вызначае стан усёй аграрнай эканомікі. У Брэсцкай вобласці ў 9 з 16 раёнаў меліяраваныя землі займаюць больш за палову ўсіх сельскагаспадарчых угоддзяў. Дзе была б гэта вобласць па развіцці сельскай гаспадаркі, калі б тут не правялі меліярацыю? Безумоўна, альтэрнатывы вядзення сельскай гаспадаркі на асушаных землях у большасці раёнаў, асабліва на Палессі, проста няма.

Біякліматычны патэнцыял рэсурсаў і новае меліярацыйнае будаўніцтва за ўласныя сродкі гаспадарак і іншых недзяржаўных інвестараў, уключаючы замежных.

У апошнія гады дзяржава актыўна падтрымлівае меліярацыйны комплекс, выдзяляючы штогод на гэтыя мэты каля 100 млн долараў. Задача меліярацыйнай навукі заключаецца ў тым, каб забяспечыць іх рацыянальнае выкарыстанне і, можа, самае галоўнае — хуткую аддачу ад укладзеных сродкаў. Вырашэнне гэтай праблемы патрабуе глыбокіх рознабаковых ведаў аб стане меліярацыйнага аб'екта, як адзінай прыродна-тэхнічнай сістэмы, дынаміцы ўсіх яго складнікаў, адчувальнасці да тэхнічных умоў, якія змяняюцца, кліматычных ваганняў і анамалій надвор'я. Складанасць заключаецца ў неабходнасці і безальтэрнатыўнасці сінхронных дзеянняў па ўсім меліярацыйным комплексе — ад праектавання мерапрыемстваў па рэканструкцыі меліярацыйных сістэм да ўборкі культур, што вырошчваюцца на асушаным полі. У гэтым шматзвённым і шматфактарным ланцугу няма другарадных і трэцярадных звёнаў і фактараў — усе яны аднолькава важныя і незаменныя. Кіраваць тут па старынцы, метадам проб і памылак, нельга. Меліяраваны сельскагаспадарчы аб'ект складаецца з чатырох непарыўна звязаных паміж сабой падсістэм: меліярацыйнай сеткі, меліяраваных зямель (глеб), сельскагаспадарчых культур, якія вырошчваюцца, а таксама зменлівага прыроднага асяроддзя. Для вырашэння любой практычнай задачы неабходна ўлічваць асаблівасці ўсіх гэтых падсістэм у іх узаемасувязі.

Сёння, каб атрымаць эканамічны эфект, «трэба страляць не па плошчах, а па квадратах». Напрыклад, у савецкія часы, калі імкнуліся да тэхнічнай дасканаласці, належала перыядычна прамываць увесь дрэнаж, нягледзячы на вялізныя затраты. Цяпер распрацоўкі інстытута накіраваныя на тое, каб рабіць гэта не нарматыўна-ўсярэднена, а гранічна канкрэтна. Распрацаваны спецыяльныя прылады, якія дазваляюць праводзіць дыягностыку стану дрэн і на аснове гэтага аналізу прымаць канкрэтныя рашэнні. А дыягнаставаць неабходнасць прамыўкі нашмат танней, чым прамываць дрэну або калектар, якія ў гэтым не маюць патрэбы, прамываць усе запар. Тэхналагічныя аспекты дрэнапрамывачнай і іншай тэхнікі таксама распрацоўваюцца ў інстытуце. Тут распрацавана, напрыклад, канструкцыя, якая дазваляе зменшыць глыбіню канала, зрабіўшы яго дакладна ў адпаведнасці з гідраўлічным разлікам. А гэта эканомія на земляных работах. Любы меліярацыйны аб'ект (той жа канал) разлічваецца па адпаведных залежнасцях, і задача — распрацаваць гэтыя залежнасці.

Апошнія нарматыўныя дакументы, якія датычацца пытанняў меліярацыі, ствараліся з улікам распрацовак інстытута. Пры гэтым варта падкрэсліць: найбольшая эканомія дасягаецца за кошт выкарыстання інфармацыйных тэхналогій — новых больш строгіх формул, метадаў разліку і г.д.

У Праграме захавання і выкарыстання меліяраваных зямель адзначаецца, што ў першую чаргу рэканструкцыі падлягаюць меліярацыйныя сістэмы тых гаспадарак, у якіх будзе атрыманая найхутчэйшая і максімальная аддача ад інвестыцый. Пры гэтым, з улікам няспыннай дынамікі цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю і прадукцыю вытворча-тэхнічнага прызначэння (на жаль, неспрыяльную для сельскай гаспадаркі і яе складніка — меліярацыі), павінен ажыццяўляцца пастаянны пераразлік аптымальных варыянтаў інтэнсіўнасці сельскагаспадарчага выкарыстання меліяраваных зямель, уключаючы меліярацыйныя мерапрыемствы, на цяперашнія, а лепш — на спрагназаваныя мэты. Інакш кажучы, не можа быць аптымальных рашэнняў «на ўсе часы і на ўсе калгасы». Таму разлікі павінны пастаянна паўтарацца, што ў прынцыпе немагчыма без камп'ютарных тэхналогій.

Для інфармацыйнага забеспячэння ацэнкі эфектыўнасці рэканструкцыі меліярацыйных сістэм, параўнання варыянтаў яе правядзення, а таксама варыянтаў сельгасвыкарыстання, у Інстытуце меліярацыі распрацавана аўтаматызаваная кніга гісторыі палёў на аснове ГІС-тэхналогій, якая забяспечвае захаванне ўсіх ураджаеўтваральных фактараў і аб'ёмаў ураджаяў, дыферэнцыравана па кожным полі гаспадаркі за многія гады. Распрацавана таксама аўтаматызаваная сістэма кадастру тэхнічнага стану меліярацыйных сістэм.

Арыентацыя на фарміраванне інавацыйнай эканомікі скіроўвае да карэннай перабудовы метадаў работы ўсіх навуковых падраздзяленняў, што ўжо прыносіць станоўчыя вынікі.

На падставе даследаванняў работы меліярацыйных сістэм і новых канструкцый гідратэхнічных збудаванняў, з выкарыстаннем палімерных матэрыялаў у меліярацыйным будаўніцтве, узамен матэрыялаёмістых і цяжкавагавых жалезабетонных, керамічных, азбестацэментных канструкцый распрацаваны (В.М. Макаед, Г.В. Хмялеўская) і зацверджаны ў якасці тыпавых аблегчаныя канструкцыі калонак, калодзежаў-паглынальнікаў, дрэнажных вусцяў. Прымяненне комплексу прапанаваных канструкцый на аб'ектах рэканструкцыі меліярацыйнай сеткі, за кошт зняшэння вагі і выключэння цяжкай тэхнікі пры транспарціроўцы і ўстаноўцы гэтых канструкцый, дае эканомію 100 дол. ЗША/га.

На метэапляцоўцы Пружанскага стацыянара Інстытута меліярацыі пастаянна вывучаюцца вынікі ўздзеяння прыродных фактараў на расліны на меліяраваных землях.

Ажыццёўлены распрацоўка і выпрабаванне (В.П. Закржэўскі, М.М. Пагодзін) эксперыментальных прылад і абсталявання для дыягностыкі стану (КСД-160) і механізацыі работ па ачыстцы калектарнай сеткі. Папярэдняя дыягностыка заілення дрэнажнай сеткі дазваляе выключыць з прамыўкі сістэмы, якія не маюць у ёй патрэбы, што забяспечвае эканомію 73 дол. ЗША/га; забяспечваецца таксама магчымасць праводзіць кантроль якасці ўкладкі дрэнажу пасля правядзення рэканструкцыі. Выпушчаныя і рэалізаваныя для прадпрыемстваў меліярацыйных сістэм доследныя ўзоры, праводзіцца работа па арганізацыі на базе інстытута вытворчасці распрацаваных устройстваў у адпаведнасці з патрэбамі галіны.

Меліярацыйным арганізацыям прапануецца (А.П. Ліхацэвіч, Г.Ю. Левін) эфектыўная сістэма кіравання водным рэжымам на асушальна-ўвільгатняльных сістэмах з прыняццем рашэнняў на базе альтэрнатыўных схем арганізацыі выходных звестак. Гэтая распрацоўка забяспечвае паляпшэнне воднага рэжыму меліяраваных зямель і рост іх прадукцыйнасці на 13—18 працэнтаў.

Па распрацаваных інстытутам рэгламентах і тэхналогіі (А.С. Меяроўскі, А.Л. Біруковіч) у рэспубліцы рэалізаваная праграма стварэння шматкампанентных паш інтэнсіўнага тыпу, плошча якіх на канец 2010 года склала 530 тыс. га. Іх эксплуатацыя дазволіла не толькі значна павысіць малочную прадукцыйнасць, але і адкрыла магчымасць скарачэння агульнай плошчы паш (перш за ўсё на асушаных землях) на 400—500 тыс. га і перапрафілявання гэтых зямель для вырошчвання іншых эканамічна эфектыўных культур.

Падчас выканання навукова-даследчых работ, накіраваных на павышэнне прадукцыйнасці сенажацяў і паш, была выяўлена вострая неабходнасць павелічэння вытворчасці насення шматгадовых траў высокіх рэпрадукцый для забеспячэння патрэбных аб'ёмаў пераазалужэння, прычым высакаякасным насеннем эфектыўных відаў траў беларускай селекцыі. На Віцебскай доследнай меліярацыйнай станцыі ў Сенненскім раёне створаны і выведзены на праектную магутнасць навукова-вытворчы палігон па вытворчасці суперэліты насення шматгадовых траў, які ўключае спецыялізаваны севазварот, адпрацаваныя тэхналогіі па вырошчванні розных відаў траў, узведзеная ў самыя кароткія тэрміны сучасная тэхналагічная лінія па дапрацоўцы насення да кандыцыі суперэліты. У 2009 годзе атрымана 21,8 т насення суперэліты шматгадовых траў, у тым ліку 9,3 т бабовых траў. Выкарыстаная ў 2010 годзе колькасць насення 11 відаў шматгадовых траў не толькі вырашыць пастаўленую задачу забеспячэння паўночна-ўсходняга рэгіёна рэспублікі ў такім насенні, але і дазволіць закрыць патрэбу рэспублікі ў ім у цэлым.

У гэтай рабоце ўдзельнічалі як супрацоўнікі інстытута і станцыі В.В. Кучко, А.Л. Біруковіч, Н.В. Кабанава, так і Навукова-практычнага цэнтра па земляробстве — П.П. Васько, Е.І. Чэкель. Вялікую дапамогу аказалі Віцебскі аблсельгасхарч і Сенненскі райвыканкам.

Перспектыўны комплекс распрацовак, выкананых пры ўдзеле Э.М. Шкутава, М.М. Семяненкі, П.Ф. Ціво, Л.М. Лучанок для стварэння эфектыўнай кармавой базы на тарфяных глебах Палесся і мінеральных землях Паазер'я, які ўключае алгарытмы адаптацыі відавога складу культур да прыродна-тэхнагенных умоў асушаных плошчаў, тэхналогіі комплекснага прымянення сродкаў інтэнсіфікацыі вырошчвання збожжафуражных культур. Укараненне гэтых распрацовак дазволіць дасягнуць узроўню прадукцыйнасці ў 6—7 тон кармавых адзінак з гектара. Дадатковы прыбытак павінен скласці да 100 дол./га (патэнцыйная плошча прымянення да 300 тыс. га).

Якасная адаптацыя відавога складу кармавых культур дазволіць на працягу 5—7 гадоў падтрымліваць у працаздольным стане 10—30 працэнтаў плошчаў (з павелічэннем перыядаў паміж рэканструкцыямі і рамонтамі).

Сваё стагоддзе калектыў Інстытута сустракае, захоўваючы дасягнутае ў мінулым і дакладна ўсведамляючы новыя задачы. Яны вызначаныя і сфармуляваныя ў дзяржаўных праграмах умацавання аграрнай эканомікі і развіцця сельскіх тэрыторый на 2011—2015 гады. Сельская гаспадарка рэспублікі павінна стаць да канца іх выканання бездатацыйнай і самаакупнай. Для дасягнення гэтай мэты вялікая і практычна незаменная роля меліяраваных зямель. Зробленае за сто гадоў з'яўляецца фундаментам пабудовы сучаснай мадэлі меліярацыі, якая мае на ўвазе эканамічна эфектыўнае паляпшэнне сельскагаспадарчых зямель, стварэнне арэала высокапрадукцыйнага, устойлівага да прыродных анамалій меліярацыйнага земляробства і лугаводства.

**Мікалай ВАХОНІН,**
**дырэктар РУП «Інстытут меліярацыі».**
УНП 100363825.

# ЛЕПШЫ РЭПЕТЫТАР — ПАПРУГА СА СПРАЖКАЙ?

Клуб юнкараў

**Кожны аўторак і пятніцу назіраю адну і тую ж карціну: звычайна гарэзлівы сусед-трэцякласнік Андрэйка без энтузіязму, панура апусціўшы галаву, крочыць да рэпетытара. Школа, у якой ён вучыцца, — з матэматычным ухілам. Аддаючы туды сына, бацькі былі ўпэўненыя, што ў будучыні Андрэй стане вялікім матэматыкам, у крайнім выпадку, архітэктарам. Андрэйка, праўда, такую ўпэўненасць нічым не падмацоўвае, бо носіць у дзённіку па матэматыцы выключна «пяцёркі» з «шасцёркамі». Рызыкну меркаваць, што, акрамя футбола, хлопчыка пакуль нічога не захапляе, і прымусовыя заняткі з рэпетытарам для яго — сапраўдная катарга.**

Я яму шчыра спачуваю, бо некалі і сама на працягу двух гадоў займалася з рэпетытарам, удасканальвала веды па замежнай мове, хоць і да таго мела нядрэнныя поспехі па любімым прадмеце. Але ж хацелася ведаць яго не горш за тых аднакласнікаў, якія займаліся з так званымі «хатнімі педагогамі». Не раз чула ад сяброў, што з дапамогай рэпетытара лягчэй спраўляцца з хатнімі заданнямі і што гэта значна эканоміць час. Рэпетытар падкажа, якую тэму трэба «падцягнуць» у першую чаргу, якія дапаможнікі неабходна падабраць, падрыхтуе да здачы цэнтралізаванага тэсціравання.

Сапраўды, я хутка пачала атрымліваць выдатныя адзнакі за хатнія заданні. Усё ж такі рыхтавала іх пад наглядам «пільнага вока». Разам з тым адзнакі за кантрольныя і самастойныя работы ў класе пачалі непрыемна здзіўляць і мяне, і бацькоў: з дзявятак я паступова «з'ехала» на васьмёркі і сямёркі. Не ведаю, што было б далей, але мой рэпетытар раптоўна пераехаў у іншы горад. Вось тады я адчула, што развучылася самастойна рыхтавацца да прадмета. І прыйшла да высновы: якім бы добрым ні быў рэпетытар, трэба праяўляць уласную ініцыятыву, не губляць жаданне вывучаць той ці іншы прадмет. На сямейнай радзе было вырашана: новага «хатняга настаўніка» не наймаць. Можаце не верыць, але сёння па англійскай мове я атрымліваю толькі дзявяткі і дзясяткі!

Сярод маіх аднагодкаў ёсць такія, у якіх па 3-4 рэпетытары па розных прадметах. І што вы думаеце? Іх паспяховасць, так бы мовіць, пакідае жадаць лепшага. Атрымліваецца, бацькі дзеля любімага чада выдаткоўваюць з сямейнага бюджэту немалыя грошы, «хатнія педагогі» старанна адпрацоўваюць свой заробак, а ў самога вучня... няма ніякага імкнення да вучобы. Вось і вынік: пра выдатныя адзнакі можна толькі марыць. Пра такіх нават жарт існуе: «Па выніках года «Лепшым настаўнікам» ізноў прызнаная... бацькоўская папруга са спражкай!».

Жарты жартамі, а ЦТ усім здаваць давядзецца. Што датычыцца матэматыкі і фізікі, то, як кажа адзін з аднакласнікаў, я наведваю рэпетытара, каб навучыцца рашаць задачы не толькі правільна, але і хутка. І сапраўды, тыя, хто скончыў школу гадоў 15-20 таму, сцвярджаюць, што ранейшы ўзровень патрабаванняў да абітурыентаў непараўнальны з сённяшнім. На ўступных экзаменах, як сведчаць і мае бацькі, па той жа фізіцы не рашалі такіх складаных задач, як цяпер. Сёння ж на ўступных выпрабаваннях паявілічылася не толькі колькасць задач, але і скараціўся час, адведзены на іх рашэнне. Так, у сярэдзіне 1990-х гадоў 12 задач прапаноўвалася рашыць за 4 гадзіны, а сёння, па словах знаёмага студэнта-першакурсніка, 30 задач — за 3 гадзіны.

Існуе таксама меркаванне, што заданні ЦТ моцна адрозніваюцца ад таго, што праходзяць па школьнай праграме. Значыць, без рэпетытара ўсё ж такі не абысціся? Прынамсі, і час прад'яўляе новаму паколенню іншыя патрабаванні. Навука па ўсіх напрамках робіць значныя крокі наперад. А значыць, ставіцца да вучобы абы-як сёння не тое што соромна — проста нямодна.

А цяпер падрабязней пра сямейны бюджэт. Уявім, што рэпетытар у цябе — не з самых «дарагіх», адзін акадэмічны ўрок каштуе бацькам 15 долараў. Табе трэба «падцягнуць» англійскую і беларускую мовы, прычым, заняткі праводзяцца двойчы на тыдні. У месяц атрымліваецца... 240 долараў, а за навучальны год, або 9 месяцаў — 2160! Бацькі, вядома, гатовыя аддаць любыя грошы за выдатны вынік, але ніякія фінансавыя ахвяраванні яго, на жаль, не гарантуюць...

Ёсць і такія варыянты ўдасканалення школьных ведаў як факультатывы, курсы пры ліцэях і вышэйшых навучальных установах. А нядаўна я даведалася, што вучоныя распрацавалі электронны рэпетытар. Спецыялісты сцвярджаюць, што гэты вынаходніцкі цуд можа замяніць традыцыйнага «хатняга настаўніка» і, што не менш важна, не так моцна ўдарыць па бацькоўскай кішэні.

Выбіраючы рэпетытара як сродак падрыхтоўкі да ЦТ, вучні і іх бацькі забываюцца на галоўнае: у вышэйшай навучальнай установе ўсё давядзецца рабіць самому. А калі і там трымацца за заліковую кніжку дзякуючы аб'явам кшталту «раблю курсавыя, дыпломныя... танна!», глядзіце, каб і пасля атрымання дыплома не давялося шукаць рэпетытара.

**Вольга ЗАХАРАВА.**

## 300-ГАДОВЫ ШЛЯХ НОВАДЗЯВЯТКАВІЦКАЙ ШКОЛЫ ЗАНЯЎ ПЕРШАЕ МЕСЦА Ў РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АКЦЫІ «ЖЫВУ Ў БЕЛАРУСІ І ТЫМ ГАНАРУСЯ»

**З Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь прыйшло паведамленне пра тое, што летапіс Новадзявяткавіцкай сярэдняй школы Слонімскага раёна заняў першае месца ў рэспубліканскай акцыі навучэнскай моладзі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» настаўнікаў гэтай школы Васіля і Таццяны Ракуцяў.**

Шлях да перамогі быў нялёгкі і досыць працяглы. Дастаткова сказаць пра тое, што ў гэтым конкурсе бралі ўдзел не толькі агульнаадукацыйныя школы, але і іншыя тыпы навучальных устаноў нашай краіны. Перш чым перамагчы на рэспубліканскім узроўні, патрэбна было паспяхова прайсці тры папярэднія этапы гэтай акцыі: унутры ўласнай навучальнай установы, на раённым, а таксама абласным узроўнях. Але і гэта яшчэ не ўсё. Перамога ў акцыі на рэспубліканскім узроўні не дае права пачываць на лаўрах. Перамогу неабходна замацаваць. Для гэтага патрэбна падрыхтаваць абарону конкурснай работы з мультымедыйнай прэзентацыяй і выступіць з ёю на абласной і рэспубліканскай канферэнцыях, якія адбудуцца 20 лістапада ў Гродне і ў снежні ў Мінску.

Перамога — гэта не толькі вынік працы настаўнікаў гэтай школы Васіля і Таццяны Ракуцяў, якія з'яўляюцца аўтарамі, навуковымі кіраўнікамі і рэдактарамі праекта, але таксама многіх настаўнікаў, вучняў школы і яе выпускнікоў. З поўнай упэўненасцю можна лічыць летапіс школы вынікам працы вялікай колькасці людзей, якія даследавалі архіўныя дакументы, збіралі ўспаміны старажылаў і выпускнікоў школы, рыхтавалі ілюстрацыйны матэрыял, ажыццяўлялі камп'ютарны набор тэксту.

Краязнаўчае даследаванне пад назвай «Трохсотгадовая гісторыя развіцця адукацыі ў мікрараёне Новадзявяткавіцкай школы» ахоплівае перыяд з 1675 па 2009 год. Праца прысвечана 50-гадоваму юбілею школы, яе напісанне прыўрочана абвяшчэнню Прэзідэнтам РБ 2009 года Годам роднай зямлі.

**Сяргей ЧЫГРЫН.**

# СТЫЛІСТЫ ЧАСУ

**Вечная карцінка: гандлёвы цэнтр, мноства народу з пакупкамі, шум і заманлівасць, а пасярод гэтага ўсяго раздражнёная маці адцягвае сваё дзіця да выхаду, далей ад спакусы купіць што заўгодна, толькі б сын змоўк.**

— Дзіі-віі-дзіі! — пратэстуе хлопчык, назло сцягвае з галавы вушасценькую шапачку і кідае яе пад ногі. Трохгадовы малы відавочна быў нацэлены на сур'ёзны шопінг. Не склалася.

Хто разумее, пра што гаворка, той успомніць, які эфект даюць белыя калготкі ці новыя штаны, выпэцканыя аб падлогу ўнівермага, паход у які ўжо вось-вось гатовы бяздарна скончыцца без новай цацкі. Вяршыняй мар майго пакуль не вельмі далёкага дзяцінства была, напрыклад, касета з мульцікамі «Том і Джэры» (цяпер ката сапраўды шкада, а тады...) Эх, ліхія дзевяностыя! Што тут скажаш? Таксама страшэнна, якім непаважаным таварышам ты быў, калі не ўмеў збіраць пазл і не любіў аранжавую, падобную да ластыку жуйку «Мамба». Не ведаю, што было тады модным у асяродку хлопчыкаў, а вось дзяўчаты ад 10 да 18 любой ступені хадзілі ў ласінах. Леапардавых, ці з лялькай Барбі, каму як падабаецца. А па тэлевізары ішла перадача «Взгляд». Для дзіцячых розуму і вачэй там, зразумела, не было нічога, але ў памяці «галачка» засталася.

Цяпер гэта не проста настальгія. Узяць хоць бы папулярнасць вечарын у стылі дыскатэкі дзевяностых. Мудрыя рэкламшчыкі ўжо плённа працуюць з эпохай майго дзяцінства і актыўна эксплуатуюць яе прыкметы. Так у наш час, рана ці позна, усе жывыя атрыбуты культуры дзесяцігоддзя збіраюць, сартыруюць, прыхарошваюць, дадаюць пару легенд ці плётак — і ўспаміны ператвараюцца ў брэнд. Старыя музычны альбом з папулярнай музыкай яшчэ прынясе вам карысць. Не верыце? Пакладзіце яго ў самую глыбокую скрынку да канца дзесяцігоддзя, а пасля дастаньце і карыстайцеся тым, што навакольныя тут жа кінуцца ў цёплыя ўспаміны. Падобным прынцыпам заўжды карысталася мая знаёмая, якая вельмі стыльна апраналася і праз гэта мела шмат кампліментаў.

— А вось надакучыць вам рэч, — гаварыла яна, — разжывіцеся дзе-небудзь вялікім куфарам і пакладзіце на самае дно ўсё, што не збіраецеся насіць. Калі скрыня поўная — смела пераварочвайце яе ўверх дном. Дастанеце тое, чаму ўсе будуць зайздросціць.

Знаёмай было за пяцьдзясят, ёй цудоўна падыходзілі рэчы часоў яе трыццацігоддзя, прычым яны арганічна глядзеліся і ў спалучэнні з сучасным адзеннем.

Мода вяртаецца, але хто фарміруе гэты працэс? Дзе і як афармляецца твар таго ці іншага адрэзку часу, які пасля менавіта такім застанецца ва ўспрыняцці людзей? Сумна думаць, што гэта зубастыя трагладыты рэкламнага бізнэсу, бо якасць успамінаў кожнага чалавека ў такім выпадку набывае аднолькавы смак, пазбаўлены момантаў, на якіх нельга зарабіць. Дзевяностыя я памятаю крыху па-іншаму, не зусім адпаведна таму вобразу, што прапануецца, імідж першых 10 год XXI стагоддзя пакуль не магу сабе ўявіць. Можа, над ім яшчэ не працавалі, як трэба? Цікава, а як будзе выглядаць час сённяшні вачыма тых, хто ў тры гады ўмее карыстацца DVD-прайгравальнікам і глядзіць мульцікі ў фармаце 3D? Пабачым год гэтак праз дзесяць. Галоўнае — каб людзі запомнілі ўсё так, як ёсць насамрэч, пакуль гэты час не стаў праектам пад чарнавой назвай «дзясятыя».

**Ганна ГАРУСТОВІЧ, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.
Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292-44-12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

# Ад «Дудкі беларускай» да думак пра Беларусь

## Філосаф Валянцін Акудовіч разважае пра тое, што істотна для беларускасці

**БЕЛАРУСЬ, пра якую мы марым, і Беларусь, якую мы маем... Безумоўна, у марах заўсёды ўсё больш дасканала і прыгожа. А можа, для таго мары і патрэбныя, каб было да чаго імкнуцца? Мары пра незалежную Беларусь, напрыклад, напрыканцы яшчэ XIX стагоддзя, адыгралі сваю вялікую ролю ў тым, што спарадзілі магутную плынь у літаратуры: за Багушэвічам прыйшлі Багдановіч, Купала, Колас... Асобы, якія жылі з гэтымі думкамі, стваралі з гэтымі марамі на мове, якую з гонарам назвалі сваёй роднай, неслі беларускі дух у сваіх творах. Нашы класікі. Мы вывучаем іх творы, вучым на памяць, пішам па іх сачыненні ў школе. Мы жывем у незалежнай Беларусі — можна лічыць, што галоўная мара нашых класікаў літаратуры, гісторыкаў, іншых выдатных асоб збылася. Праўда, не ўсё адразу, тут можна ўзгадаць словы з адной песні, папулярнай у 90-я гады: «...І дойдзем мы да Беларусі»... Узгадала гэтую песню зараз, калі паспрабавала ўявіць, якія сцежкі-дарожкі вядуць да канцавога пункта (якім яго ўяўлялі дзесяткі нацыянальнага адраджэння пачатку мінулага стагоддзя), і колькі яшчэ засталося да яго. Думкі гэтыя ўва мне справакаваў беларускі філосаф Валянцін АКУДОВІЧ, які выказаў меркаванне, што «этнакультурная канцэпцыя» фарміравання беларускай нацыі не павінна быць базавай стратэгіяй. Гэта тая самая канцэпцыя, якая лічылася галоўнай усё мінулае стагоддзе, і зараз яшчэ вельмі многімі, напэўна, уяўляецца адзінай магчымай. Прынамсі, а як інакш?.. Па тлумачэнні я звярнулася да Валянціна Акудовіча.**

***— Спадар Акудовіч, я беларуска, і мае бацькі беларусы, такімі сябе лічылі і лічаць. І паводле перапісу, зусім не мала тых, хто называе сябе беларусам. А ці лічыце сябе беларусам вы? Калі так, то чаму, на вашу думку, «этнакультурная канцэпцыя» нядзейсная? Напэўна, знойдуцца тыя, хто захоча з вамі спрачацца. Але найперш усё ж хочацца зразумець, што вы маеце на ўвазе.***

— Я не лічу сябе беларусам, я ім ёсць. І не толькі таму, што мае бацькі беларусы, і тым болей не таму, што маю беларускае грамадзянства. Для мяне быць — гэта быць беларусам, а ва ўсякім іншым спосабе быцця я быў бы некім, хто толькі нагадваў бы мяне. І гэта не тэарэтычная прыдумка — па сабе ведаю з жыцця за Саветамі. Таму ў беларускасці для мяне істотнае ўсё: і Беларусь як цэлае, і кожны яе асобны складнік — ад гісторыі і ментальнасці да незалежнасці краіны і мовы. Асабліва значныя апошнія два моманты. Без сваёй краіны я быў бы толькі аблачынай у чужым небе, а без сваёй мовы не сябе б выказваў, а фікцыю з прозвішчам Акудовіч. Але гэткае татальнае знітаванне з усім беларускім калі і не выключэнне, дык і далёка не норма ў нашым грамадстве. Больш за тое, амаль ніхто з шараговых беларусаў нават не шкадуе, што ў ягоным жыцці ды лёсе беларускасці як кот наплакаў. З гэтага відавочнага факта і паўстаў мой трывожны недавер да «этнакультурнай» канцэпцыі.

***— Больш за 100 гадоў беларуская эліта імкнулася ўвесці ў жыццё менавіта «этнакультурную канцэпцыю». Яна была дамінуючай усё мінулае стагоддзе і лягла ў аснову будаўніцтва беларускай дзяржавы ў 90-я гады. Дзяржава ёсць, мала таго, словы «Беларусь» і «беларусы» гучаць сёння ці не часцей за якія іншыя. Здавалася б — вось канцэпцыя і панае. І ў гэты час вы кажаце адваротнае. Што вас прывяло да такой думкі?***

— Найбольш поўна першым гэтую канцэпцыю сфармуляваў Францішак Багушэвіч у геніяльнай прадмове да «Дудкі Беларускай». Гэта там прагучала знакамітае «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі», гэта там ён зрабіў шага акрэсліў арэал бытавання беларусаў (межы сваёй краіны) і нагадаў пра гістарычную пераемнасць з Вялікім Княствам Літоўскім. І што яшчэ вельмі істотна, заклікаў беларусаў (тады пераважна сялян) да адказнасці за сваю Бацькаўшчыну і веры ў яе будучыню. Але канчаткова нацыянальны канон сфарміраваўся нават не ў пару БНР, а на эміграцыі, куды ў мноства з'ехалі лідары нацыянальнага руху пасля прыходу да ўлады бальшавікоў. Адтуль гэты канон і быў экспартаваны ў Беларусь напрыканцы 80-х (XX ст.), дзе праз шырокі нацыянальна-дэмакратычны рух адыграў прыкметную ролю на пачатку сталення незалежнай Дзяржавы. Аднак энергетыкі этнакультурнай ідэі хопіць ненадоўга, неўзабаве яна адсунецца на маргіналію як палітычнага, так і культурнага жыцця. Вось тады я і пачаў думаць: у чым тут справа? Чаму больш як за стагоддзе ў самых розных гістарычных варунках «этнакультурная» канцэпцыя не змагла выявіцца і замацавацца на Беларусі ні ў рэальных практыках, ні хаця б у свядомасці большасці яе грамадзян?

***— Калі канцэпцыя нядзейсная, то ў чым? Пэўныя праблемы і перашкоды ў яе ажыццяўленні былі ва ўсе часы. Менавіта зараз, напэўна, не самы горшы час. Усё меней людзей, якія ставяць пад сумнеў беларускую дзяржаўнасць як такую. І, здаецца, яшчэ трошкі-трошкі — і ўсё пойдзе... Прынамсі, ёсць магчымасць атрымаць гістарычныя веды пра вытокі нашай дзяржаўнасці, а не толькі пра жыццё ў СССР. Сумнявацца ў адметнасці беларускай культуры ўжо лічыцца дрэнным тонам. Вядома, існуе праблема пераемнасці традыцый, у тым ліку моўных. Але, магчыма, гэта толькі падстава для таго, каб змяніць падыходы, інакш кажучы, тактыку іх захавання?***

— Найперш заўважу, што на пару паўстання нацый «этнакультурная» канцэпцыя дамінавала ва ўсёй Усходняй Еўропе, і таму беларусы нават не думалі пра нешта іншае. Але захапіўшыся ёю, ідэолагі айчыннага нацыяналізму не ўлічылі, што нашы людзі тады імкнуліся не беларусамі, а «людзьмі звацца» (Я. Купала). Запакаваныя на 90% у вёску беларусы калі пра што на тую пару і марылі, дык гэта змяніць свой статус чалавека каля быдла хаця б на статус чалавека каля якой механічнай прылады. І што ім было да іхняй мовы бядоты і культуры нішчымніцы? А беларускі горад (як і мястэчка) не мог прыняць «этнакультурную» канцэпцыю таму, што на 80% быў небеларускім. У сярэднім 50% яго насельніцтва складалі габрэі, затым рускія, палякі — і толькі ў астачы туліліся беларусы. Таму ва Устаўных граматах Беларускай народнай рэспублікі ад «этнакультурнай» канцэпцыі застаецца адно геапалітычная пазіцыя: «Беларусь у яе этнаграфічных межах». Калі заўгодна, канстытуцыя БНР куды бліжэй да канцэпцыі «грамадзянскай нацыі» (пра што кажа хаця б роўнасць моў), чым «этнакультурнай». Значнасць апошняй вярнула эміграцыя, якая за мяжой дзесяцігоддзямі шліфавала яе на паперы, зусім не дбаючы пра тое, ці можа яна хоць калі прыдацца да сацыяльна-палітычнай і культурнай рэальнасці Беларусі. Як паказалі 90-я (XX ст.) — можа, аднак толькі для палітычных маніфестацый, а не для таго, каб легчы ў аснову Незалежнай беларускай дзяржавы.

***— Амаль што ўсе былыя савецкія рэспублікі пасля распаду СССР узялі за аснову дзяржаўнага будаўніцтва менавіта такую канцэпцыю, магчыма, за выключэннем шматнацыянальнай Расіі. Значыць, гэтая канцэпцыя яшчэ сябе не вычарпала. А мы, беларусы, звычайна запаволеныя, спазняемся. Мы яшчэ не паспелі ўсвядоміць сябе як след, не асэнсавалі сваю дзяржаўнасць. Але ці магчыма ад гэтага шляху адмовіцца наогул?***

— Магчыма — бо гэта не шлях, а скокі (цягам стагоддзя) на адным месцы ды яшчэ на адной назе. Мне добра зразумела, чаму нацыянальна заангажаваны беларус трымаецца «этнакультурнай» канцэпцыі, бо я нутром такі ж самы. Але калі столькі часу нічога ў нас не атрымліваецца, дык, можа, час агледзецца па баках? У свеце існуе мноства самых розных схем нацыябудаўніцтва. Дзеля прыкладу я люблю згадваць нацыі Паўднёвай Амерыкі, якія паўставалі не на мясцовых этнасах і не на іхняй культуры ды мове, а на «крэольскім» складніку, гэта значыць, з энергіі ды мясцовага патрыятызму нашчадкаў тых гішпанцаў, што калісьці скаланізавалі гэты кантынент. Хапае і куды больш экзатычных прыкладаў, але што нам да іх? Бо, лічы, побач з намі была рэалізаваная ідэя, якая знаходзіцца ў наўпроставай апазіцыі «этнакультурнай», а менавіта канцэпцыя «грамадзянскай нацыі». Калі казаць у двух словах, дык сутнасць яе даволі простая: ёсць Дзяржава, ёсць яе грамадзяне і ёсць агульны для ўсіх Закон, якому ўсе аднолькава падпарадкоўваюцца. І тут не мае вырашальнага значэння этнічнае паходжанне, культурны канон, мова, гістарычны чыннік і да т.п. Аўтарства гэтай канцэпцыі належыць Францыі (хоць, бадай, найбольш выразна яна праявілася ў ЗША). Для Беларусі, якая ніколі не была манархічнай, манакультурнай, монамоўнай і г.д., нават з гледзішча гістарычнай рэтраспектывы такая схема нацыянальнага ўладкавання, здаецца, падыходзіць як найлепей. Прынамсі, мне так уяўляецца.

***— У сённяшнім свеце мы бачым прыклады дзяржаў, для якіх гэтая канцэпцыя наогул не актуальная (гэтаму спрыяюць працэсы глабалізацыі — узаемапранікненне культур, міграцыя і г.д.). Але Беларусь працягвае заставацца пераважна монаэтнічнай краінай, хоць ёсць тут розныя дыяспары, аднак іх роля ў грамадскіх працэсах не такая значная, як у іншых краінах Еўропы. Ці не прывядзе змена прыярытэтаў у дзяржаўным будаўніцтве ў сучасных умовах наогул да страты свайго твару? І як вынік — больш лёгкай страты суверэнітэту?***

— Наперад ніхто не ведае, што знікне, а што застанецца. Яшчэ стагоддзе назад непарушнасць вялікіх імперый здавалася вечнай. А дзе яны цяпер? Але мы трохі пра іншае... Той інтэлектуальны непакой, які вярэдзіць мяне цягам ужо многіх гадоў, якраз і паходзіць з таго, што «свой твар» мы так і не набылі — ды і ў перспектыве ягоныя абрысы не асабліва праглядваюцца. Між іншым, якраз з гэтага і паўстала задумка, што, можа, мы хочам убачыць сябе не такімі, якімі ёсць насамрэч? Мае пошукі — гэта пошукі тоеснасці паміж Беларуссю ўяўнай і рэальнай, паміж той, якую нам прыдумалі ідэолагі, і той, якая існуе сама ў сабе і сама па сабе. Магчыма, па мерках «этнакультурнай» канцэпцыі Беларусь, якая яна ёсць, і мала чаго вартая, але што нам больш істотна: нашыя нацыянал-патрыятычныя трызненні ці сама Беларусь? Як мне ўяўляецца, канцэпцыя «грамадзянскай нацыі» якраз і дазволіць нязмушана вывіцца ўсім адпаведнасцям паміж Беларуссю ўяўнай і рэальнай.

***— Калі не на падставе культурнай адметнасці, то на падставе чаго, на вашу думку, можа трымацца беларуская дзяржаўнасць у сённяшнім свеце, які вельмі шпарка мяняецца і мяняе людзей?***

— Беларусы як трымаліся раней, так і надалей будуць трымацца сваёй зямлёй, у палітычнай мове — тэрыторыяй. Невыпадкова самы геніяльны твор беларускай літаратуры мае назву «Новая зямля» (Я. Колас). Але мне тут найперш надзвычай важна сказаць пра «культурныя адметнасці». Чамусьці многія лічаць, што, аддаючы перавагу канцэпцыі «грамадзянскай нацыі», я адмаўляю этнакультурныя каштоўнасці. Але ж гэта суцэльная аблуда. Нацыянальныя каштоўнасці гісторыі, культуры, мовы, светагляду і да т.п. застаюцца тымі самымі каштоўнасцямі, што і ў «этнакультурнай» канцэпцыі. У гэтым сэнсе адзіная змена (што праўда, радыкальная) — змена ролі гэтых каштоўнасцяў. У такім выпадку нацыя фарміруецца (і абапіраецца) не на іх, яны толькі напаўняюць форму сваім адметным зместам і ў аб'ёме таго патэнцыялу, які рэальна маюць. І я не схільны думаць, што ў гэткім тыпе Дзяржавы беларускасці будзе менш, чым, прынамсі, цяпер. Хутчэй наадварот. Але гэта будзе залежаць ад саміх беларусаў, ад таго, наколькі яны будуць лічыць нацыянальныя каштоўнасці насамрэч каштоўнымі для сябе.

*Усе роздумы Валянціна Акудовіча над гэтай праблемай сканцэнтраваныя ў яго кнізе «Код адсутнасці» (выд. «Логвінаў», 2007). Калі некага зацікавілі гэтыя развагі, дык праз кнігу можна пазнаёміцца з разуменнем аўтарам беларускай сітуацыі больш поўна і грунтоўна. «Код адсутнасці» перакладзены на літоўскую і рускую мовы.*

**Падрыхтавала Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ДАХ НАШАЙ ХАТЫ

● Кладкай бэлек і трынаццатага вянка завяршалася ўзвядзенне зруба. Пасля гэтага пераходзілі да заключнага этапа будаўніцтву хаты — узвядзення даху.

● Калі ніжняя сфера праз выкананне шматлікіх абрадаў злучала дамачадцаў са сваімі продкамі, то верхняя сфера належала багам.

● Узвядзенне даху паказвала на тое, што будаўніцтва хаты завершанае. Яно канчаткова ўпарадкоўвала структуру жылля і вызначала межы чалавечай светабудовы.

● Верхняя частка хаты мела шэраг прамых адпаведнасцяў чалавечаму целу. Франтон хаты рускіх атрымаў назву лоб, лбішча, залобнік; сярод беларусаў яго звалі чало. Зачосаныя канцы самага верхняга бервяна зруба звалі вусы. У Беларусі дагэтуль існуюць дзве формы даху — двухсхільная і адна з найстаражытнейшых — чатырохсхільная, яе завуць чубам. Верхняе рабро даху звалася канёк ці князёк.

● Чаму адбылося так, што малюнак галавы каня, а не, напрыклад, птушкі завяршаў будаўніцтва хаты? Прычын таму некалькі. Па-першае, конь быў адным з самых блізкіх памагатых чалавека; па-другое, конскую галаву прыносілі ў ахвяру духу новай хаты: яе закопвалі пад парогам. Нарэшце, па-трэцяе, у міфалогіі, а потым і ў чароўных казках менавіта конь выконваў ролю Вялікай Птушкі Часу і вокамгненна мог перанесці героя з аднаго царства ў другое. Відавочна, менавіта таму будаўніцтва хаты завяршалі кладкай драўлянай статуі конскай галавы.

● Па заканчэнні будаўніцтва даху гаспадары накрывалі багаты святочны стол, за які запрашалі цесляроў, сваякоў і суседзяў.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА С УСЛОВИЕМ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

| | |
|---|---|
| **ЛОТ № 1** | |
| **Адрес объекта и его наименование** | - Земельный участок под строительство торгового павильона № 1, расположенного по адресу: Минская область, к.п. Нарочь, ул. Ленинская площадью 0,0219 га (кадастровый номер 624056300001000305). **Начальная цена 4 927 500 рублей. Срок аренды – 99 лет.** Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены. |
| **ЛОТ № 2** | |
| **Адрес объекта и его наименование** | - Земельный участок под строительство торгового павильона № 2, расположенного по адресу: Минская область, к.п. Нарочь, ул. Ленинская площадью 0,0114 га (кадастровый номер 624056300001000306). **Начальная цена 2 565 000 рублей. Срок аренды – 99 лет.** Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены. |
| **ЛОТ № 3** | |
| **Адрес объекта и его наименование** | - Земельный участок под строительство торгового павильона № 3, расположенного по адресу: Минская область, к.п. Нарочь, ул. Ленинская площадью 0,0100 га (кадастровый номер 624056300001000307). **Начальная цена 2 250 000 рублей. Срок аренды – 99 лет.** Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены. |
| **Порядок оплаты** | Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с формированием земельного участка и его государственной регистрацией. Расходы, связанные с потерями сельскохозяйственного производства. Расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и объявления в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 20-ти рабочих дней со дня получения протокола аукциона. |
| **Продавец** | Мядельский районный исполнительный комитет |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенная банком копия платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **11.01.2011 г. до 16.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20, 8 044 710 74 60 |
| **Дата, время и место аукциона** | **14.01.2011 г. в 14.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис» |

# ЛАЗАР БОГША XXI СТАГОДДЗЯ, альбо Калі рамяство становіцца мастацтвам

Ён — чалавек просты і сціплы з выгляду, зямны і дабрадушны. Так адразу і не скажаш, што гэта той самы вядомы майстар, які з 1993 па 1997 гг. адрадзіў Крыж Еўфрасінні Полацкай, (а пасля стаўратэку для крыжа і раку святой), і пра якога напісана нават у школьных падручніках па гісторыі Беларусі. І хоць Мікалай Кузьміч мае безліч ганаровых званняў і ўзнагарод, ды ўсё ж у размове трымаецца па-свойску: жартуе, уздымае надзённыя прафесійныя і чалавечыя праблемы.

Днямі ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску адбылося адкрыццё выставы Мікалая Кузьміча «Ювелірыка», якая будзе працаваць да 15 студзеня. Назву, дарэчы, прыдумаў пісьменнік Уладзімір Арлоў, даўні сябар мастака-ювеліра і эмальера. Аб'ядноўвае іх Полацкая зямля, якая для Уладзіміра Арлова — малая радзіма, а для Мікалая Кузьміча — творчы лёс. Зараз ён працуе над лампадамі для полацкага манастыра.

«Ювелірыка» — назва недарэмная. Каля 140 адзінак ювелірных вырабаў Мікалая Кузьміча — гэта сапраўды паэзія. Брошкі, падвескі, завушніцы, шпількі, абразкі і эмалі маюць такую вытанчаную форму і колер, такія эмацыйныя душэўныя назвы, што ўспрымаць іх утылітарна — проста як аксесуары, дэкаратыўныя аб'екты — немагчыма. «Успамін пра вясёлку» — серыя вясёлых стракатых эмаляў; «Рэха стагоддзяў» — стыльныя падвескі, стылізаваныя пад даўніну; падвескі «Вырай» — сінія-сінія і з чароўнымі птушачкамі, дарэчы, улюбёнымі элементамі майстра; эмалі, прысвечаныя Грунвальдскай бітве і прыродзе роднай зямлі... Думаю, любая прыгажуня была б рада займець у сваёй калекцыі каштоўнасцяў такую вось аўтарскую мастацкую працу. Толькі за ўпрыгожаннямі самага славутага беларускага ювеліра чэргі, як ён сказаў, чамусьці не стаяць... Чаму?

— У Беларусі няма арт-рынку, — лічыць майстар. — А ў такіх умовах вельмі складана сфарміраваць нашы з пакупніком стасункі...

Аднаўленне Крыжа Еўфрасінні Полацкай — гэта тая наканаванасць, якая звязала Мікалая Кузьміча са старажытнай візантыйскай перагародчатай эмаллю. Майстар адрадзіў гэтую складаную тэхніку XII стагоддзя, якая раней была тэхнікай вырабаў выключна для першых асобаў у дзяржаве. Сёння мастак стварае ў гэтай тэхніцы свае ўласныя працы. Але па шэрагу прычын ён, на жаль, не мае магчымасцяў перадаваць іншым свае ўнікальныя веды. Веды, гэтыя, дарэчы, дасталіся майстру не проста так. Ён доўга не мог разгадаць загадку старадаўняй тэхнікі: сучаснымі тэхналогіямі падчас працы над Крыжам ён карыстацца не меў права, таму шукаў рэцэпт тэхнікі сам эксперыментальным шляхам. Веды прыйшлі раптоўна і загадкава: у сне.

**— Падчас працы над Крыжам Еўфрасінні Полацкай вы нават хадзілі ў паломніцтва ў Святую зямлю. Праца над Крыжам неяк змяніла вашае жыццё?**

— Я не магу сказаць, як яна змяніла маё жыццё... Здаецца, як жыў, так і жыву. Я сам з веруючай сям'і, мая маці была верніцай. Кожны чалавек імкнецца стаць больш чыстым і добрым, не рабіць дрэнных учынкаў — я ў гэтым толькі ўмацаваўся.

**— Чым складаная тэхніка візантыйскай эмалі?**

— Самая галоўная складанасць — гэта тое, што няма пераемнасці, школа страчана. Была пераемнасць традыцый у III, IV, VII, XII стагоддзях, а потым знікла... Цяпер, вядома, для мяне гэтая складанасць ужо неактуальная. У тэхніцы гарачых эмаляў я працую 15 гадоў. Але калі я пачынаў працу над Крыжам у 1993 годзе, было вельмі складана. Наогул, часы былі страшныя. Тады ж яшчэ за дачыненні да рэлігіі і за краты маглі пасадзіць...

**— Ці перадаяце вы каму-небудзь сваё майстэрства?**

— Ювеліраў вельмі шмат. У кожным раённым цэнтры ёсць ювелір. Бо гэта рамесная праца. Але складаную тэхніку старажытнай візантыйскай перагародчатай эмалі я не магу нікому перадаць, на жаль... Бо для гэтага патрэбна заканадаўчая база. А яе няма. Я жыву ў Брэсце і працую з каштоўнымі металамі як індывідуальны прадпрымальнік. Па нашым заканадаўстве я не магу сабе ўзяць ніякага наёмнага чалавека ў «чалядзінкі», так сказаць, каб навучыць яго сваёй тэхніцы.

**— Вас натхняе беларуская прырода?**

— Рэч нават не ў прыродзе, а ў стане, які ты перажываеш, дапусцім, улетку: навальніца, спякота. Усе мае працы — гэта стан маёй душы: тое, што адчуваю, тое і ствараю.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**
**На фота: брошка.**
**Старажытная візантыйская эмаль. 2002.**

## Тавар згарэў разам з павільёнам

На гандлёвы павільён з дзіцячым адзеннем, які належыць прыватнаму прадпрымальніку ў гарадскім пасёлку Сасновы Бор Светлагорскага раёна, спакусіўся невядомы зламыснік. Ад пабудовы практычна нічога не засталося. А вось цэх у гомельскім прыватным унітарным прадпрыемстве «Святлатэхніка», які гарэў у панядзелак раніцай, выратавальнікі патушылі хутка. У выніку пажару пашкоджана 20 квадратных метраў шыфернага даху і станок. На момант пажару людзей у памяшканні не было.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 23 декабря 2010 г. в 15.00 СОСТОЯТСЯ повторные ОТКРЫТЫЕ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ по продаже незавершенного строительством комплекса зданий и сооружений, расположенного в г. Бобруйске по ул. Энергетиков, 5 в составе Лота № 1 (предмет торгов):**

| | |
|---|---|
| **Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным № 710/U-3795 (здание административно-бытового корпуса) общ. пл. 1941,8 кв.м; незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным № 710/U-3797 (здание вспомогательного корпуса) общ. пл. 2776,3 кв.м; незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным № 710/U-3796 (здание производственного корпуса) общ. пл. 5386,0 кв.м; незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным № 710/U-3798 (здание заправочной станции) общ. пл. 87,4 кв.м.** | |
| **Продавец (собственник)** | **Открытое акционерное общество «Белшина», УНП 700016217** |
| **Организатор торгов** | **Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509** (р/с 3012035310012 в ф-ле ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331) |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | **г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»** |
| **Начальная цена продажи** | **2 990 735 084 рубля без учета НДС; размер задатка 5 %, что составляет 149 536 754 рубля** |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа ОАО «Белшина» – р/с 3012000003446 в ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700016217, ОКПО 147621337000** |
| **Информация о зем. участке** | **Площадь – 5,9884 га,** кадастровый номер 741000000001000017, правовой режим – пост. пользование |
| **Характеристика предмета торгов** | |
| В состав незавершенного строительством комплекса зданий и сооружений также входят капитальные затраты на устройство очистных сооружений (литер 5Б пл. 14,67 кв.м и литер 4Б пл. 14,78 кв.м), ограждения ж/бет пл. 2244 кв.м с воротами металлическими пл. 12,6 кв.м, покрытия бетонного пл. 2550 кв.м, резервуаров установки пожаротушения пл. 32,5 кв.м, грязеуловителей, внутриплощадочных тепловых сетей. Готовность строений составляет: здания административно-бытового корпуса – 42,6 %, здания вспомогательного корпуса – 55,6 %, здания производственного корпуса – 62,5 %, здания заправочной станции – 48 % | |
| **Условия продажи** | Аукцион без условий |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Срок и условия оплаты** | Определяются по согласованию Победителя торгов с Продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | **включительно по 22 декабря 2010 г. до 16.00** |
| ***Более подробная инф. об условиях участия в торгах, характеристиках предмета торгов, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» № 185 (26793) от 22.09.2010 г.** | |

**Получить дополнительную инф. о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

Жыллёшча

# ДЗЕ ПАВУЧЫЦЦА БЫЦЬ ДОМАКІРАЎНІКОМ?

## Якія ёсць магчымасці для навучання домакіраўнікоў жыллём у Беларусі, высвятляла Настасся ЗАНЬКО

Калі паспрабаваць забіць у інтэрнэт-пашукавік словазлучэнне «патрабуецца кіраўнік дома» ці «старшыня таварыства ўласнікаў» (у аб'явах розніцы паміж імі няма), то на вас вываліцца некалькі сотняў спасылак. Попыт на домакіраўнікоў досыць высокі. І па ацэнках спецыялістаў, праца ў гэтай сферы досыць перспектыўная. Таму што не за гарамі прыход рынкавых адносін у сферу жыллёва-камунальных паслуг. Ды і зараз добры домакіраўнік можа зарабляць вельмі і вельмі нядрэнна. Некаторыя вядуць некалькі дамоў (заробак у кожным можа складаць да двух мільёнаў). «Дзе ж атрымаць такую неблагую спецыяльнасць?» — спытаеце вы.

У сталіцы курсы для старшыні ТУ, ЖБК і ЖСПК праводзяцца ў дзяржаўным навучальным цэнтры «Жылкам», Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце, а таксама ў Беларускім інстытуце правазнаўства.

### «ЖЫЛКАМ» ПРАВОДЗІЦЬ КУРСЫ ЧАТЫРЫ ГАДЫ

Па словах **метадыста вышэйшай катэгорыі Марыны КАМІНСКАЙ,** менавіта Жылкам быў першым у распрацоўцы праграмы навучання старшыняў таварыстваў уласнікаў.

— Курсы мы праводзім з 2006 года. Звычайна яны ў нас праходзяць у чэрвені. Аднак у сувязі з выхадам указа № 538 мы арганізавалі дадатковыя курсы з 20 па 24 снежня. Каштаваць яны будуць 176 650 рублёў. Выкладчыкі — спецыялісты Міністэрства ЖКГ, Мінгарвыканкама, БНТУ і інш., а таксама вопытныя старшыні таварыстваў уласнікаў, — кажа спадарыня Камінская. — Зараз з 312 таварыстваў уласнікаў, што ў Мінску, запісалася чалавек 20. Многія казалі, што дорага, але такія меркаванні былі нават тады, калі курсы каштавалі 136 тыс.

### ВЫРАШАЦЬ КАНФЛІКТЫ З ЖЫЛЬЦАМІ НАВУЧЫЦЬ БНТУ

Першую групу на навучальныя курсы для домакіраўнікоў Інстытут павышэння кваліфікацыі БНТУ набраў тры гады таму. З таго часу і па сённяшні дзень яны карыстаюцца попытам.

— Мы рыхтуем не толькі старшынь таварыстваў уласнікаў, але і старшынь ЖБК, ЖБСК і ТУ, — расказвае **прафесар кафедры будаўніцтва і эксплуатацыі будынкаў факультэта «Будаўніцтва і нерухомасць» Яўген САПОЖНІКАЎ.** — У аснову нашага курса ўваходзіць юрыдычнае справаводства, канструкцыя будынкаў і збудаванняў, а таксама санітарныя ўмовы пражывання, энергазберагальныя тэхналогіі і экалогія, пытанні чысціні вады і г.д. Асобна надаецца ўвага спосабам вырашэння канфліктаў паміж жыхарамі.

Выкладчыкі — спецыялісты ўніверсітэта. У БНТУ ёсць два віды курсаў: тыднёвыя, якія тычацца толькі эксплуатацыі жылля, і пашыраныя двухтыднёвыя. Кошт першых складае 400-500 тыс. рублёў (у залежнасці ад велічыні групы), другіх — 700 тыс. рублёў. Пасля навучання выдаецца пасведчанне.

На курсы ў БНТУ, па словах прафесара Сапожнікава, у асноўным прыходзяць мэтанакіраваныя зацікаўленыя людзі.

— Хоць бывае кантынгент розны, — расказвае спадар Яўген. — Ведаеце, як у Ільфа і Пятрова: «Куды мне падацца? Ва ўпраўдомы». Таму і ідуць усе без разбору.

### ПАДАБРАЦЬ КАЛЕКТЫЎ ДАПАМОЖА ІНСТЫТУТ ПРАВАЗНАЎСТВА

Курсы, падобныя да БНТУ ёсць і ў Інстытуце правазнаўства.

— У асноўным гэта курсы па эксплуатацыі, пачынаючы з канструктыўных элементаў і заканчваючы заключэннем дамоў. Сюды ўваходзяць таксама кадравае справаводства і бухгалтарскі ўлік, а таксама спосабы і метады вырашэння канфліктаў паміж суседзямі, — кажа **каардынатар праекта Людміла КАРАБО.** — Таксама распрацаваны праграмы асобна для ЖБСК якія пачынаюць весці дом фактычна з «нуля». І для таварыства ўласнікаў, якія па факце прыходзяць у дом.

У ІБП ёсць розныя курсы ад трох дзён да 2 месяцаў. Кошт курсаў (50 гадзін) — 399 тыс. Семінары — ад 144 (аднадзённыя) да 380 (трохдзённыя).

— Мы выдаём сертыфікаты. Працуем таксама і з выканкамамі, і з забудоўшчыкамі, запрашаем практыкаў, каб яны падзяліліся сваім досведам, — кажа спадарыня Людміла.

— Попыт на такія курсы ёсць. Таму што кожны дом павінен стварыць сваё таварыства ўласнікаў. Са свайго ўласнага досведу магу сказаць, што кіраванне дамамі пачынае актыўна і цікава развівацца, — адзначае Людміла Карабо. — У перспектыве, думаю, будуць развівацца кіруючыя кампаніі. Таму што ўсё ж старшыня таварыства — больш грамадская пасада, а домам павінен займацца прафесіянал. Як мне падаецца, домакіраўнік — цікавая спецыяльнасць для актыўнай моладзі, а таксама для менеджараў, якія ў 40-45 гадоў засталіся без працы, але маюць уяўленне пра тое, як трэба арганізоўваць калектыў.

### А ШТО Ў РЭГІЁНАХ?

Пры Віцебскім тэхналагічным універсітэце курсы праводзіліся, як сведчыць сайт аблвыканкама, сёлета. Кошт за два тыдні навучання — 138 тысяч рублёў.

На сталай аснове адукацыйныя курсы праходзяць у Гомелі і Магілёве (навучальны камбінат ЖКГ праводзіць для ўсіх ахвотных спецыяльныя заняткі). Прычым, як паведамілі ў Гомельскім аблвыканкаме, асноўная маса старшыняў і бухгалтараў таварыстваў уласнікаў прайшла курсы ў 2008 годзе.

У Гродне рыхтаваць домакіраўнікоў пачнуць са студзеня наступнага года.

— Зараз распрацоўваецца 40-гадзінная навучальная праграма. Мы нават гатовыя ладзіць семінары і курсы ў Лідзе, Слоніме, — кажа **Уладзімір СІДАРЧУК, галоўны спецыяліст аддзела жыллёвай гаспадаркі ўпраўлення ЖКГ Гродзенскага аблвыканкама.** — Заняткі будуць праходзіць у другой палове дня, выкладчыкі — спецыялісты абласнога ўпраўлення ЖКГ Гродзенскага аблвыканкама. Мяркуецца, што навучанне будзе каштаваць каля Br210 тыс.

### ДАДАТКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ Ў ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

Атрымаць дадатковыя веды па кіраванні домам можна і ў грамадскіх арганізацыях.

У Віцебску дзейнічае асацыяцыя таварыстваў уласнікаў «Віцебская альтэрнатыва». У Мінску літаральна сёлета была зарэгістравана Міжнародная асацыяцыя кіраўнікоў нерухомасці. У бліжэйшы час запрацуе сайт, на якім можна знайсці ўсю неабходную інфармацыю.

У Беларусі дзейнічае ініцыятыва «Жыллёвая гаспадарка ва Усходняй Еўропе», якая фінансуецца Еўрасаюзам. На працягу двух апошніх гадоў дзякуючы гэтай ініцыятыве ў нашай краіне праходзіў праект «Жыллёвыя рэформы з удзелам насельніцтва». Падчас праекта ўсім зацікаўленым прапаноўвалася ўдзельнічаць у «круглых сталах», навучальных семінарах і г.д.

Карысную інфармацыю пра таварыствы ўласнікаў можна даведацца на сайтах:

**1.** ochag7.narod.ru/ — сайт таварыства ўласнікаў «Ачаг».

**2.** http://www.beldom.org/ — інтэрнэт-платформа «Жыві як гаспадар».

**3.** http://jildom.com/— інфармацыйная платформа «Жыллёвыя рэформы з удзелам насельніцтва».

**4.** http://vitalternativa.narod.ru/ — сайт асацыяцыі таварыстваў уласнікаў «Віцебская альтэрнатыва».

### ПОГЛЯД СПЕЦЫЯЛІСТА

**Генадзь КАЛЁНАЎ, старшыня таварыства ўласнікаў «Ачаг

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## Усміхнемся!

**Настаўнік матэматыкі з лёгкасцю выйграў у прэферанс трынаццатую зарплату і прэміяльныя ў настаўніка геаграфіі і па яго парадзе паехаў адпачыць у месцы з найпрыгажэйшай назвай. Але як высветлілася, глухія і прапашчыя.**

☺

Двое сяброў.

— Барыс, ты жанаты?

— Часова.

— Не зразумеў.

— Старэйшы брат у камандзіроўцы, і яго жонка пакуль замест яго лаецца на мяне...

☺

**Лепшая прафілактыка ад грыпу — часнок, ды і ў транспарце ехаць вальней.**

☺

Бацька ў школе.

— Ваш сын намаляваў на парце муху як жывую, і я адбіла аб яе руку.

— Гэта што, вось я, калі ў ваннай убачыў намаляванага кракадзіла, выбег праз намаляваныя дзверы...

☺

**Пельмені «Баярскія». Варыць у капелюшы, есці шпагай.**

☺

— Ты ў сваёй цешчы залаты зуб бачыў?

— Бачыў, нагоды не знайду.

☺

**Я некалькі дзён уціралa ў твар крэм ад маршчын. Скажыце, як цяпер пазбавіцца ад мазалёў на руках?**

**АДКАЗЫ**
**На СКАНВОРД**
**Па гарызанталі:**
«Панамушка». Конда. Уша. Вата. Уступ. Пл. Трос. Нара. Нага. Чэмпіянат. Крідас. Кай. Кніга. Атакама. Лат. Туз. Фраза. «Жыззань». Бар. Сабэа. Сна. Ложа. Тэрм. Акра. Муха. Запраўка. Нюх. Азон. Карова. Пліта. Гарнір. Перу. Туман. Лабан. Зфэс. «Шаўкунчык». Зфэс. Рамка. Ра вертыкалі: Зорка. Адат. Бровар. Лот. Бак. Наказ. Ата-ка. Жак. Адам. Нарыс. Тонік. Заз. Сарэса-та. Гай. Мулярж. Брас. Маэ. Адыта.

# Янка СІПАКОЎ
# З ДЗЁННІКА НАСТРОЮ

**Адкуль і куды, якія і колькі? І што гэта такое «адкуль»? І што гэта такое «колькі»? Хто мы ў свеце і куды ідзём? І галоўнае — навошта?**

А хораша, мусіць, птушцы. Адпіхнуцца ад зямлі, падскочыць, узмахнуць крыллем... Узляцець і сесці на самую тонкую, самую гнуткую галінку, вагацца разам з ёю, церушыць уніз ціхі снег і, схіліўшы набок галаву, радасна глядзець зверху, як людзі незласліва, з добраю ўсмешкаю атрасаюцца ад яго.

**Цішыня. Толькі чуваць, як варушыцца семя ў зямлі, як лопаюцца пупышкі ды ліпне цёплы, ласкавы ветрык да маладых, яшчэ клейкіх лісточкаў.**

Сонца адскоквае ад небасхілу, як плоскі каменьчык-пліска ад спакойнае вады.

**Ён кропельку расы мілуе... Закаханы!**

Усё мае мяжу, і толькі каханне, мусіць, бязмежнае.

**Кажуць, японскія гейшы лічылі, што цікавейшага занятку, чым дагляданне самой сябе, для жанчыны не існуе.**

«Юрик, покусай меня везде!» — словы з сучаснай песні.

**Што такое каханне? Некаторыя сцвярджаюць, што гэта тое, што ўзнікае паміж жанчынай і мужчынам да таго, пакуль яны яшчэ не пазнаёміліся.**

Як па часе мяняюцца нашы запатрабаванні!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пасляваенная мара: боты, гадзіннік, веласіпед. Затым: кеды, джынсы, магнітафон. Цяпер: загарадны катэдж, іншамарка, рахунак у банку.

**Недзе прачытаў, як у свеце здароўкаюцца людзі.**

**Егіпцяне, дзе вельмі горача, пытаюцца: «Ці добра вы пацееце?». Папуасы гавораць: «Дай я цябе абнюхаю». А манголы, жывёлаводы, хвалююцца: «Ці здаровая ваша скаціна?». У амерыканцаў жа самае папулярнае прывітанне: «Як твой бізнэс?». Хораша вітаюцца рускія: «Здравствуйте!». А хіба горшае наша вітанне: «Дзень добры!». Хай будзе добры дзень! Добрая раніца, добры вечар, добрая ноч, добры сон, добрая дарога, добрае жыццё!**

Амаль усе жанчыны свету настойліва рупяцца, каб найярчэй і найдаражэй упрыгожыць сябе, не заўсёды разумеючы, што самае дарагое ўпрыгажэнне ў свеце — яны самі.

**З размовы:**

**— Ну і што, што шкодна? Жыць жа таксама шкодна — ніхто не вытрымлівае, усе паміраюць. Аднак жа ўсе жывуць.**

У Старажытным Рыме гладыятараў, якія дажывалі да, так бы мовіць, пенсійнага ўзросту, скормлівалі рыбам мурэнам, якіх разводзілі ў садках, каб падаць потым гэты далікатэс самым шаноўным асобам.

**Нешта звярынае было ў вачах людзей і штосьці чалавечае — у вачах звяроў.**

— Я сплю на доларах, — хвалілася яна.

**Будзеш горкі — праплююць. Будзеш салодкі — праглынуць. Будзеш кіслы — зморшчацца.**

Калі ў мужчыны твар без маршчын — гэта яшчэ не твар. І гэта яшчэ не мужчына. І ўсё гэта пакуль што не мужнасць.

**Наш тлумны і небяспечны век не шкадуе не толькі нас, людзей, але і прыроду. Ён надзяляе, да прыкладу, дрэвы нашымі чалавечымі хваробамі.**

**У магутных нашых дубоў з'явіўся раптам сасудзісты мікоз — пачалі нечакана забівацца сасуды: сок, чыстая і светлая кроў дрэў, ужо ніяк не можа прабіцца да кроны, і дубы, невылечна хворыя, засыхаюць.**

На Кольскім паўвостраве, ад лапароў з Лаўазёрнай тундры пачуў, што ў іх ёсць вядзьмаркі, у якіх і сёння можна купіць вузельчык са спадарожным ветрам — ідзі з ім куды хочаш, ці едзь, і табе ўсюды будзе спрыяць ён, вецер з вузельчыка...

Мы ж, беларусы, больш дамаседы, неахвотна збіраемся ў далёкую дарогу і таму спадарожны вецер у нас, здаецца, ніколі не прадаваўся.

**Слова — гэта своеасаблівы абраз. Хочацца і яму, як абразу, маліцца. І якія, ці паверыце, шчаслівыя людзі, што шчыра моляцца Слову.**

**Роднаму Слову.**

Мой новы беларускі пашпарт, як запісана ў ім, будзе годны да 15 студзеня 2036 года. «Трэба, абавязкова трэба дажыць!» — усміхаюся сам сабе.

**Яго сэрца чамусьці трапяталася, як у злоўленага голуба.**

Ён не пытаў, якая гадзіна. Ён пытаў толькі, які век, якое стагоддзе. І кожная ягоная хвіліна была велічынёю са слана.

**Народная мудрасць: не згодны — пярэч, пярэчыш — прапаноўвай, прапануеш — зрабі.**

І мне, сухапутнаму чалавеку, часам патрэбная свая лоцыя. Каб упэўнена плысці па рацэ жыцця, каб бачыць усе яго мелі, усе рыфы і бязdonныя глыбіні.

**Усмешка — гэта калі прыязнасць і дабрыня сустракаюцца.**

**І яшчэ: усмешка, як добры вірус, мае цудоўную здольнасць перадавацца ад чалавека да чалавека. І прыносіць чалавеку радасць.**

Пяць бакоў свету. Чатыры бакі мы добра ведаем. Разбудзі нас уночы — адкажам: усход і захад, поўнач і поўдзень. Але ж у свету ёсць яшчэ і пяты бок. Гэта — небасхіл. Бо ўсе бакі ўпісаны ў круг — гарызонт. Значыць, круг — пяты бок свету. І ты, у якім бы накірунку не ішоў, абавязкова прыйдзеш якраз да яго.

**Прайшла жанчына — мяккая і пушыстая, як воблака.**

Мужчыны глыбакадумна разважаюць пра жыццё, а жанчыны проста даюць яго.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.21 | 15.48 | 7.27 |
| Віцебск — | 8.19 | 15.30 | 7.11 |
| Магілёў — | 8.12 | 15.38 | 7.26 |
| Гомель — | 8.00 | 15.43 | 7.43 |
| Гродна — | 8.35 | 16.04 | 7.29 |
| Брэст — | 8.27 | 16.13 | 7.46 |

### Месяц

***Першая квадра 13 снежня. Месяц у сузор'і Авена.***

### Імяніны

***Пр.*** *Андрэя, Антона, Канстанціна, Мацвея, Мікалая, Сцяпана, Уладзіміра.*

***К.*** *Марыі, Ніны, Хрысціны, Валяр'яна, Віктара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Дзве даты

## 15 снежня

**1575 год** — каралём Польшчы і вялікім князем ВКЛ выбраны Стэфан Баторый. У сувязі з накіраванасцю знешняй палітыкі на Усход, Баторый імкнуўся развіваць інфраструктуру дзяржаўнага кіравання ў межах менавіта Вялікага Княства Літоўскага, планаваў перанесці сталіцу Рэчы Паспалітай у Гродна, дзе перабудаваў каралеўскі замак, і падтрымаў іезуітаў у імкненні стварыць вышэйшую навучальную ўстанову ў ВКЛ, якою стаў Віленскі ўніверсітэт. Ён кіраваў Рэччу Паспалітай да 12 снежня 1586 года.

**1923 год** — Сталін з публікацыі артыкула ў газеце «Правда» пачаў барацьбу супраць трацкізму і Левай апазіцыі. Пасля слова ў 30-я гады наступіла справа кулі: сотні тысяч людзей сталі ахвярамі гэтай барацьбы, якая завяршылася спякотным поўднем 20 жніўня 1940 года, калі ў акружаным дрэвамі і кактусамі старым доме, размешчаным у прыгарадзе Мехіка — Кайактане, агентам ГПУ Меркадэрам быў забіты сам Троцкі.

## Цытата дня:

*«Няўжо сёння сонца мне свеціць для таго, каб я сумаваў па ўчарашнім дні?».*

**Іаган Шылер (1759-1805), нямецкі паэт, драматург.**

# «ТУТ РУСКІ ДУХ, ТУТ РУССКІЮ ПАХНЕ...»

**Кіеў няспешна рыхтуецца да Новага года і пакуль не радуе багаццем распродажаў. У крамах на знакамітым Хрышчаціку дзе-нідзе красуюцца надпісы -20%, -30%, але гэта яшчэ не татальныя распродажы, калі ўсё, напрыклад, па 40 грывень. Еўрапейскія брэнды кшталту Zara і Vero Moda зніжкі рыхтуюць толькі ў сярэдзіне студзеня, хоць яшчэ год таму яны пачыналіся ў снежні. Але як паехаць з Кіева, нічога не набыўшы на Хрышчаціку (кіеўскі торт у разлік браць не будзем)? Мы з калегай спыняемся на куртцы, якая замест 899 грывень зараз каштуе 499 (каля 65 долараў ці 200 тысяч) і, не доўга раздумваючы, набываем. Часу застаецца няшмат — наша прагулка пачалася толькі ў дзевяць гадзін вечара — большасць магазінаў зачыняецца тут якраз а 21-й. А нам трэба трапіць яшчэ на Майдан Незалежнасці і знайсці кіеўскі торт.**

Майдан Незалежнасці рыхтуецца да Новага года.

## АД ХРЫШЧАЦІКА ДА МАЙДАНА

Знакаміты Хрышчацік з'яўляецца самай кароткай галоўнай вуліцай у Еўропе і складае ўсяго 1 кіламетр 200 метраў. На выхадных і ў святочныя дні аўтамабільны рух на ім перакрываецца, і вуліца цалкам пешаходная, а на Майдане абавязкова арганізуецца які-небудзь канцэрт. Праўда, неаднаразова даводзілася чуць, што кіяўлянам даўно прыелiся гэтыя канцэрты, і на Хрышчаціку звычайна прагульваюцца толькі госці ўкраінскай сталіцы. Самі ж жыхары Кіева аддаюць перавагу больш спакойным месцам. У старажытнасці гэтая галоўная вуліца была ўскраінай Кіева, куды хадзілі паляваць і рыбачыць, яна мела назву Хрышчата даліна. Вуліцу пераймяноўвалі, і ў савецкія часы яна называлася ў гонар Вацлава Вароўскага, аднак назва не прыжылася — кіяўляне хутка назвалі яе «Воровской». Падчас вайны вуліца была амаль цалкам зруйнаваная, сталіца Украіны была разбурана на 60 працэнтаў. Сёння на Хрышчаціку ў асноўным месцяцца офісы. Калі хто і жыве, то гэта, як правіла, старэнькая бабуля, якая марыць прадаць сваю кватэру калі-небудзь у будучыні, калі яе кошт будзе нашмат большым.

Што да кошту кватэр у сталіцы Кіева, то яны адрозніваюцца ад мінскіх. Калега з рэкламнага агенцтва расказвае, што іх мінская фірма здымала кватэру для супрацоўнікаў у Кіеве. Гэта быў пакой у доме барачнага тыпу, з клапамі і тараканамі, праўда, усяго за 300 долараў, але такія танныя пакоі ў дэфіцыце. Набыць кватэру ў Кіеве — гэта мара многіх украінцаў, і не толькі. Арганізатар нашага прэс-тура Марыя расказвае, што яе сяброўка прадала дзве трохпакаёвыя кватэры ў Чарнігаве, каб набыць аднапакаёўку ў Кіеве. Танней набыць кватэру дзесьці ў Еўропе, чым у Кіеве, — так кажуць самі кіяўляне. Праўда, усё роўна знаходзяцца тыя, хто гатовы аддаць 300 тысяч долараў за жыллё ва ўкраінскай сталіцы. У крызіс, як расказвае нам Алена, наш экскурсавод, яго сталі значна менш будаваць, некаторыя будоўлі замарожаныя па 2-3 гады. Але для таго, хто змог захаваць грошы ў крызіс, зараз самы час штосьці набываць — цэны на нерухомасць упалі ледзь не ўдвая. Калі аднапакаёўка 2-3 гады таму каштавала сама менш сто тысяч долараў, то цяпер можна пашукаць за 60. Праўда, з такімі цэнамі іх ніхто не хоча прадаваць. Сама Алена скарысталася выгодамі крызісу — летам яна набыла новы аўтамабіль у салоне — скідка была 10 тысяч грывень.

«Я займаюся цяпер экскурсіямі ў прыватным парадку, у мяне пагадзінная аплата, таму я даўно не сачу за зарплатамі. Раней я ішла ў тую кампанію, дзе мне плацілі больш, а цяпер знайшла справу, ад якой атрымліваю задавальненне і зарабляю. Сярэдні заробак у Кіеве — дзесьці 500 долараў. Урачы, наколькі я ведаю, зарабляюць 1600 грыўняў (200 долараў — **Рэд.**). Пенсія ў нас — 660 грыўняў — сацыяльная (80 долараў. — **Рэд.**), 980 грыўняў — сярэдняя (120 долараў)», — расказвае Алена.

Майдан Незалежнасці не ўражвае — на ім пачалі ўстанаўліваць ёлку, не скончылі і абгарадзілі шчытамі. Адзіны напамін пра колішнюю гучную палітычную славу галоўнай плошчы ўкраінскай сталіцы — палатка адной з партый, якая тут жа выконвае ролю і офіса. Паліттэхналогіі ва Украіне самыя розныя, і іх разнастайнасць можна назіраць на вуліцах. «Батьківщина захистить тебе. Юлія Тимошенко» — гэта бігборд у цэнтры Кіева галоўнай цяпер апазіцыянёркі Украіны, лідара партыі «Батьківщина». А вось яшчэ адзін, непадпісаны: «Г. Суркіса — у адстаўку». Чым не задавальненне кіраўнік украінскага футбола — гэта вам любы балельшчык раскажа. А вось каму належыць аўтарства гэтага бігборда на кальцавой Кіева, сказаць складана. Хутчэй за ўсё — апазіцыі, а магчыма, і самому Суркісу, каб было ў чым абвінаваціць пасля апазіцыю — меркаванні выказваюцца самыя розныя.

Цэнтр Кіева — вялікая колькасць хмарачосаў, якія будуюцца ці пабудаваныя нядаўна. Гэта офісныя будынкі і гасцініцы. Будуючы першыя, адміністрацыя Кіева яшчэ больш ускладняе сітуацыю, ператвараючы цэнтр горада ў суцэльны аўтамабільны затор (асабіста нам пашанцавала прастаяць аднойчы не больш за паўтары гадзіны). Узводзячы гасцініцы, украінская сталіца рыхтуецца прыняць чэмпіянат свету па футболе-2012-м. Гатэль «Хаят», вядомы сваёй сеткай па ўсім свеце, пабудаваны ў цэнтры Кіева, побач з Сафіяй Кіеўскай. Як вядома, апошняя з'яўляецца музеем пад патранатам ЮНЭСКА, самым старым саборам не толькі на тэрыторыі Украіны, але і Расіі і Беларусі. Але з прычыны таго, што арабскія бізнэсмены побач узвялі «Хаят», адна з галоўных адметнасцяў Кіева можа пазбавіцца статусу ЮНЭСКА. Дарэчы, Сафія Кіеўская, дзе са старажытнасці хрысціліся кіеўскія князі, шэсць гадоў таму на адзін дзень ізноў ператварыўся ў храм. Віктар Ющчанка аддаў загад зачыніць музей і пажадаў атрымаць там бласлаўленне на ўладу.

Яшчэ адна адметнасць, якая ажыла ў Кіеве перад чэмпіянатам свету — архітэктурны ансамбль «Радзіма-маці», на шчыце якой зноў адчынілі аглядную пляцоўку. Зачыненая яна была пасля таго, як 102-метровую «Радзіму-маці» аблюбавалі самагубцы. Цяпер уваход і пад'ём на ліфце на аглядную пляцоўку каштуе 200 грыўняў (каля 25 долараў).

Будынак Кабміну Украіны – тут вырашаюцца найважнейшыя дзяржаўныя пытанні.

## КІЕЎСКІ ТОРТ І САЛА Ў ШАКАЛАДЗЕ

Кіеў, як сцвярджаюць кіеўляне, паступова ператвараецца ў еўрапейскі горад і страчвае сваю самабытнасць. «Кіяўляне развучваюцца самі арганізоўваць свой адпачынак. Куды прасцей пры наяўнасці грошай пайсці ў гандлёва-забаўляльны цэнтр ці рэстаран», — расказвае наш гід Алена. Праўда, адметнае заўсёды можна знайсці ва ўкраінскай кухні. На першае нам усюды падаюць боршч, а ў якасці салаты — вінегрэт. Гэта дзве бадай што галоўныя ўкраінскія стравы, без якіх нельга ўявіць стол. Не лічачы сала. У Кіеве сапраўды ёсць рэстаран, дзе падаюць сала ў шакаладзе. Кавалачак сала нанізаны на шпажку і пакрыты шакаладам. Далікатэс падаюць у невялікай колькасці (чатыры шпажкі), і каштуе гэтае задавальненне ўсяго 30 грывень (менш за 5 долараў). А турысты з постсавецкай прасторы па-ранейшаму па традыцыі вязуць з украінскай сталіцы кіеўскія торты. Прычым сапраўдным лічыцца толькі выраблены на фабрыцы «Рашэн» (былая фабрыка імя Карла Маркса). Гісторыя гэтага торта, як і ўсе ўкраінскія адметнасці, абрасла легендамі. Паводле першай, рэцэпт яго ў XIX стагоддзі хтосьці ўкраў у французскага кандытара. Паводле другой, нехта кандытар Пятрэнка, які працаваў на фабрыцы імя Карла Маркса, аднойчы ўзбіў занадта шмат бялку, паставіў ў лядоўню і забыўся на яго. Раніцай ён паглядзеў у лядоўню і спалохаўся, што так шмат прадукту загублена — бялок засох. Тады кандытар дадаў туды джэму, крэму, арэхаў — так атрымаўся торт, які пасля доўга перамагаў на шматлікіх выставах і конкурсах.

Прывезці кіеўскі торт мяне папрасілі знаёмыя, і ў пошуках накіроўваемся ў прадуктовую краму на Хрышчаціку. Паўкілаграмовы кіеўскі торт каштуе ўсяго 45 грыўняў (крыху больш за 5 долараў). Хоць асабіста мне цукеркі фабрыкі «Рашэн» падабаюцца значна больш, чым кіеўскі торт. Адзіны беларускі прадукт, які ўдалося знайсці ў гэтым супермаркеце — чырвоная рыба «Санта Брэмар». Каштуе яна прыкладна столькі, колькі і ў Мінску — 80 грыўняў (каля 30 тысяч) за 300 грамаў. Яшчэ ўдалося ўбачыць беларускую касметыку — крэм «Беліта» — у гандлёвым цэнтры ў Чарнігаве. Не так шмат, як магло б быць.

«Тут рускі дух, тут Руссю пахне», — гэтыя вядомыя радкі напісаў у свой час Аляксандр Пушкін пасля наведвання Кіева. Праўда, ён мяркуе на ўвазе пах у літаральным сэнсе: кіяўляне гналі дзёгаць з бяроз, які распаўсюджваў у наваколлі адпаведны водар. Сёння ў Кіеве і рускую мову пачуеш, тут ёсць і гатэль «Русь» (праўда, на ўвазе маецца, напэўна, Русь Кіеўская). У астатнім украінцы імкнуцца падкрэсліць сваю самабытнасць. Заўзятыя ўкраінафілы распаўсюджваюць самыя неверагодныя версіі, напрыклад, тую, што Леў Талстой па паходжанні быў украінцам.

## ПІВО ТВОЄЇ БАТЬКІВЩИНЫ

Мэта нашага прэс-тура — кіеўскі завод «Абалонь», які экспартуе 80 працэнтаў ад усяго ўкраінскага піва. Гэта самы вялікі па магутнасцях завод у Еўропе па вытворчасці піва. З выгляду — звычайнае прадпрыемства, але ўявіць маштабнасць прымушаюць шэрагі вялізных цыстэрнаў, дзе вытрымліваецца гатовае піва, і колькасць фур у чарзе на загрузку. На нашым рынку, нягледзячы на абмежаванні і абвінавачванні ў дэмпінгу, украінскі вытворца прадстаўлены даўно і разнастайна. Завод пабудаваны ў 80-х і працаваў яшчэ з савецкіх часоў на чэшскім абсталяванні. Потым яно было заменена на нямецкае. І хоць чэшскае і нямецкае піва адрозніваюцца, як неба і зямля, «Абалонь» сцвярджае, што смак іх піва застаецца нязменным, бо ён залежыць ад рэцэптуры, а не ад абсталявання. Праўда, у апошні час на заводзе ліцэнзійна вырабляецца і некалькі гатункаў нямецкага піва.

Афіцыйна піва «Абалонь» прадстаўлена ў 36 краінах свету, у тым ліку ў Канадзе, Аўстраліі, ЗША, хоць, як сцвярджае старшыня Савета ЗАТ «Абалонь» Сяргей Блашчаневіч, іх прадукцыя ёсць на пяці кантынентах, амаль ва ўсіх краінах свету. Першай замежнай краінай, куды трапіла ўкраінскае піва, была Англія. Тое, што піць піва можа нават сапраўдная лэдзі, пацвярджаюць на заводзе гістарычным фактам: англійская каралева на ноч ужывала кубачак падагрэтага портара. Найбольш украінскае піва прадстаўлена на малдаўскім, грузінскім і беларускім рынках — па 5 працэнтаў.

Чуткі пра тое, што «Абалонь» збіраецца купіць адзін з беларускіх заводаў, дакладней, брэсцкі, кіраўніцтва прадпрыемства пацвярджаць не спяшаецца. Пакуль там вырабляецца на ўмовах ліцэнзійнага наліву піва пад назвай «Дэсант». Але ці будзе брэсцкае прадпрыемства акцыянаванае — пакуль не ведае ніхто. Мы пытаем, наколькі «Абалонь» задаволена якасцю соладу, які вырошчваецца ў Беларусі, і чуем у адказ, што солад падыходзіць: «Вы, беларусы, у чымсьці падобныя на нас, украінцаў. Мы таксама заўсёды сумняваемся. А пытанне не так трэба ставіць. Трэба казаць: у нас самы лепшы солад у свеце! Чаму вы не вырабляеце ў нас піва?!», — кажа Сяргей Блашчаневіч. Што ж, мы не супраць, тым больш што піва добрае.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

*Мінск—Кіеў.*

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 6112. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12